№ 36 (442) 30 верасьня 2005 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

## Беларуская грамадзкая думка

характарызуецца дзьвюма зьявамі: стомленасьцю ад пэрсаналіі і адсутнасьцю альтэрнатываў гэтай пэрсаналіі. Таму любая альтэрнатыўная асоба на беларускім палітычным полі мае шанцы хутка набраць рэйтынг. Хто зловіць фэномэн «выбуховага рэйтынгу»? Карэспандэнт «НН» гутарыць з прафэсарам сацыялёгіі Андрэем Вардамацкім. **Старонка 4**.

# Калі не Мілінкевіч, дык хто?

Сцэнары Кангрэсу дэмакратычных сілаў. **Старонкі 3—5.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ


## «Будзе барацьба не на жыцьцё, а на сьмерць»

Анатоль Лябедзька, Алесь Мілінкевіч адказваюць на пытаньні «НН».

старонка 12

## Мілінкевіч ня хоча цягнуць рызіну

Лідэры апазыцыі падпісалі супольную дэкларацыю аб гатоўнасьці працаваць у адзінай камандзе.

старонка 5

## Казулін займецца палітычным турызмам

Лідэр сацыял-дэмакратаў ня возьме ўдзелу ў Кангрэсе, бо ў гэты час будзе знаходзіцца ў Лёндане.

старонка 3

## Юлія Цімашэнка з выгляду і Маргарэт Тэтчэр па розуме

Апытаньне «НН»: якім павінен быць кандыдат у прэзыдэнты ад апазыцыі?

старонка 4

### ТЭНДЭНЦЫІ

**Падвойны страх**

Тэракты ў Віцебску: новыя вэрсіі. **Старонка 2**.

### З УСЁЙ КРАІНЫ

**Магілёў вяртае ратушу**

Магілёўскія ўлады адновяць сымбаль самакіраваньня. Прычым гаворка не пра рэстаўрацыю, а пра адбудову «з нуля». **Старонка 7**.

### З УСІХ СТАРОН

**Польшча збочыла направа**

Беларуская палітыка Варшавы стане больш жорсткай. Піша Зьміцер Дрыгайла. **Старонка 11**.

### КУЛЬТУРА

**Слуцкі пояс шагідкі**

Праз многа гадоў беларускія дзеці будуць гуляць у Джэці, чытаючы яе вершы замест лічылак. Піша Аляксандар Фядута. **Старонка 9**.

### ГІСТОРЫЯ

**Дубравенкі крывавыя берагі**

На ціхай рачулцы ў Магілёве ў 1942 г. адбылася найбуйнейшая прыродна-тэхнагенная катастрофа ў гісторыі Беларусі. **Старонка 17**.

### ЛІТАРАТУРА

**Сто пудоў адзіноты**

Новыя вершы Андрэя Хадановіча. **Старонка 20**.

### ІНФАРМАТАР

**На вучобу ў Амэрыку**

З 20 найлепшых ВНУ сьвету 17 — амэрыканскія. 70% усіх сучасных ляўрэатаў Нобэля працуюць у ВНУ ЗША. Як атрымаць амэрыканскую адукацыю? На ўласным досьведзе раіць Андрусь Храпавіцкі. **Старонка 21**.


**Патрабуй сваё!**

Многія чытачы скардзяцца, што стала цяжка купіць «НН» у шапіках. Рэч у тым, што дзяржаўным распаўсюдніцкім арганізацыям забаронена павялічваць колькасьць асобнікаў «НН» у продажы. Улады спрабуюць падперці кіем гару — стрымаць нацыянальнае станаўленьне Беларусі. Што рабіць чытачам? Ласкава прасіце кіяскёрак заказваць больш асобнікаў газэты. А таксама — падпісвайцеся! Гэта можна зрабіць на любой пошце. Падпісны індэкс «НН» 63125. Падпіска каштуе 4510 рублёў на месяц. Падпіска на шапікі «Белсаюздруку» таньнейшая: 3440 руб. на месяц. «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі праўдзівай інфармацыі і вострых камэнтароў штотыдзень.

## Экспартны апакаліпсіс

Захад вывучае сцэнар увядзеньня эканамічнага эмбарга супраць Беларусі.

Афіцыйныя эканамісты ў адзін голас называюць Расею галоўным эканамічным партнэрам Беларусі. Аднак варта прачытаць аналітычную справаздачу «Залежнасьць беларускай эканомікі ад гандлю з заходнеэўрапейскімі краінамі і ЗША», каб зразумець: ня ўсё так проста.

Справаздача была падрыхтаваная ў верасьні групай беларускіх эканамістаў і распаўсюджаная славацкім Інстытутам грамадзкай дыпляматыі «Понціс». Экспэрты палічылі за лепшае не афішаваць сваіх імёнаў, што цалкам зразумела. Іхная праца фактычна зьяўляецца сцэнаром развіцьця падзеяў у выпадку ўвядзеньня Захадам эканамічнага эмбарга ў дачыненьні да Беларусі.

**Працяг на старонцы 6.**

28 верасьня «НВ» атрымала лісты з саюздрукаў і друкарні «Чырвоная зорка»: адзінай штодзённай незалежнай газэце краіны адмаўляюць у друку й распаўсюдзе з 1 кастрычніка.

## «Народная воля»: драматычныя дні

Паводле словаў намесьніцы рэдактара «НВ» Сьвятланы Калінкінай, лісты з «Саюздрукаў» напісаныя нібы пад капірку: «З намі разарвалі дамовы ў «сувязі з публікацыяй у СМІ матэрыялаў, якія супярэчаць заканадаўству».

Друкарня ў адмове спаслалася на запазычанасьць: «НВ» не сплаціла за друк 2 млн руб. Калінкіна лічыць гэтую падставу несур’ёзнай: «Было такое, што мы разьлічваліся з друкарняй адразу за цэлы месяц. Але тут узьнікла праблема, бо ў нас гэтымі днямі заблякавалі рахунак».

27 верасьня газэта зьвярнулася да грамадзкасьці з просьбай дапамагчы сплаціць 100 мільёнаў рублёў кампэнсацыі лідэру Лібэральна-дэмакратычнай партыі С.Гайдукевічу ў адпаведнасьці з рашэньнем суду. У адваротным выпадку газэта можа спыніць выхад. Яе маёмасьць апісаная, арыштаваная папера. Банкаўскі рахунак «НарВолі» заблякаваны. У мінулы раз, калі над газэтай навіс штраф па справе Рыбакова, яе выручылі расейскія бізнэсоўцы беларускага паходжаньня. Але тады сума была ўдвая меншая.

Паводле ацэнак праваабаронцаў, аргумэнты С.Гайдукевіча ў судзе не былі пераканаўчымі, а сума штрафу неадэкватная. Тым ня менш, абскардзіць рашэньне не ўдалося.

У выданьня ёсьць магчымасьць выйсьці ў чацьвер і пятніцу, 29 і 30 верасьня. Як сытуацыя будзе разьвівацца далей, невядома.

Улады могуць абысьціся з «Народнай воляй» па варыянце «БДГ» і па варыянце «Товарища». Першым адрэзалі ўсе варыянты распаўсюду. Другім дазволілі захаваць падпіску. Цяжка сказаць, што менш пакутліва.

Як жа ўлады збаяліся згуртаваньня апазыцыі, калі ў дзень Кангрэсу руйнуюць апошні бастыён свабоды слова ў краіне.

**АШ**

# Падвойны страх

Выбухі ў Віцебску стварылі паніку нацыянальнага маштабу. Піша **Алесь Кудрыцкі**.

Паўмесяца таму ў мэтро давялося чуць, як жаночы голас з узмацняльнікаў заклікаў пасажыраў быць пільнымі і паведамляць міліцыі пра пакінутыя без нагляду рэчы. У мэтах прадухіленьня тэрактаў. «Якія тэракты ў мірнай Беларусі? — падумалася. — Наганяюць паніку на пустым месцы». Як выявілася, не на пустым.

14 верасьня на вуліцы Леніна ў цэнтры Віцебску адбыўся выбух. Два мінакі былі параненыя. 22 верасьня — яшчэ адзін выбух, зноў у Віцебску, таксама ў цэнтры, на той самай вуліцы Леніна. Гэтым разам параненых — больш за тры дзясяткі. Шасьці асоба давялося рабіць тэрміновыя апэрацыі, каб выратаваць жыцьцё.

Калі рэакцыяй людзей на першы выбух было збольшага зьдзіўленьне ды перапуд, дык на другі — амаль паніка. Зьявіліся чуткі пра тое, што насамрэч выбухнула не адна бомба, а некалькі, што колькасьць параненых нашмат большая, ёсьць забітыя. Пачаліся тэлефанаваньні ў міліцыю пра закладзеную выбухоўку. Гістэрыя дакацілася да сталіцы — увечары наступнага дня на рагу вуліцаў Залатая Горка і Казлова былі нацягнутыя міліцэйскія стужкі. Сапёры ў скафандрах асьцярожна аглядалі аглядалі вялікі чорны плястыкавы мех, які стаяў ля пешаходнага пераходу. Нараніцу мех валяўся там, дзе яго і адшукалі — з прарэхі ў плястыку вывалілася жоўтае лісьце.

Магчыма, нехта пачаў наўмысна распускаць тыя плёткі, але найхутчэй яны зьявіліся *нармальнай* рэакцыяй людзей на *ненармальнае* асьвятленьне падзеі ў афіцыйных мэдыях — празь некалькі гадзінаў пасьля выбуху навіны тэлебачаньня пра падзеі ў Віцебску маўчалі (падзеяй дня быў зьезд БРСМ), і толькі радыё давала скупую інфармацыю.

Адны віцьбічы кажуць пра тое, што выбух — гэта «разборкі» паміж этнічна-мафіёзнымі групоўкамі. Найчасьцей узгадваюць азэрбайджанцаў і цыганоў. Іншыя сьцьвярджаюць, што горад даўным-даўно падзелены, і крымінальнага сьледу шукаць ня варта. Міліцыя адкінула вэрсію тэракту, і кажа пра «злосных хуліганаў». Паводле яе сьцьверджаньняў, бомба была зробленая непрафэсійна. Ня выключана, што выбух — справа рук вар’ята, чые дзеяньні ўвогуле немагчыма патлумачыць звычайнай лёгікай.

Віцебскія выбухі паказалі, што славутая беларуская стабільнасьць ды спакой — фікцыя. Патрэбна толькі імгненьне, каб ад іх не засталося і сьледу. Папулярнасьці ўлады гэта не спрыяе. Праўда, у доўгатэрміновай пэрспэктыве выбухі, хто б ні быў іх «аўтарам», могуць дапамагчы дзяржаве ўзмацніць рэпрэсіўную машыну. Віцебская міліцыя ўжо папярэдзіла, што будзе праводзіць асабісты дагляд усіх падазроных. У горад уведзеныя дадатковыя сілы аховы парадку з сабакамі. У кватэрах шэрагу маладых віцебскіх актывістаў апазыцыі праведзеныяператрусы. Ня выключана, што арганізатараў выбуху ў Віцебску будуць шукаць бясконца, як амэрыканцы бэн Ладэна — напалоханым грамадзтвам лягчэй кіраваць. Калі, вядома, страх не перарасьце ў злосьць.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Уладзімер Някляеў (на фота) вылучаны на пасаду старшыні Беларускага ПЭН-Цэнтру замест Лявона Баршчэўскага, які адмовіўся балятавацца на другі тэрмін. Сход аўтарытэтнай пісьменьніцкай арганізацыі адбудзецца ў чацьвер.**

## ВАДЗЯНІК НЯМІСКІ

### НараДА! ДА! «ДАжынак»

паэма

Учора на аўтобусным прыпынку
Чуў пагалоску, быццам за «Дажынкі»
Пяць гарадоў спрачаліся,
Ды як ні намагаліся,
А перамог саўгас «Пустыя Крынкі».

Вёў рэй на сходзе кіраўнік мясцовы —
Былы, дарэчы, прапаршчык вайсковы, —
Ня лез па слова ў кішэнь,
Даваў, як трэба, у каршэнь.
Вось у скароце тэкст яго прамовы:

**Працяг на старонцы 19.**

## ВАРТА БАЧЫЦЬ

### Не забудзьцеся ўключыць тэлевізар

Канал «Эўраньюз» падрыхтаваў шэраг праграмаў па беларускай тэматыцы. У запісе перадачаў бралі ўдзел беларускія палітыкі і дзеячы культуры. Расклад перадач наступны:

Пятніца (30.09) — 12:15, 16:15
Субота (01.10) — 10:45, 19:45, 21:15, 01:15
Нядзеля (02.10) — 8:45, 14:15, 20:15, 02:45
Панядзелак (03.10) — 12:15, 16:15
Аўторак (04.10) — 12:15, 16:15, 22:45
Серада (05.10) — 12:15, 16:15
Чацьвер (06.10) — 12:15, 16:15, 22:45

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА АПАЗЫЦЫІ

### Штрафы хай будуць як уклады

Чытаю ў газэце: « Марына Багдановіч пакарана штрафам 3 млн 825 тыс. руб.». І такое практычна штонумар. Такі рукі могуць апусьціцца.

Улада выкарыстоўвае штраф як спосаб задушэньня іншадумства. Маю прапанову, каб у праграме дэмакратычнага кандыдата быў наступны пункт: «Усе несправядлівыя палітычна матываваныя штрафы пасьля майго прыходу да ўлады будуць ахвярам рэпрэсій кампэнсаваныя». Каб людзі, якія дорага плацяць за сваю грамадзянскую пазыцыю, успрымалі яго як бестэрміновы банкаўскі ўклад, па які можна будзе прыйсьці пасьля зьмены ўлады на новую, што будзе шанаваць законы й правы чалавека. Мэханізм вяртаньня грошай можа быць такі. Чалавек зьвяртаецца ў суд, каб абскардзіць даўнейшы прысуд. Суд пераглядае справу і, калі прысуд прызнаецца незаконным, выносіць вырак: грошы вярнуць з улікам інфляцыі й кампэнсацыі за маральныя страты. Частка (у разумных межах) будзе спаганяцца з судзьдзі і пракурора, што наклалі несувымерны штраф. Яны ж кіруюцца мэркантыльнымі інтарэсамі, несправядліва судзячы. Зварот сродкаў ня будзе для бюджэту цяжарам, затое будзе важным маральным актам. Ужо сёньня гэта павінна быць прамоўлена дэмакратычнымі палітыкамі. Каб сотні людзей, што пакутуюць, былі пэўныя: «Грошы мне вернуцца, а калі я не дацягну да гэтага дня, то вернуцца маім дзецям».

**Мікола Вус, Жодзіна**

**Іншыя лісты з пошты Рэдакцыі на старонцы 14.**


## Новы «ARCHE»

**ПЁТРА РУДКОЎСКІ** Нацыянальны дыскурс і лібэральны мардабой. Пасьляслоўе да дыскусіі пра мову «Нямецкай хвалі»
**МІКОЛА КАЦУК** Нявінныя фокусы незалежнай сацыялёгіі
**ЮРЫ ЧАВУСАЎ** Рэвалюцыя і антырэвалюцыя
**МІХАСЬ ТЫЧЫНА** Весткі з паралельнага сусьвету
**АЛЯКСАНДАР ФЯДУТА** Дабраславёныя гарбачоўскія часы
**АНДРЭЙ ВАШКЕВІЧ, ДЗЯНІС НАРЭЛЬ** Сымон Якавюк: адраджэнец, спэкулянт, манархіст і савецкі дывэрсант
**ВІКТАР ЖЫБУЛЬ** Футурыст Пятрусь Броўка
**АЛЯКСЕЙ БАЦЮКОЎ** Уся праўда пра горад Бобер
**ГАБРЫЕЛЬ ГАРСІЯ МАРКЕС** Каханьне падчас халеры

Пытайцеся ў кнігарнях

# Кангрэс дасьць апазыцыі легітымнага лідэра

хто б ні павёў апазыцыю на выбары–2006. Пішуць Зьміцер Дрыгайла, Алесь Кудрыцкі.

Праца кангрэсу дэмакратычных сілаў будзе доўжыцца два дні — 15 гадзінаў. Упершыню за пяць год (з часу кангрэсу ў ліпені 2000 г.) афіцыйна зьбярэцца тысячная грамада актывістаў апазыцыі з усёй краіны. Галоўных прэтэндэнтаў — два: **Алесь Мілінкевіч** і старшыня АГП **Анатоль Лябедзька**. Істотную папулярнасьць мае і энэргічны лідэр ПКБ **Сяргей Калякін**. Але, мусіць, ягоны зорны час яшчэ ў будучыні. Калі ніводзін з кандыдатаў не набярэ ў першым туры 50% + адзін голас ад агульнай колькасьці тых, хто возьме ўдзел у галасаваньні, адбудзецца другі тур.

Калі галасаваньне пройдзе ў адзін тур, адзіны кандыдат будзе мець больш мандат даверу і свабоду дзеяньняў.

Пасьля абраньня адзінага кандыдата да агульнага працэсу можна будзе далучыцца ў любы момант. Трэба думаць, што так у выніку й зробяць многія адзінокія палітыкі. Хоць дагэтуль яны дыстанцыююцца ад Кангрэсу. **Уладзімер Парфяновіч** у размове з карэспандэнтам «НН» падкрэсьліў: «Гэта будзе не кангрэс усіх дэмакратычных сілаў, а кангрэс палітычных партыяў». Галоўнай задачай кангрэсу ён бачыць прызнаньне нелегітымнасьці ўдзелу А.Лукашэнкі ў выбарах.

Кіраўнік Беларускага ПЭН-цэнтру Лявон Баршчэўскі трымаецца іншае думкі: «Абраны на кангрэсе кандыдат будзе самы легітымны з усіх прэтэндэнтаў на альтэрнатыву». Палітоляг **Сяргей Панькоўскі** таксама адзначае: «Пэрспэктыўным будзе любы кандыдат, які возьме за мэту ня столькі рэалізацыю свайго бачаньня Беларусі, колькі вяртаньне да правілаў сумленнай гульні».

Форум, хто б ня быў абраны на ім адзіным апазыцыйным кандыдатам у прэзыдэнты, дасьць апазыцыі легітымнага лідэра. Але адзінаму кандыдыту прыйдзецца калі не спалучыць, дык прымірыць дагэтуль у нашай краіне неспалучальнае — левыя, лібэральныя й кансэрватыўныя каштоўнасьці. Таму **Віктара Карняенку** — кіраўніка штабу А.Мілінкевіча — непакоіць невядомасьць канфігурацыі будучай кааліцыі пасьля кангрэсу: «Мы дэкляруем гатоўнасьць да адзінства, але д’ябал хаваецца ў дробязях».

Калі ўлады ў апошні момант пойдуць на правакацыі, апазыцыйнае мерапрыемства ператворыцца ў скандал. Апазыцыя адмыслова папрасіла, каб заля ДК была загадзя агледжаная сапёрамі, каб там выпадкова не зьявілася нейкая «міна». Супрацоўнікі ГУУС Менгарвыканкаму дэклюравалі забясьпечыць ахову парадку на тэрыторыі вакол ДК МАЗ. Калі раптам усё ж узьнікне «форс-мажор», кангрэс адбудзецца 16 кастрычніка за межамі Беларусі, у Кіеве ці Смаленску.

Цікава, што «Дажынкі-2005» перанесеныя зь 30 верасьня — 1 кастрычніка як мінімум на тыдзень. Падстава — «арганізацыйныя прычыны». Кіраўнік прэсслужбы прэзыдэнта **Павал Лёгкі** адрынуў чуткі, што перанос «Дажынак» зьвязаны з удзелам прэзыдэнта ў нейкім важным мерапрыемстве пры канцы тыдня. Але за пераносам яўна стаіць імкненьне Лукашэнкі ўзмацніць прапагандысцкі эфэкт «Дажынак». Сам **Лукашэнка** на кангрэс ня прыйдзе, бо яму прыйшлося б у такім выпадку даць будучаму кандыдату ад апазыцыі слова на ўласным Усебеларускім сходзе, а ён гэтага баіцца як агню.

Бадай, упершыню за дзесяць гадоў апазыцыя грае на апераджэньне. Да афіцыйнага абвяшчэньня выбарчай кампаніі засталося шэсьць месяцаў. Часу шмат, але пытаньні ўсё роўна застаюцца. Як адзіны кандыдат збудуе перадвыбарную стратэгію, ці не дапусьціць праколу на этапах збору подпісаў ці ўласнай прэзэнтацыі. Але гэта ўжо пытаньні зусім іншай групы.

Самым прыкрым на парлямэнцкіх выбарах-2004 было тое, што апазыцыя вылучала па некалькі кандыдатаў на акругу, а лукашэнкаўцы фактычна выбіралі з іх самага зручнага для сябе. Галоўнае, што кандыдат у прэзыдэнты ад дэмакратаў будзе адзін і што выбера яго сабе не Лукашэнка, а шырокая дэмакратычная рэпрэзэнтацыя.

КАНГРЭС ДЭМАКРАТЫЧНЫХ СІЛ БЕЛАРУСІ 2005

## Чырвонае дрэва пад белым небам

Зьнешні бок імпрэзы — справа другая. Галоўнае — вынік, мяркуюць у аргкамітэце Кангрэсу дэмакратычных сілаў.

Арганізатары Кангрэсу не абяцаюць палітычнай фээрыі ў стылі амэрыканскіх перадвыбарных кампаніяў. 1—2 кастрычніка ў Палацы культуры МАЗу (Партызанскі пр-т, 117а, станцыя мэтро «Аўтазаводзкая») будзе адбывацца ня шоў, а напружаная праца па вылучэньні адзінага кандыдата ад дэмакратычных сілаў. Рэгістрацыя дэлегатаў пачнецца а 10-й, першае працоўнае пасяджэньне — а 14-й.

Працяг на старонцы 5.

## Камуністы справе верныя



Хто б ні стаў адзіным кандыдатам, ПКБ застанецца ў шэрагах эўрапейскага дэмакратычнага адзінства, — такое рашэньне прыняў пленум ЦК партыі. Нават у выпадку неабраньня Калякіна лідэры ПКБ увойдуць у Нацыянальны камітэт (ценевы ўрад) і штабы на месцах.

**МВ**

## Казулін зоймецца палітычным турызмам



Лідэр сацыял-дэмакратаў ня возьме ўдзелу ў Кангрэсе, бо ў гэты час будзе знаходзіцца ў Лёндане. Там ён сустрэнецца з генэральным сакратаром Сацынтэрну Люісам Аялам. А.Казулін сказаў, што ягоная паездка ў Брытанію рыхтавалася яшчэ тры месяцы таму, калі была невядома дата Кангрэсу. На заўвагу журналістаў — мо ёсьць сэнс перанесьці візыт — сп.Казулін кінуў, што ў яго «ёсьць іншыя прыярытэты».

Дэлегатамі КДС абраныя 54 сябры БСДП «Грамада». Гэта адно з найбольшых партыйных прадстаўніцтваў. Тым ня менш, А.Казулін лічыць, што «на Кангрэсе будзе прадстаўленая толькі частка дэмакратычных сілаў».

У Брытаніі, куды едзе А.Казулін, нядаўна выйшла кніга палітоляга Эндру Ўілсана «Віртуальная палітыка», прысьвечаная постсавецкім паліттэхнэлёгіям. Дык вось, Э.Уілсан мяркуе, што лукашэнкаўцы адводзяць А.Казуліну тую ж ролю, якую ў Расеі ў 1996 годзе адыграў генэрал Лебедзь.

## Яшчэ адзін нацыянальны лідэр



Былы міністар замежных справаў **Пятро Краўчанка** з палітычнай сцэны не сыходзіць. Ён пэрыядычна нагадвае пра сябе ў СМІ, а таксама фундуючы культурныя падзеі. На мінулым тыдні ён надрукаваў у газэце «Народная воля» артыкул «А ці будзем мы жыць». У ім ён цьвердзіць, што сучасная Рэспубліка Беларусь — гэта толькі квазідзяржава. Якая ж будзе сапраўднай? Такая, што паскорыць б высьпяваньне беларускай нацыі, замацуе атрыбуты нацыянальнай дзяржавы: гістарычныя сьцяг і гімн, мову. Каб узьнікла цывілізаванае грамадзтва з гульнёй палітычных сілаў, канкурэнцыяй, легальнай апазыцыяй. «Я прэтэндую на тое, каб стаць агульнанацыянальным лідэрам — у працэсе, магчыма, на працягу не аднаго, а двух-трох-пяці гадоў. І я яшчэ не сказаў, што буду браць удзел у кампаніі 2006 году, — папярэдзіў ён у гутарцы на радыё «Свабода». — Я буду паступова пераўтварацца ў сур’ёзны, стабільны палітычны фактар, незалежна ад вынікаў кампаніі 2006 году», — абяцае ён. І цешыць: «Калі на нашых плошчах будзе стаяць не 500 чалавек, а 50 тысяч, тады Краўчанку ня будзе складана правесьці перамовы зь сілавымі структурамі».

## «БДГ»: Колас — беларускі Гавал



Пад такім загалоўкам зьявілася на bdg.by гутарка Рамана Якаўлеўскага з дырэктарам нязломнага Беларускага ліцэю. Сам Колас заяўляе пра гатоўнасьць падтрымаць адзінага кандыдата ад апазыцыі, але пазьней — калі сытуацыя стане ясьнейшай.

**МБ**

## СЬЦІСЛА

### Сурвілла наведае Брусэль

На наступным тыдні кіраўніцтва БНР — старшыня Рады Івонка Сурвілла і ейны намесьнік Сяргей Навумчык — наведаюць Брусэль. Мэта візыту — перамовы з эўракамісарамі і эўрадэпутатамі ў справе беларускамоўнага радыёвяшчаньня з Эўропы.

### Зблiжэньне Ўкраіны й Беларусі

У найбліжэйшыя тыдні Менск з афіцыйным візытам наведае прэм’ер-міністар Украіны Юры Ехануроў. Дамова пра гэта была дасягнута падчас візыту ў Кіеў кіраўніка МЗС Беларусі Сяргея Мартынава. Пасьля візыту ўкраінскага прэм’ера мяркуецца сустрэча А.Лукашэнкі зь Віктарам Юшчанкам на мяжы або ў Чарнобылі. Аб’ём гандлю з Украінай расьце, сёлета ён складзе паўтара мільярда даляраў.

Украіна адмовілася ад крытыкі Беларусі ў сфэры правоў чалавека, бо мае намер стаць пасярэднікам у беларуска-польскім канфлікце.

### Добра жыць у Жлобіне

Паводле зьвестак Мінстату, сярэдні заробак на прамысловых прадпрыемствах склаў «брудными» 528 тыс. Найбольшы заробак — на прадпрыемствах чорнай мэталюргіі — 1 млн 107 тыс. рублёў і ў хімічнай прамысловасьці — 757 тыс. Чыгуначнікі атрымліваюць, паводле афіцыйнай статыстыкі, 637 тыс. Сярэдні заробак у сфэры АПК — 309 тыс., у работнікаў культуры — 381 тыс.

### Хата Чэслава Немэна

30 верасьня ў польскім Вроцлаве ў Галерэі калегіюму Ўсходняй Еўропы пройдзе аўкцыён працаў вядомых мастакоў з Украіны, Беларусі, Польшчы, Нямеччыны, Кітаю, ЗША ды іншых краінаў. Выручаныя сродкі пойдуць на куплю й рамонт хаты ў Старых Васілішках Шчучынскага раёну, дзе нарадзіўся і рос легендарны сьпявак і кампазытар Чэслаў Немэн.

### Эўрастадыён у Віцебску

Віцебскі цэнтральны спарткомплекс (былы стадыён «Дынама») атрымаў прызнаньне Саюзу эўрапейскай футбольнай асацыяцыі (УЭФА). На спартовай арэне абласнога цэнтру цяпер можна праводзіць матчы эўракубкаў. Справа за малым — каб віцебскі «Лякаматыў» завяваў мэдалі беларускага чэмпіянату. Міжнародным стандартам адпавядаюць таксама стадыёны ў сталіцы, Гомелі, Барысаве.

### Сырныя дні злодзеяў

У Чылі невядомыя нахабным чынам скралі чатыры тоны сыру. Налёт быў учынены ўдзень у горадзе Касаблянка. Выкрадальнікі ўварваліся на тэрыторыю малочнага заводу і, пагражаючы зброяй, прымусілі рабочых пагрузіць у аўтамабіль 350 скрыняў з сырам, а таксама частку абсталяваньня, пасьля чаго далі дзёру.

**AP; football.by, naviny.by, pahonia.promedia.by**

# Хто зловіць фэномэн «выбуховага рэйтынгу»?

## Улада дзейнічае філігранна

**«НН»: Якога кандыдата прагне беларускае грамадзтва?**

**Андрэй Вардамацкі:** Ёсьць два тыпы рэакцыі грамадзкай думкі на лідэра краіны. Гэтыя тыпы не зьяўляюцца спэцыфічна беларускімі, бо ўласьцівыя для любой краіны. Першы — рэакцыя ў выглядзе яшчэ больш моцнага праяўленьня той найбольш характэрнай якасьці, якая прысутнічае ў лідэру пэўнай краіны. Калі гэта чалавек рэзкі, то на зьмену яму мусіць прыйсьці яшчэ больш рэзкі чалавек. Калі гэта чалавек рашучы, перамагчы яго можа чалавек яшчэ больш рашучы. Другі тып — рэакцыя процілегласьці. Калі лідэр зьяўляецца чалавекам рэзкім па характары, на зьмену яму мусіць прыйсьці мяккі чалавек. Калі лідэр апэлюе да шырокіх колаў грамадзтва і размаўляе простай мовай, дык павінен прыйсьці чалавек, які размаўляе больш вытанчанай мовай. Гэтыя два варыянты — агульная заканамернасьць, якая пашыраецца й на Беларусь.

Для беларускай грамадзкай думкі характэрныя дзьве рэчы. Першае — стомленасьць ад пэрсаналіі. І рэч тут не ў канкрэтнай пэрсаналіі, а ў часе, цягам якога дзейнічае адна асоба, бо ў выніку гэтага надыходзіць рэакцыя стомленасьці. З другога боку, можна казаць пра адсутнасьць якогасьці значнага рэйтынгу ў іншай пэрсаналіі. Гэта натуральная рэакцыя грамадзкай думкі на сытуацыю ў СМІ — іншыя пэрсаналіі папросту не рэпрэзэнтаваны. Беларусы лепш ведаюць расейскі, украінскі палітычны бамонд, нават заходні, чым тых пэрсанажаў беларускай палітычнай арэны. Улада дзейнічае філігранна дакладна. Тыя людзі, якія цяпер «на хіміі», — якраз тыя асобы ў апазыцыі, якія ў найбольшай ступені пасавалі б да вулічных дзеяньняў.

**«НН»: Гэтыя людзі і ёсьць «пажаданымі» апазыцыйнымі кандыдатамі?**

**АВ:** Існуе розьніца паміж «пажаданым» і «эфэктыўным» кандыдатам. Эфэктыўны — той, які ў сёньняшніх варунках здольны да вулічных дзеяньняў, а гэтыя кандыдаты знаходзяцца цяпер па-за межамі сталіцы. Што тычыцца «пажаданага», то тут грамадзтва неаднароднае. Адна яго частка чакае кандыдата яшчэ больш рашучага, уладнага, простага. Другая прагне кандыдата больш спакойнага, рафінаванага. Ёсьць і іншы момант — слова «перамены». Пра гэта шмат гавораць — магчымасьць і неабходнасьць пераменаў у краіне. Але спэцыфіка ў тым, што, з аднаго боку, большая частка насельніцтва, згодна з сацыялягічнымі апытаньнямі, арыентаваная на перамены, але, з другога боку, ёсьць значны працэнт насельніцтва, які кажа, што калі перамены й адбудуцца, дык толькі ў горшы бок. Гэта вынік шматгадовага вопыту савецкіх рэалій, калі перамены нэгатыўна адбіваліся на насельніцтве. Гэта моцны козыр Лукашэнкі.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Козыр Лукашэнкі — савецкі вопыт, калі перамены нэгатыўна адбіваліся на насельніцтве.

Адбываецца наступнае: нават той чалавек, які ня надта станоўча настроены ў дачыненьні да прэзыдэнта і ня вельмі добра ўголас пра яго гаворыць, прыходзячы на выбарчы ўчастак, у момант «Ч» — час прыняцьця рашэньня за каго галасаваць — атрымлівае два моцныя імпульсы. Першы: хто іншы? Іншага няма. І другі — калі перамены й будуць, ці ня ў горшы бок? Таму чалавек галасуе за дзейнага прэзыдэнта. Вось такі мэханізм прыняцьця рашэньня ў значнай часткі электарату. Гэты працэс спрацоўвае ў момант «Ч». Але ёсьць такі спэцыфічна беларускі працэс, як «фэномэн выбуховага рэйтынгу».

**Доктар сацыялёгіі, прафэсар Андрэй Вардамацкі** 13 гадоў узначальвае лябараторыю аксіямэтрычных дасьледаваньняў «Новак» («Новая аксіямэтрыя»). Нарадзіўся ў 1956 у пасёлку Джар-Курган Сурхандар'інскай вобласьці (Узбэкістан). Скончыў БДУ. Адзін з найбольш аўтарытэтных беларускіх сацыёлягаў. Гэтае інтэрвію ён пачаў з падкрэсьліваньня сваёй апалітычнасьці.

## Рэч ня ў Домашу

**«НН»: Маецца на ўвазе рэйтынг Домаша пяць гадоў таму?**

**АВ:** Так, але рэч тут ня ў Домашу. Любая альтэрнатыўная асоба, якая зьвіцца на беларускім палітычным полі, будзе хутка набіраць рэйтынгавыя пазыцыі па прынцыпе «Любы іншы, абы не…». У значнай ступені гэта было і ў 1994-м, калі галасаваньне ішло не за Лукашэнку, а супраць Кебіча. Але ў сёньняшняй сытуацыі Лукашэнка б не зьбіўся. У сёньняшняй мэдыйнай сытуацыі ягоны фэномэн не адбыўся б.

**«НН»: У чым фэномэн дзесяцігадовай устойлівасьці рэйтынгу прэзыдэнта і абсалютнай загнанасьці ўсіх альтэрнатыў?**

**АВ:** Ёсьць тры чыньнікі. Першы — эканамічная сытуацыя. Калі б яна цяпер зьмянілася, Лукашэнкаў рэйтынг адразу пачаў бы падаць. Але эканамічных падставаў для зьмяншэньня рэйтынгу прэзыдэнта сёньня няма з розных прычынаў, галоўная зь якіх — сытуацыя на сусьветным нафтавым рынку.

Другі чыньнік — мэдыйны, які пабудаваны тэхналягічна пісьменна. Прадстаўлена адна пэрсаналія, і нават калі людзі крытычна ставяцца да БТ, гэта ня значыць, што яны адначасова станоўча ставяцца да чагосьці іншага — іншага проста няма. Вынік у тым, што ня ўсе калёнамі «за», але і няма калёнаў, якія «супраць».

Трэцяе — замежнапалітычная каньюнктура: пэрманэнтна станоўчае стаўленьне да Лукашэнкі з боку Расеі, і, з другога боку, несупастаўная хуткасьць прыняцьця рашэньняў беларускімі ўладамі і Эўропай. Эўразьвяз дзейнічае вельмі павольна, і — калі ён і надалей будзе дзейнічаць так, як дзейнічае цяпер — Лукашэнка будзе апярэджваць Эўразьвяз заўсёды.

## Эўрапейская хуткасьць

**«НН»: А што ж з ідэямі адкрыцьця радыёстанцый? Ці можа гэта дапамагчы, паўплываць на мэдыйную сытуацыю?**

**АВ:** Высілкі ЭЗ проста сьмешныя ў параўнаньні з мэдыйнымі магчымасьцямі ўладаў.

**«НН»: Сёньняшняя тактыка вылучэньня «адзінага» дапаможа апазыцыі пазьбегнуць памылак, зробленых у 2001-м?**

**АВ:** Пра стратэгію магу сказаць тое ж, што й пра дэмакратыю: «Дэмакратыя — вельмі дрэнны від кіраваньня грамадзтвам. Але ніхто ня вынайшаў лепшага». Тое ж са стратэгіяй адзінага кандыдата. Ёсьць маса хібаў, але на гэты момант лепшага няма, і ў параўнаньні з 2001-м галоўнае — больш зручная пазыцыя па часе. Часу болей, чым на мінулых выбарах.

## Кубінізацыя грамадзтва

**«НН»: Ці адбыліся за апошнія дзесяць гадоў істотныя зрухі ва ўспрыманьні беларускім грамадзтвам палітыкаў як такіх?**

**АВ:** Можна казаць пра ўзаемна супрацьлеглыя працэсы. З аднаго боку, палітычная сьвядомасьць стала больш ускладненай, яна ўжо ў стане рабіць больш прасунутыя ацэнкі, чым у 1994-м. Цяпер грамадзтва можа аналізаваць палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя зьявы. З другога боку, можна гаварыць пра большую ступень закрытасьці беларускай палітычнай сыстэмы — яна ўсё менш выходзіць вонкі. Некаторыя называюць гэта атмасфэрай страху, але гэта можна назваць «кубінізацыяй грамадзкай думкі» — закрытае грамадзтва не камунікуе міжсобку, няма кантакту паміж яго элемэнтамі. І яшчэ адна асаблівасьць кубінізацыі — вера ў тое, што ў нас эксклюзіўны, правільны, непаўторны шлях. Гэта вельмі дрэнна, бо працэсы прасьвятленьня бываюць балючымі.

**Гутарыў Зьміцер Дрыгайла**

# Цімашэнка з выгляду і Тэтчэр па розуме

Апытаньне «НН» на вуліцах Менску: якім павінен быць кандыдат у прэзыдэнты ад апазыцыі?

**Вольга,** супрацоўніца дзяржаўнай установы:
— Мужчына ці жанчына — абсалютна ўсё роўна. Узрост — 45—50 гадоў, 55 — у крайнім выпадку. Пажадана, чалавек з вышэйшай адукацыяй (але не гістарычнай), можна — зь дзьвюма. Найлепш — эканаміст, які мае вялікі стаж працы на дзяржаўным прадпрыемстве. Не атэіст. Кандыдат павінен быць сямейны чалавек, ні ў якім выпадку не разьведзены. Разумны, інтэлігентны, сымпатычны, каб ведаў ня менш як дзьве замежныя мовы. Ад Лукашэнкі яго будзе выгадна адрозьніваць выхаванасьць.

**Яўген,** чацьвёртакурсьнік БДУ:
— Кандыдат ад народу павінен быць перш за ўсё адказным. Ён павінен прытрымлівацца тых поглядаў, якія падзяляюць яго саюзьнікі, дэмакратычныя краіны — перш за ўсё Польшча. Вэктар павінен зьмяніцца на Захад.

**Алена,** супрацоўніца адміністрацыі аднаго з буйных менскіх заводаў:
— Інтэлігентны, малады, не бюракрат савецкіх часоў. Можа быць, бізнэсмэн. Жанчына. Бо колькі мужыкі ні кіравалі, ні ад аднаго няма толку. Ад Лукашэнкі яна будзе адрозьнівацца розумам. Яна павінна быць інтэлігентнай, умець добра прамаўляць і кіраваць. Юлія Цімашэнка з выгляду і Маргарэт Тэтчэр па розуме!

**Сяргей Надзюк,** студэнт БДУ:
Чалавек ва ўзросьце да 40 гадоў, маральна сталы. Каб ішоў у нагу з часам.

**Валеры,** асьпірант:
— Перш за ўсё мужчына. Каб



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Няпроста аб'яднаць дзесяць розных палітычных сілаў. Пастаянна дзейная нарада па падрыхтоўцы Кангрэсу зьбіралася штодня.

# Чырвонае дрэва пад белым небам

Працяг са старонкі 3.

З прывітальным словам выступіць старшыня аргкамітэту Кангрэсу **Аляксандар Бухвостаў**. Весьці Кангрэс даручаць старшыню на чале адмыслова абранага прэзыдыюму. Ладную частку першага дня зоймуць выступы гасьцей і дэлегатаў. Удзельнікам Кангрэсу будуць таксама прадэманстраваны відэапрывітаньні ад **П. Севярынца** і **М. Статкевіча**.

Прэзэнтацыя кандыдатаў, іх выступы і адказы на пытаньні адбудуцца, хутчэй за ўсё, на другі дзень — каб адразу перайсьці да галасаваньня. Яно будзе праходзіць у адзін ці два туры па прынцыпе «адзін дэлегат — адзін голас». Каб перамагчы, трэ будзе набраць больш за 50% галасоў прысутных дэлегатаў. Пасьля таго як адзіны кандыдат будзе вызначаны, Кангрэс прыме палітычную плятформу аб'яднаных дэмакратычных сілаў у кампаніі-2006, зварот да беларускага народу і шэраг іншых рэзалюцый, у тым ліку пра нелегітымнасьць удзелу Лукашэнкі ў выбарах, падрыхтаваную акадэмікам **Вайтовічам**. Магчыма, Кангрэс будзе заканчвацца канцэртам, але гэта яшчэ дакладна не вядома — перамовы зь Менгарвыканкамам працягваюцца.

Калі Кангрэс зь нейкіх прычынаў не адбудзецца, яго правядуць праз два тыдні ў Кіеве. Аргкамітэт запатрабаваў ад уладаў правесьці перад Кангрэсам грунтоўную праверку Палацу культуры на наяўнасьць выбухоўкі. Акрамя міліцыянтаў, ахоўваць удзельнікаў Кангрэсу будуць 50 актывістаў-добраахвотнікаў з шэрагаў партый.

Ужо ў пятніцу а 16-й на ўправе Партыі БНФ пройдзе прэс-канфэрэнцыя для замежных журналістаў. Улічваючы пляны ўраду зрабіць 1 кастрычніка працоўным днём, праграма першага дня Кангрэсу будзе аблегчанай.

Айчынным тэлеканалам накіраваная прапанова выдзеліць этэрны час для інфармаваньня гледачоў пра ход Кангрэсу. Калі яны пойдуць насустрач, то атрымаюць дазвол накіраваць свае здымачныя групы ў залю Палацу культуры МАЗу. Кіраўніцтва тэлебачаньня з адказам пакуль не сьпяшаецца.

Аргкамітэт не плянуе актыўна выкарыстоўваць нацыянальную сымболіку ў аздабленьні залі, але ў сымбалі Кангрэсу — выяве чырвонага дрэва пад белым небам — прагледзяць знаёмыя колеры.

**Алесь Кудрыцкі**

## Мілінкевіч ня хоча цягнуць рызіну

Лідэры апазыцыі падпісалі супольную дэклярацыю аб гатоўнасьці працаваць адзінай камандай.

«Мы прыкладзём усе высілкі, каб падчас выбарчай кампаніі быў адзіны кандыдат у прэзыдэнты ад дэмакратычных сілаў. Для перамогі гэтага кандыдата спатрэбіцца падтрымка ўсіх выбарцаў, якія выступаюць за перамены, і высокапрафэсійная каманда аднадумцаў, якія маюць досьвед у розных галінах палітыкі, эканомікі і культуры», — гаворыцца ў дэклярацыі. «Мы будзем у гэтай камандзе», — запэўніваюць палітыкі.

Дакумэнт падпісалі **У.Колас**, **А.Вайтовіч**, **С.Калякін**, **А.Лябедзька**, **В.Лявонаў**, **У.Парфяновіч**, **В.Фралоў**, **С.Шушкевіч**, **А.Мілінкевіч**, **М.Статкевіч** і **А.Ярашук**. Практычна ўсе лідэры апазыцыі, акрамя **А.Казуліна**.

На думку аўтараў дакумэнту, «Кангрэс дэмакратычных сілаў стане па-сапраўднаму народным сходам тых, хто хоча ў краіне пераменаў».

А.Мілінкевіч і М.Статкевіч падпісалі дакумэнт з уласным дадаткам: «Падтрымліваю дэклярацыю пры ўмове, што адзіны кандыдат ад дэмакратычных сілаў будзе абраны ў адпаведнасьці з рашэньнем кааліцыі на Кангрэсе 1—2 кастрычніка».

Досыць цягнуць рызіну, мяркуе А.Мілінкевіч. «Не павінна быць ніякіх пераглядаў ды іншых варыянтаў. Некаторыя прадстаўнікі дэмсілаў хочуць надаць Кангрэсу статус пэрманэнтнасьці. Гэта роўна сьмерці», — лічыць А.Мілінкевіч.

## Як вы ставіцеся да заклiку Фядуты?

Аляксандар Фядута заклікаў лідэраў «дзясяткі» сысьці ў адстаўку, калі адзіны кандыдат не атрымае перамогі на прэзыдэнцкіх выбарах. Як ставяцца да гэтага звароту стваральнікі і аналітыкі беларускага палітычнага кантэксту?

**Віктар Карняенка, кіраўнік выбарчага штабу А.Мілінкевіча:**
Неадназначна стаўлюся. Калі няздольны – трэба саступіць дарогу. Але паўстае пытаньне – каму? На жаль, у дэмакратычным асяродзьдзі не назіраецца штурханіны лакцямі ў імкненьні да палітычнага алімпу. Падзяляць адказнасьць трэба, але пытаньне ня мусіць ставіцца рубам. Кожная палітычная партыя павінна будзе ацаніць унёсак сваіх лідэраў самастойна.

**Уладзімер Парфяновіч, трохалімпійскі чэмпіён і бізнэсовец:**
Спадар Фядута мае рацыю, але ня цалкам. Яны абавязаныя пайсьці ў адстаўку не пасьля выбараў, а да іх. А што яны зрабілі? Нічога ня зроблена. У гэтых палітычных лідэраў задача пакінуць свае партыі дзеяздольнымі, а не перамагчы ў выбарах.

**Сяргей Панькоўскі, рэдактар сайту «Наша думка»:**
Хацелася б верыць, што гэта не рытарычны ход, і ён сапраўды абумоўлены клопатам А.Фядуты пра стан дэмакратычнага руху. Я ня ўпэўнены, што зварот А.Фядуты будзе мець практычныя наступствы, але гэта чаргоўы сыгнал. Трэба пераасэнсаваць некаторыя стратэгічныя канцэптуальныя падыходы, зьвязаныя зь месцам апазыцыі ў нашым грамадзтве. Адна справа – апазыцыя ў нармальнай палітычнай сыстэме, і іншая – апазыцыя ва ўмовах аўтарытарнага рэжыму, які хутка эвалюцыянуе ў бок таталітарызму. Апазыцыя існуе напаўпадпольна, і гэта вымагае канцэпцыяў і стратэгіяў, адрозных ад тых, якія існавалі год таму.

**Юры Хашчавацкі, кінарэжысэр:**
Я стаўлюся... ніяк. Безумоўна патрэбная сьвежая кроў. Але вінаваціць сёньняшніх лідэраў у слабасьці нячесна. Таксама я магу абвінавацiць недзяржаўную прэсу ў тым, што яна слабая і не даходзіць да кожнай вёскі. Усе дзейнічаюць у складаных умовах. Замест таго каб лаяцца, трэба навучыцца працаваць кампрамісна.

**Лявон Баршчэўскі, старшыня Беларускага ПЭН-цэнтру:**
З гумарам стаўлюся. Дысыдэнты ў адстаўку не ідуць. А нашы ўсе палітычныя лідэры – дысыдэнты, бо яны ня маюць магчымасьці ўдзельнічаць у сыстэмнай палітыцы. Дысыдэнты ёсьць проста харызматычнымі асобамі і прадстаўнікамі пэўнай сыстэмы поглядаў. Яны, хутчэй, сымбалічныя асобы, чым рэальныя. Я ня бачу натоўпу прэтэндэнтаў на іх месца, бо сёньня займацца палітыкай небясьпечна і цяжка. Палітыкаў трэба шанаваць, нялёгкі гэта хлеб.

**Апытваў Алесь Кудрыцкі**

умеў прыгожа гаварыць. Узрост — ня большы за пяцьдзясят. Пажадана з нацыянальнымі поглядамі. Беларускамоўнасьць павінна яго адрозьніваць ад іншых кандыдатаў.

**Віталь,** інжынэр прыватнай канструктарскай фірмы:
— Не атлусьцелы, ня той, які ўсё жыцьцё партфэль цягаў. Каб быў сталы мужчына, які ўжо склаўся, адбыўся, сямейны, каб шмат чаго дамогся ў жыцьці, каб прэзыдэнцтва стала вянцом кар'еры. Каб меў добрыя сувязі з усім сьветам.

**Тацяна,** асьпірантка:
— Пісьменны, каб умеў правільна размаўляць, паважліва гутарыць з апанэнтамі.

**Антось,** студэнт, родам са Слоніму:
— Гэта павінен быць чалавек з народу, каб ведаў праблемы, якія турбуюць народ. Чалавек, які зможа павесьці за сабою, ён павінен трымаць слова. Гэта павінен быць чалавек з інтэлігенцыі.

**Яня,** студэнтка, родам з Браслава:
— Каб быў шчыры і выклікаў давер. Гэты чалавек не павінен цурацца роднай мовы, як гэта робіць большасьць палітыкаў. Ён абавязкова павінен размаўляць па-беларуску. Быць чалавекам, у любым выпадку.

**Андрэй,** беспрацоўны:
— Я аддам свой голас за чалавека, які скажа: «Я перамагу Лукашэнку!»

У апытаньні «НН» найперш зьвярталася да людзей маладых — тых, хто рухае зьменамі. Адчуваецца, што абсалютная большасьць гэтых людзей ужо думалі пра тое, на карысьць каго хацелі б зрабіць выбар. Яны ахвотна дзеляцца думкамі наконт гэтага. На пытаньне карэспандэнта, зададзенае па-беларуску, большасьць зь іх адказвалі на роднай мове. Але акрамя мовы ў адказах можна знайсьці шмат іншых падабенстваў.

Чалавек, за якога апытаныя аддадуць свае галасы, павінен быць для іх блізкім і зразумелым — у процівагу няўцямнай рыторыцы апазыцыйных праграм. Ён мусіць быць культурным — у процівагу хамству ўлады. Пакуль людзі не гатовы назваць імя кандыдата сваёй мары — яны яшчэ нават ня ведаюць імёнаў, зь якіх можна выбіраць. Яны найчасьцей кажуць пра кандыдата, карыстаючыся мужчынскім родам, але прынялі б і кандыдата-жанчыну. Выбаршчыкі бачаць перад сабой дастаткова маладога (каля пяцідзесяці) палітыка, выдатна адукаванага прафэсіянала, добрага сем'яніна. Таго, каму яны будуць давяраць. Таго, хто будзе размаўляць зь імі на іх мове.

**Алесь Кудрыцкі**

# Экспартны апакаліпсіс

Працяг з старонкі 1.

Беларусь атрымлівае сыравіну (газ і нафту) з Расеі па нізкіх цэнах, але прадае на Захад прадукцыю па сусьветных цэнах. Перш за ўсё гэтым забясьпечаны «фэнамэнальны прырост» ВУП. Але што адбудзецца тады, калі ланцужок «расейскія сыравіны — беларускія вытворцы — эўрапейскі спажывец» нечакана пазбавіцца апошняга зьвяна?

## Загадкавы экспарт у Нідэрлянды

Беларусь шчыльна зьвязаная з эканомікай Эўразвязу, нашмат больш, чым раней. Экспарт у краіны за межамі СНД няспынна рос, пачынаючы ад 2001 г. Статыстыка сьведчыць: найбольш актыўна Беларусь экспартуе на захад мінэральныя прадукты (найперш прадукты нафтаперапрацоўкі) — 81,8% ад агульнага іх аб’ёму. Прычым, калі аб’ём экспарту мінэральных прадуктаў за першую палову 2004 г. склаў $1,466 млрд, то за першую палову гэтага году — $2,356 млрд.

Аднак найважнейшыя партнэры Беларусі сярод краінаў ЭЗ — гэта не Нямеччына і Польшча, як лягічна было б чакаць, а Брытанія і Нідэрлянды. Чаму?

Бо менавіта ў гэтых краінах зарэгістравана шмат даччыных кампаній шматлікіх расейскіх карпарацый, у тым ліку й нафтавых. Яны карыстаюць з падатковых ільготаў, якія распаўсюджване на іх брытанскае і нідэрляндзкае заканадаўства. А зь іншага боку, яны падпадаюць пад усе выгоды, якія дае рэгістрацыя ў Эўразвязе. Без прамых кантактаў зь беларускай прэзыдэнцкай адміністрацыяй не абыходзіцца ніводная з гэтых кампаній, бо экспарт нафтапрадуктаў рэгулюецца дзяржавай. Расейскія кампаніі маюць жывую зацікаўленасьць у такіх кантактах, каб трапляць на эўразьвязаўскі рынак. Рэч у тым, што ў Расеі практычна няма заводаў, аналягічных беларускім, на якіх маглі б вырабляцца палівапрадукты, найперш дызпаліва і алівы, што адпавядаюць экалягічным стандартам ЭЗ.

Для расейскіх кампаній схема пастаўкі ў Беларусь энерганосьбітаў па зьніжаных тарыфах аказваецца выгаднай. Бо ў далейшым выраблёная зь іх прадукцыя экспартуецца ў ЭЗ праз афіляваныя зь расейскімі заходнія кампаніі. Прыбытак дзеліцца «па справядлівасьці». «Гэтая экспартна-імпартная схема выгадная для беларускага рэжыму», гаворыцца ў справаздачы. Але народ Беларусі мала што атрымлівае ад гэтых прыбыткаў і зусім ніяк не кантралюе іх — бо нават існы кішэнны парлямэнт ня мае права кантролю над прэзыдэнцкімі фондамі. З гэткага капіталу схемаў растуць і ногі лукашэнкаўскага лобі за мяжою.

## Чым пагражае эмбарга

Аўтары справаздачы даводзяць, што абмежаваньні на гандаль зь Беларусьсю рэзка нэгатыўна паўплывалі б на краіну. Санкцыі выклічуць структурныя зрухі ў гаспадарцы: зьніжэньне ВУП, рост інфляцыі, зьніжэньне прыбыткаў прадпрыемстваў, дысбалянс унутранага валютнага рынку, дэвальвацыю рубля, зьмяншэньне валютнага рэзэрву Нацбанку. Абвострыцца праблема бюджэтнага дэфіцыту.

Калі ж Беларусі будзе забаронена ня толькі экспартаваць свае прадукты наўпрост у краіны Захаду, але і рабіць гэта праз сваіх партнэраў у краінах СНД, крызіс можа пайсьці глыбей.

Першай ахвярай эмбарга стануць НПЗ, 80% прадукцыі якіх ідзе ў краіны ЭЗ. Нафтаперапрацоўчая індустрыя забясьпечвае больш за 20% усяго аб’ёму прамысловай вытворчасьці ў краіне. Толькі праз гэта ВУП можа зьменшыцца на 5%.

Калі ўявіць, што эмбарга ўвядзецца 1 студзеня 2006 г., а цэны на нафту ня будуць значна вагацца, то экспартныя страты Беларусі складуць каля двух з паловай млрд даляраў у год. Дэфіцыт валюты, у такім разе, на ўнутраным рынку ўжо ў першым квартале можа скласьці каля 1,150 млрд даляраў.

На думку аўтараў дакладу, эмбарга на 90% паралізуе дзейнасьць 17 галоўных прадпрыемстваў краіны, страты бюджэту празь зьніжэньне падатковых паступленьняў складуць 12—13%.

Каб стабілізаваць фінансавую сытуацыю, Нацбанку, імаверна, давядзецца прадаваць золатавалютныя рэзэрвы (цікава, што іх аб’ём прыкладна роўны мажліваму дэфіцыту валюты на ўнутраным рынку ў выніку эмбарга) ці правесьці дэвальвацыю рубля.

Экспэрты прызнаюць, што зьніжэньне бюджэтных выдаткаў ня будзе катастрафічным — урад зможа часткова фінансаваць свае праграмы за кошт назапашаных раней сродкаў. Але яно будзе вельмі адчувальным.

Эмбарга на пастаўку беларускіх нафтапрадуктаў у Эўропу ніяк не адбілася б на эўрапейскім рынку, але стала б значным ударам па эканоміцы Беларусі і прыватных эканамічных інтарэсах як вышэйшага кіраўніцтва, — робіць высновy «Понціс» у камэнтары да справаздачы.

## А што Расея?

Увесь сцэнар расьпісаны пры ўмове захаваньня цяперашняга стану дачыненьняў з Расеяй. Аднак можна прагназаваць, што Расея ў выпадку санкцый Захаду «працягне руку дапамогі». Узамен за сувэрэнітэт, напрыклад.

На думку аўтараў, якраз рост экспарту ў Эўразвяз ляжыць у аснове беларускага эканамічнага росту. Вынік справаздачы можна назваць неспадзяванкай, якая ляжала ў нас пад носам: экспэрты бралі ўсю інфармацыю з афіцыйных крыніц — справаздачаў Міністэрства статыстыкі і аналізу ды Нацбанку.

Публікацыя справаздачы — сапраўдная сэнсацыя. Яна можа азначаць, што Захад пачаў усур’ёз прыглядацца да сцэнароў увядзеньня эмбарга супраць Беларусі. Яны могуць быць задзейнічаны ў выпадку, калі сытуацыя ў Беларусі абвострыцца або ўзрасьце рэпрэсіўнасьць рэжыму.

Як вынікае з справаздачы, лідэры краіны мусяць улічваць: гаспадарка Беларусі надзвычай залежыць ад гандлю з Эўропай, і эканамічная інтэграцыя з ЭЗ паглыбляецца. Таму эканоміка будзе схіляць Беларусь да такой палітыкі, пры якой адносіны з Эўропай былі б найлепшымі.

**Алесь Кудрыцкі**




**У выпадку абвяшчэньня эмбарга нафтавыя рэзэрвуары Мазырскага камбінату хутка перапоўняцца.**

**Геаграфічная структура беларускага экспарту (%)**

| | 2001 | 2002 | 2003 | 2004 | Першае паўгодзьдзе 2004 | Першае паўгодзьдзе 2005 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Краіны СНД | 60,3 | 54,7 | 54,6 | 53,1 | 52,9 | 43,9 |
| Краіны па-за межамі СНД | 39,7 | 45,3 | 45,4 | 46,9 | 47,1 | 56,1 |

*Крыніца: Міністэрства статыстыкі і аналізу*

**Фонд «Понціс»** заснаваны ў 1995 як амэрыканскі Фонд для грамадзянскай супольнасьці, у 1997 кіраўніцтва фондам перададзенае славакам. Назву «Понціс» (у перакладзе з лаціны — «мост») атрымаў у 2001. Сярод фундатараў «Понцісу» ня толькі такія вядомыя арганізацыі, як Нацыянальны фонд дзеля дэмакратыі (ЗША) ці Сусьветны банк, але й славацкая філія Hewlett Packard. Фонд падтрымлівае недзяржаўныя арганізацыі і надае Беларусі вялікую ўвагу. У свой час экспэрт «Понцісу» Балаш Ярабік быў затрыманы ў Беларусі.

ТЭНДЭНЦЫІ

## Бульбу губяць палоскі

Што такое восень? Гэта бульба. У пятніцу на дарогах тлум аўтамабіляў, што нясуць сваіх гаспадароў у кірунку малых радзімаў. Нядзельным вечарам тыя ж аўтамабілі, прыемна абцяжараныя мяхамі, задраўшы насы ў неба, цягнуць гаспадароў у горад. Вось толькі сёлета здарыўся неўраджай. Аднак нават у такі благі год на Гарадзеншчыне бульбы бяруць у два разы болей, чым на Віцебшчыне. У гаспадарках поўначы атрымліваюць па сто і меней цэнтнэраў з гектару — пры норме пасадкі 40 ц/га.

Калі адкінуць надвор’е, прычына нізкага ўраджаю — дробнатаварная вытворчасьць. На долю калгасаў прыпадае толькі 10% ад агульнай плошчы пасадак, 90% урабляюць прыватнікі. Халодны, вільготны пачатак лета выклікаў хваробы, вось бульба і гніе дагэтуль. Дадайце сюды фітафтору ды каларадзкага жука, што амаль не адчуў сёлетняй зімы. А насельніцтва ў большасьці займаецца бульбай па старынцы, не прымяняючы сучасных сродкаў ці выкарыстоўваючы іх абы-як. Апчаджаюць на якасным насеньні, хоць і дарагаватым. Кладуць у зямельку, што ёсьць. Большасьць садзіць бульбу штогод у адным і тым жа месцы, што непажадана.

Дзяржава, рэгулюючы закупныя цэны і жорстка вызначаючы шляхі рэалізацыі ўраджаю, не спрыяе павышэньню якасьці вытворчасьці. І сапраўды, які сэнс укладваць сродкі ў тое, што не акупляецца? Паводле чутак, сёлета Менскі аблвыканкам забараніў насельніцтву мець справу з камэрцыйнымі структурамі, вызначыўшы планку закупачных цэн у 240 рублёў. У вёсцы прызвычаіліся да такой схемы, калі на працягу восені бульба за грашы здаецца ў райспажыўсаюзы, а вясною, калі яна страціць у вазе і прывабнасьці, пачынаюць езьдзіць скупнікі і браць амаль за тыя ж грошы рэшту запасаў. Бульбу штогод высаджваюць нібы па інэрцыі — абы для сябе. Вось і выходзіць, што ў Бульбяндзіі бульбы зьбіраюць усяго 150 цэнтнэраў з гектара. Між іншым, утрая менш, чым у Польшчы. Той самай, дзе па словах аднаго палітыка, усё так кепска.

**Сямён Печанко**

# СЬЦІСЛА

## «Нардзін» хоча здацца

Мэдцэнтар «Нардзін» хоча адмовіцца ад статусу прыватнага прадпрыемства й перадаць дзяржаве частку сваёй уласнасьці. Спроба атрымаць новую ліцэнзію Міністэрства аховы здароўя на мэдыцынскую дзейнасьць аказалася беспасьпяховай. Іншы мэдыцынскі цэнтар «Экамэдсэрвіс» ліцэнзію атрымаў. Ён зарэгістраваны як беларускае прадпрыемства, а не беларуска-амэрыканскае СП, як было раней.

## Новы кандыдат на турму

Збор акцыянэраў ААТ «Белаграпрамбанк» 27 верасьня прызначыў новага кіраўніка праўленьня Сяргея Румаса. Згоду на ягонае прызначэньне даў 22 верасьня А.Лукашэнка. С.Румас прыйшоў на зьмену Аляксандра Гаўрушава. Той кіраваў банкам дзевяць гадоў, але пазбавіўся пасады па выніках праверкі дзяржкантролю. Большасьць папярэдніх кіраўнікоў банку скончыла турмою.

## На піва зь «Сябрам»

З 10 кастрычніка пачне продаж прадукцыі бабруйская броварная кампанія «Сябар». Дзьве маркі — «Сябар» і «Баброў» — будуць выпускацца ў плястыкавых бутэльках. Кампанія «Сябар» — гэта нашчадак ААТ «Дзеднава».

## Будзем вазіць кітайцаў

Прагнозныя паказьнікі ў сфэры ўязнога турызму Беларусі дапаможа выканаць Кітай, сказаў журналістам намесьнік міністра спорту й турызму Чэслаў Шульга. Дзеля гэтага для кітайскіх турапэратараў будзе створаны шэраг прамацыйных тураў у Беларусь. Пасьля падпісаньня дагавору аб супрацоўніцтве ў галіне турызму паміж нашымі краінамі Беларусь трапіць у сьпіс краін, якія афіцыйны Пэкін рэкамэндуе сваім шматлікім грамадзянам для наведваньня.

## Літва пяройдзе на эўра

27 верасьня ўрад Літвы ўхваліў плян пераходу на эўра з 1 студзеня 2007 г. Цяпер гэты плян павінны зацьвердзіць літоўскі Нацбанк. Канчатковае ж рашэньне прыме кіраўніцтва Эўразвязу. Згодна з плянам, камэрцыйныя банкі будуць ажыцьцяўляць абмен наяўных літаў да 1 сакавіка 2007 году, а Нацбанк Літвы — неабмежаваны тэрмін. Раней старшыня Нацбанку Літвы Рэйнальдас Шаркінас паабяцаў, што кожны дарослы жыхар краіны напярэдадні ўвядзеньня эўра атрымае ў падарунак па калькулятары.

**ЗД; interfax.by**

## КУРСЫ ВАЛЮТ

**на 29 верасьня**

1 амэрыканскі даляр — 2 150 рублёў
1 эўра — 2 587,63 рубля
1 ангельскі фунт – 3 806,51
1 швайцарскі франк – 1 663,51
1 латвійскі лат — 3 717,79
1 літоўскі літ — 749,43
1 польскі злоты — 661,97
1 расейскі рубель — 75,34
1 украінская грыўна — 428,29

**Паводле Нацбанку**

# Магілёў вяртае ратушу



**Мураваная ратуша** ў Магілёве была закладзеная 4 верасьня 1679 г. Зь яе дзьвярэй 1 лютага 1661 г. выйшаў зь мячом у руках гарадзкі войт Левановіч — і пачалося паўстаньне супраць маскоўскага гарнізону. Ратушу не зруйнавалі бомбы Другой сусьветнай. У 1957 г. яе узрывалі двойчы. Урэшце зруйнавалі бульдозэрамі.

Магілёўскія ўлады адновяць сымбаль самакіраваньня. Прычым гаворка не пра рэстаўрацыю, а пра адбудову «з нуля». Піша **Аляксей Бацюкоў**.

Пасьля наданьня ў 1588 г. Магдэбурскага права ў Магілёве сталі зьяўляцца драўляныя ратушы. Але яны рэдка перажывалі больш за адну вайну. Закладзеная 4 верасьня 1679 г. мураваная ратуша адразу зрабілася сымбалем гораду, увасабленьнем гарадзкой вольнасьці. Некалькімі гадамі раней менавіта з будынку ратушы 1 лютага 1661 г. выскачыў зь мячом у руках гарадзкі войт Левановіч — і пачалося паўстаньне супраць маскоўскага гарнізону. Памяць пра паўстаньне засталася ў гербе гораду. Зьнішчыць цагляную кладку ратушы ня здолелі бомбы Другой сусьветнай. Старыя прыгадваюць, што нямецкі снайпэр, засеўшы ў вежы ратушы, доўга стрымліваў наступ чырвонаармейцаў. Снайпэра зьнялі снарадам з гаўбіцы.

На паваенных здымках ратуша, вышчарбленая ня горш за Холмскую браму Берасьцейскай крэпасьці, засталася цэлая. За савецкім часам будуць пісаць, што ратуша была «зьнішчана нямецка-фашысцкімі акупантамі». Насамрэч загад аб яе разбурэньні прыйшоў у 1957 г.

Гэта быў апошні з загадаў, паводле якіх разбураліся магілёўскія сьвятыні — Васкрасенская царква, Язэпаўскі сабор… З разбурэньнем апошняга зьвязана цікавая гісторыя. Тэлеграма з Масквы аб яго зьнішчэньні ў 1937 г. была мясцовымі ўладамі прынята да выкананьня адразу. Аднак у храме зачыніўся дырэктар абласнога музэю Іван Мігулін (той самы, замяшаны ў справе зьнікненьня крыжа Эўфрасіньні Полацкай), не дазваляючы ўзрываць будынак. Мігуліна выцягнулі сілком, аднак ад расстрэлу яго выратавала тэлеграма, якая прыйшла з Масквы на наступны дзень пасьля разбурэньня храму: «Сабору не ўзрываць».

Ратушу ў 1957 г. узрывалі двойчы. І двойчы сьцены трывалі, толькі пыл падняўся. Тады зруйнавалі бульдозэрамі.

У пляніроўку сучаснай Савецкай плошчы — былой Гандлёвай — ратуша цяжка ўпісваецца. Яна не ставарае супольнай фасаднай лініі зь іншымі дамамі, цяжка суадносіцца з манумэнтальнымі помнікамі барацьбітам за савецкую ўладу. Аднак у справе адраджэньня гістарычнай памяці гэта — дробязі.

Задумваецца трэба не пра слушнасьць разьмяшчэньня ратушы, кажуць архітэктары, а пра слушнасьць знаходжаньня вакол яе ўсяго астатняга, савецкага.

Рашэньне прынятае — ратуша будзе стаяць толькі на сваім месцы і толькі ў ранейшым выглядзе. У праекце, створаным Цэнтрам па рэгенэрацыі гісторыка-культурных каштоўнасьцяў, першапачаткова выгляд ратушы адноўлены цалкам — па старых фатаздымках, па дарэвалюцыйных чарцяжах.

Што разьмесьціцца ў будынку, пакуль ня вырашана. Хутчэй за ўсё, грамадзкая прыёмная старшыні гарвыканкаму ці музэй гісторыі гораду.

## СЬЦІСЛА

### Мадлен выбірае свабоду

Месяц таму ў Наваполацку зь перасоўнага заацырку зьбегла зялёная мартышка Мадлен. Завабіць назад у клетку ўцякачку ня здолелі. Цырк зьехаў, мартышка засталася ў гарадзкім парку. Ловы малпы працягваюцца да сёньня. Сярод навапалачан знайшліся людзі, якія штодня падкормліваюць зьбеглую «артыстку» — таму ня голад галоўная праблема «нелегалкі», а холад. За сваю ўпартасьць Мадлен можа паплаціцца жыцьцём, бо ночы робяцца ўсё халаднейшымі. 23 верасьня мартышку спрабаваў «зьняць» снайпэр з дапамогай снатворнай кулі. Аднак як ні завабнівалі мартышку бананамі ды булкамі, яна не наблізілася да снайпэра на адлегласьць стрэлу.

**Васіль Кроква, Наваполацак**

### Пранесла

21 верасьня ў Воршы знайшлі гранату Ф-1. Маленькі хлопчык пайшоў па патрэбе ў кустоўе, дзе ўбачыў вядомы па кінафільмах небясьпечны прадмет. Пра гэта ён расказаў свайму дзядулю, а той патэлефанаваў у міліцыю. Гэтым разам яна дзейнічала прафэсійна. Так, пазалетась у Доме быту таксама была знойдзена граната. Міліцыянт, які выносіў яе з будынку, загінуў, чацьвёра ягоных калегаў былі параненыя. Цяпер для абясшкоджваньня гранаты была выклікана група разьмінаваньня зь Віцебску. Але яе паслугі скарыстаць не давялося: самаробны ўзрывальнік не спрацаваў. Хто ж падкінуў гранату ў кустоўе побач зь людным прыпынкам, высьвятляе сьледзтва. Дарэчы, таго зламысьніка, які прынёс баявую гранату ў Дом быту, так і не знайшлі. Сьпісалі на крымінальныя разборкі. Не пасьпелі мінэры даехаць да абласнога цэнтру, як зноў тэлефануюць з Воршы. Пад адным з мастоў цераз Дняпро ў цэнтры гораду супрацоўнікі выратавальнай станцыі заўважылі на дне нейкі боепрыпас. Як высьветлілася, сапраўдны. 152-мілімэтровы артылерыйскі снарад часоў Другой сусьветнай быў узарваны за горадам.

### Даўгабуд на старых падмурках

У Воршы, на вуліцы Савецкай, асьвячоная новая царква Раства Багародзіцы. Першае набажэнства правёў у ёй архіяпіскап Віцебскі і Аршанскі Дзімітры. Каб годна сустрэць уладыку, мясцовым сьвятарам давялося ў аўральным рэжыме ладзіць часовыя цэляфанавыя дах, дзьверы, вокны, бо сталых пакуль няма. Будуецца храм марудна. Першы яго камень мітрапаліт Філарэт заклаў яшчэ ў 1998 г. Асаблівасьць храму ў тым, што ён будуецца на месцы царквы XVII ст., разбуранай саветамі. Яе падмуркі засталіся пад новым храмам. Будаваць новую царкву на іх — тэхнічна немэтазгодна.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

### Хакей у крэпасьці

Нарэшце высьветлілася, дзе ў Бабруйску будзе пабудаваны Лядовы палац. Спартовая арэна разьмесьціцца на тэрыторыі гістарычнага помніка «Бабруйская крэпасьць» і зможа ўмяшчаць ажно восем тысяч гледачоў. Мяркуецца, што адначасова з будаўніцтвам палацу рэканструююць і гістарычны помнік.

**Надзея Лісоўская, Бабруйск**

## ТЭНДЭНЦЫІ

# Нацыянальная хвароба «жаба»



**РУСЛАН РАВЯКА**

Гасьцяваў неяк на Лідчыне ў свайго дзядзькі, што лічыць сябе спрадвечным палякам. Насупраць ягонай хаты жыве ксёндз, недалёка — барочны касьцёл. Пасьля добрага стала мы сядзелі ў двары на лаве ды гутарылі. Тэмы размоваў пляліся між сабою ды нарэшце закранулі і палітыку. Мой дзядзька тыцнуў пальцам на ксяндзоў падворак і на поўным сур'ёзе вымавіў:

— А вось гэты, ты думаеш, чаго з Польшчы прыехаў? Віжуе! Натаўскі шпіён, напэўна! Польша ж у НАТО!

У вёсцы прымаюцца толькі два тэлеканалы…

Аднак справа тут не ў абмежаваньні інфармацыйнай прасторы. Быўшы прыкладна ў той самы час у Горадні, я зайшоў да сваіх сяброў-журналістаў, што працуюць пры каталіцкіх парафіях. Лічаць сябе карэннымі палякамі. Пра падзеі, зьвязаныя з Саюзам палякаў, мне адказалі: «Так ім і трэба. Ты ведаеш, якія грошы адмываліся? Лукашэнка добра зрабіў, што паставіў іх на месца».

Вось гэткая ў «нацменшасьці» беларуская нацыянальная хвароба пад назвай «жаба». Тая, што душыць…

Стаўленьне нашых палякаў да сваёй арганізацыі можа падацца дзіўным. Куды падзелася салідарнасьць? Але большасьць польскіх дамоў і клюбаў у заходнебеларускіх гарадах наагул ухіліліся ад канфлікту СПБ з уладаю. Для іх прымальнае любое кіраўніцтва: большасьць клюбаў існуюць аўтаномна, маючы свае кантакты з польскімі гарадамі й арганізацыямі. Таму тая цэнтралізацыя патрэбна толькі дзеля дзяржаўнай рэгістрацыі. Шараговыя палякі наагул са зьдзіўленьнем пазіраюць на гэтыя разборкі. Для іх галоўнае, каб задарма вазілі ў Польшчу ды дасылалі падарункі. Шмат хто зь іх нават па-польску ня ўмее.

Некалі за панскай Польшчай тым, хто запішацца палякам і прыме каталіцтва, у цэнтры Баранавічаў давалі плошчу пад хату. А падчас вайны тым, хто пайшоў у АК, плацілі далярамі. Прыйшлі саветы, і шмат хто з тых «палякаў» запісаўся беларусам. Але шмат хто і застаўся: такая нацыянальнасьць давала хаця б маральныя перавагі. «Я хамам нігды ня быў!» — шмат разоў даводзілася чуць ад паддатага электарату.

Колішняя палітыка апалячваньня цяпер адгукнулася досыць непрыемна, бо беларускія рысы характару ўсё адно праяўляюцца падчас выпрабаваньняў.

*Баранавічы*

# Ня ўсё так добра ў аркестры Фінберга

Заслужаны артыст Беларусі **Валеры Шчарыца** сышоў з аркестру Фінберга, дзе працаваў амаль дваццаць год.

«Калі музыка не іграе тое, што хоча, гэта застой», — кажа Валеры. Знакаміты музыка бяз працы не застаўся — яго труба гучыць у аркестры Укрдзяржтэлерадыё. Валеры спадзяецца атрымаць кватэру ў Кіеве, бо ў Менску чаргі на новую кватэру не дачакацца. Дзеля падзаробку Шчарыца, першы зь беларускіх джазмэнаў, які атрымаў званьне заслужанага артыста, па-за аркестрам іграў з саксафаністам Паўлам Аракелянам у кавярнях. Фінберг да падобных падпрацовак музыкантаў ставіцца нэгатыўна. Музыкі знайшлі простае выйсьце: іх прозьвішчаў не пазначаюць на афішах.

Шчарыца ў музыцы больш за 35 год, іграў у аркестрах Канстанціна Арбаляна, Менскага цырку, а ў 1987 году — у Фінберга. Падыгрываў і рок-музыкантам — «Крамбамбулі» і «Ляпісу Трубяцкому». Разам са Шчарыцам з аркестру пайшоў і яшчэ адзін трубач — Уладзімер Семянюк.

Ігар Сацэвіч з групы «Apple Tea», якая сышла ад Фінберга сем год таму ў поўным складзе, кажа, што музыкаў прыгнятаюць бюракратычныя дробязі, таксама Фінберг раўніва ставіцца да выступленьняў на баку. Але, на думку І.Сацэвіча, ня трэба перажываць з прычыны сыходу музыкантаў: «Гэта праблема ўсіх вялікіх аркестраў. Фінберг гэтага не разумее і крыўдуе».

Новых музыкантаў у аркестар пастаўляе Растоўскае музычнае вучылішча, зь якім у беларусаў своеасаблівае пагадненьне.

**Сяргей Будкін**

## Японскі поп

**22 верасьня Зьміцер Вайцюшкевіч прэзэнтаваў сваю новую праграму «Месяц і сонца». У ягоным выкананьні па-беларуску загучалі японскія песьні. Сьпявак сабраў поўную залю ў КЗ «Менск».**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

КАЛЯНДАР

## Кастрычнік

**4** — Рош Ашонэ (Новы год) у габрэяў.
**4** — 25 гадоў (1980), як у аўтамабільнай катастрофе загінуў кіраўнік БССР Пятро Машэраў.
**5** — 175 гадоў з дня сьмерці мастака-партрэтыста Язэпа Аляшкевіча (1777—1830). Напісаў партрэты Лява Сапегі, Мікалая Радзівіла, Чартарыйскіх, Адама Міцкевіча.
**7** — 100 гадоў з дня нараджэньня батаніка, акадэміка Мікалая Смольскага (1905—1976). З 1955 г. быў дырэктарам Цэнтральнага батанічнага саду.
**9** — 75 гадоў з дня нараджэньня Вадзіма Цікавага (1930—2002), хіміка й пэдагога, аўтара падручнікаў для школ і ВНУ.
**14** — Пакроў у праваслаўных, Дзень маці.
**16** — 100 гадоў з дня нараджэньня дзеяча рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі Міхаіла Анішчыка (1905—1973).
**20** — 350 гадоў з часу паўторнага падпісаньня Кейданскай уніі (1655). Пасьля таго як ад вялікага гетмана Януша Радзівіла адкалолася частка войска, ён падпісаў новую дамову, што замацавала саюз паміж ВКЛ і Швэцыяй.
**26** — 125 гадоў з дня нараджэньня ваеннага інжынэра, генэрал-лейтэнанта Дзьмітрыя Карбышава (1880—1945), Героя Савецкага Саюзу. Удзельнічаў у абароне Беларусі ад фашыстаў.
**27** — 575 гадоў з дня сьмерці вялікага князя Вітаўта (1350—1430).
**27** — 50 гадоў з дня нараджэньня гісторыка Яўгена Анішчанкі (1955).
**30** — 100 гадоў з дня нараджэньня знакамітага мастака й скульптара Андрэя Бембеля (1905—1986). У ягонай майстэрні ў 1995 г. адкрыты Музэй сучаснай беларускай скульптуры імя А.Бембеля.
**31** — 100-годзьдзе (па новым стылі) Курлоўскага расстрэлу ў Менску (1905). Ля чыгуначнага вакзалу адбыўся 20-тысячны мітынг менчукоў. Менскі губэрнатар Курлоў загадаў адкрыць агонь. 100 чалавек былі забітыя і каля 300 параненыя.
**31** — 75 гадоў з дня нараджэньня скульптара Лява Гумілеўскага (1930).

# «Полацкі сшытак» аказаўся Астрамечаўскім

При франтальным прачэсваньні замежных архіваў можна будзе адкапаць яшчэ нямала сэнсацый, мяркуе **Адам Мальдзіс**.

Славуты зборнік старой беларускай музыкі «Полацкі сшытак» ніякі ня полацкі. Ён астрамечаўскі ці, прынамсі, берасьцейскі. Знойдзены ў бібліятэцы Ягелёнскага ўнівэрсытэту ў Кракаве ў 1960-х уніяцкі трэбнік быў пазначаны Астрамечавам. Вёскі з такой назвай ёсьць на Полаччыне і Берасьцейшчыне. Выбар зроблены на карысьць полацкай вэрсіі. Але яшчэ ў 1973 г. польскі дасьледчык Ежы Голас абгрунтаваў слушнасьць берасьцейскай вэрсіі.

Чаму ж сталася так, што музыка стала вядома як полацкая? У тыднёвіку «Літаратура і мастацтва» гэты парадокс тлумачыць Адам Мальдзіс. Назву «Полацкі» прапанавалі першыя выканаўцы — музыкі з «Кантабіле». Зроблена гэта было дзеля «брэндавай раскруткі»: маўляў, ніхто ня ведае гэтага Астрамечава. Пра «берасьцейскую» ж вэрсію Е.Голаса ў Беларусі ня чулі.

У гутарцы з карэспандэнтам «НН» сп.Мальдзіс дадаў, што ў савецкія часы не прызнавалі, што ў Беларусі магла быць свая музыка эпохі барока. Як прыклад тагачаснае «зашоранасьці» дасьледчык прыгадаў гісторыю з адшуканым у Ленінградзе зборнікам XVIII ст.: «Гэты зборнік быў укладзены ў Маскве, але там былі запісаны і беларускія, і ўкраінскія творы. Я прынёс у «ЛіМ» публікацыю, але яна ляжала там год, пасьля чаго выйшла ў абрэзаным выглядзе — бяз тэкстаў». Новае жыцьцё «Курантам» даў Арнолд Макмілін, які нядаўна «пераадкрыў» іх. «Ён апублікаваў гэта ў зборніку славістычных дасьледаваньняў як сэнсацыю стагодзьдзя. А я цяпер вымушаны пры публікацыях спасылацца на яго, хоць і знайшоў зборнік раней», — зазначае праф.Мальдзіс.

На думку навукоўца, адкрыцьці такога кшталту яшчэ ня скончыліся, музычныя й літаратурныя скарбы нашае спадчыны будуць знойдзены, «калі занящца франтальным прачэсваньнем замежных архіваў».

**Адам Воршыч**



## «Сьцяна» па-чэску

**Чэскі часопіс «PLAV Revue» ў нумары ад 9 верасьня зьмясьціў пераклад быкаўскай «Сьцяны». З мовы арыгіналу твор пераклаў Адам Гаўлін. «Сьцяна» па-беларуску выйшла ў выдавецтве «Наша Ніва» на грошы, сабраныя чытачамі газэты. Гэта адбылося пасьля таго, як зборнік выкінула з выдавецкага пляну дзяржаўнае выдавецтва.**

**АШ**

# Скарына ў Нямеччыне

«НН» пісала ўжо пра знаходку ў нямецкім Гёрліцы адзінай на тэрыторыі Нямеччыны Бібліі Скарыны (№33, 2 верасьня). Падзея атрымала працяг.

1 верасьня ў Міністэрстве замежных справаў у Бэрліне адбыўся калёквіюм, прысьвечаны сэнсацыйнай знаходцы. У ім узялі ўдзел журналісты, навукоўцы-славісты, прадстаўнікі грамадзкасьці, супрацоўнікі МЗС Нямеччыны, а таксама пасол ФРН у Беларусі Марцін Хэкер, а таксама другі сакратар пасольства Беларусі ў Нямеччыне сп.А.Жбанаў. З уступным словам выступіў кіраўнік моўнага цэнтру МЗС сп.Г.Хіле, а падрабязны даклад аб знаходцы зрабіў вядомы нямецкі славіст, прафэсар Норбэрт Рандаў.

Знаходка скарынаўскай Бібліі адбылася дзякуючы супадзеньню спрыяльных акалічнасьцяў. У 2003 г. у Гёрліцкай гарадзкой бібліятэцы праводзілася выстава кніг у рамках «Году Бібліі». Сярод нешматлікіх, але рэдкіх яе экспанатаў была й Біблія Скарыны. Пра яе паведамілі потым спадару Рандаў на сустрэчы падчас аднае навуковае канфэрэнцыі супэрінтэндант пастар Лобэрз. Вынікам гэтае размовы стала паездка Рандаў у Гёрліц, у Верхнялужыцкую навуковую бібліятэку.

Гёрліцкі экзэмпляр скарынаўскай Бібліі ў 1356 старонак знаходзіцца ў вельмі добрым стане. Ён складаецца зь дзьвюх частак. Першая частка выйшла ў 1519 г. і зьмяшчае Пяцікніжжа. Другая, выдадзеная ў 1518 г., уключае ў сябе кнігу Ісуса, сына Нава, чатыры кнігі Царстваў, Кнігу прамудрасьці і малітву Манасіі. Кожная кніга мае падрабязныя прадмовы і кароткія пасьляслоўі самога Скарыны, а для ўсёй Бібліі дадзена вялікая прадмова.

Рандаў удалося таксама часткова прасачыць і далейшы лёс Бібліі. У 1527 г. першы ўладальнік кнігі Андрэас Банк падарыў яе вядомаму нямецкаму рэфармацыйнаму дзеячу Ёханэсу Хэсу. Пазьней Біблія трапіла ў бібліятэку Гёрліцкай гімназіі.

Пасьля дакладу адбылася зацікаўленая гутарка. Прафэсар Рандаў заявіў, што пры канцы кастрычніка мае намер зрабіць спэцыяльны даклад аб сваёй знаходцы ў Менску.

**Уладзімер Чапега, Бэрлін**

# Слуцкі пояс шагідкі



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Праз многа гадоў беларускія дзеці будуць гуляць у **Джэці**, чытаючы яе вершы замест лічылак. Піша **Аляксандар Фядута**.

Мяркуючы па ўласных малюнках, якімі аформлены ейны першы зборнік «За здаровы лад жыцьця», яна геніяльная, як усе, хто не пераадолеў пяціпрацэнтнага бар'еру выбараў і каму да вывучэньня вершаў Ніла Гілевіча ў сярэдняй школе засталося гады тры.

Джэці — гэта хто? Дзяўчынка ці хлопчык? Дарослы ці дзіця? Мастак ці паэт? А можа, увогуле — яна сьнежны чалавек, ня Джэці, а Еці, што сышоў са скалы, каб даказаць малаверам, што ён — існуе!

Па вялікім рахунку, яе зборнік даказвае, што беларуская паэзія ўсё яшчэ здольна існаваць, што яе не забілі часы позьняга сацрэалізму. Гэта — адкрытая, як пісаў Лермантаў, насьмешка ашуканага сына з транжыра-бацькі:

**Паэт** *(седзячы на ложку сьмяротна хворага Фінынспэктара, задаволена)*:
Ў краіне сьветлай, дзе ты ўміраеш,
Я кнігу маю, а ты ня маеш.
**Фінынспэктар** *(паміраючы ад хваробы, сумна)*:
Ў краіне сьветлай, дзе я ўміраю,
Ты кнігу маеш, а я ня маю.

Вось такая «Размова зь фінынспэктарам пра паэзію» — адначасовая пародыя на Маякоўскага і Багдановіча. На Багдановіча настолькі адкрытую пародыю напісаў хіба што Адам Глёбус, чый верш і трапіў у анталёгію «Верш на Свабоду», сур'ёзна прымусіўшы задумацца пра літаратурную якасьць астатніх вершаў зборніка. Але Глёбус — стары літаратурны хуліган, фігура, якая адбылася. А Джэці? Ёй хто даў права так адкрыта зьдзекавацца з усяго сонму нацыянальных і інтэрнацыянальных сьвятыняў?!

Сьмела ў ногу, таварыш Ленін,
Сьмела ў сэрца, таварыш Сталін,
Бі фашыстаў, таварыш Жукаў,
Пі гарэлку, Міхал Сяргеіч.
Ві вяроўкі, таварыш Павіч,
Фрай таварыш і Тэн таварыш…
…Таварыш Качалаў, Калчак і Чкалаў.
Моцны трактар — таварыш Картэр.
Магутны сокал — таварыш Колас.
Вожык бяз рожак — таварыш Мрожак.

Гэта называецца: «І задушыцеся!» Ня ведаю, колькі гадоў Веры Бурлак, але Джэці яўна належыць да «абкормленага пакаленьня» — пакаленьня, якое дасталі ня толькі савецкія прапагандысцкія міты, але і міты культурныя, накшталт «таварыша Павіча» ды «таварыша Мрожака», і міты нацыянальныя, накшталт «таварыша Коласа». Пры гэтым, мяркуючы па наборы імён, выстаўленым на ўсеагульны агляд у цытаваным вышэй вершы, сама Джэці застаецца больш культурнай, чым яе як крытыкі, так і чытачы: Іпаліт Тэн, што патрапіў у надта вясёлы мартыралёг забітых насьмешкай Джэці «таварышаў», у сёньняшнюю эпоху яўна вырадзіўся б у Макса Фрая, што паэтам (паэткай?) і прызнаецца, але да чаго чалавек, не знаёмы з гісторыяй сусьветнай эстэтычнай думкі, проста не датумкае.

Джэці бліскуча гуляе словамі, як жанчыны-лібэрцінкі ў кнігах маркіза дэ Сада гуляюцца мужчынскімі яечкамі, пяшчотна і па-садысцку перабіраючы іх тонкімі, унізанымі дарагімі пярсьцёнкамі пальчыкамі. Верш «Чаканьне», скажам, — увогуле накшталт бахаўскай «Чаконы», музыкальны і пранізьлівы, і гукі яго падмяняюцца адзін другім на вачах (на вушах?) чытача (слухача?).

Цягнік спазьняецца.
Карэніна нэрвуецца.
Пэронскі Ўронскі
З гімназісткамі цалуецца.
А недзе побач
Парай чмыхаюць вагоны.
Нахабны Ўронскі
Адбывае да Вэроны.
…Вэронскі зьехаў,
Толькі дым
За ім матляецца.

Уронскі-Пэронскі-Вэронскі — як цягнік, што адмовіўся пераяжджаць Ганну Карэніну і застыў на запасным пуці. Ён адмаўляецца выконваць сваю раманную функцыю, зыходзячы са звычайных жыцьцёвых меркаваньняў. На храна яму Ганна, калі ў Вэроне ён стане героем зусім іншага раману, палацавага, зь юнай 14-гадовай Джульетай, дзяўчынкай, кахаць якую герою талстоўскага раману нашмат прыемней, чым гістэрычку Карэніну, што кідаецца пад кожны цягнік! І калі гэтая ўпартая дурніца ўсё-такі перапаўзе на суседні пуць, каб сьлепа выканаць дыктатарскую волю Талстоя, — Уронскі тут прычым?

Але гульня з прозьвішчам, а пазьней, у вершы, прысьвечаным Марату Казею, і гульня з мовамі (беларускай і ангельскай), прыносіць маленькай дзяўчынцы Джэці амаль садысцкую асалоду.

Мабыць, і сэксуальную.

Такога ў беларускай паэзіі не было з часоў Генадзя Бураўкіна, які здолеў узнавіць эмоцыі палавога акту ў пошчаку і прысьвістваньні салаўя. У Бураўкіна, калі вы памятаеце, Цімох трахаў Аўдоцьцю ва ўсе застаўкі, пасьля чаго ўцёк.

Джэці не ўцякае, а наадварот — гераічна застаецца на месцы. Ёй уцякаць няма куды. Свой лёс яна ведае і нават не спрабуе апраўдацца.

МЫ АДНО ЦАЛАВАЛІСЯ,
але ўсім здавалася,
што мы робім нешта горшае —
недазволенае і грэшнае;
МЫ АДНО АБДЫМАЛІСЯ,
але ўсе так абураліся,
быццам мы плявалі
на магілы тых, хто ім мілы;
МЫ АДНО КАХАЛІСЯ,
але нас прысудзілі да расстрэлу.
Напэўна, за тое,
што нас было трое.

Але нават дурніцы Карэнінай Госпад дараваў — бо кахала яна многа. Дык за што ж усе гэтыя старыя пердуны і паўпердуны, цытуючы клясыка сусьветнай літаратуры Гашка Я., праклінаюць новыя пакаленьні? Моладзь — яна ж таксама кахала многа! І бескарысьліва!

Бег, запыхаўся Данка
Са сваёй валянцінкай.
Ды паслала каханка.
Ды паслала крэтынка.
Каб зашыць тую дзюрку,
Каб забыць тую дзеўку,
Даў бы хабар хірургу —
Брат, папраў неспадзеўку!
Толькі подлае сэрца
Ўсё згарэла дашчэнту.
І хірург адкладае
Свае інструмэнты.

Праз тое, што сэрца прыпадабняецца да «валянцінкі», боль ня робіцца меншым. Проста баліць па-іншаму і ў іншых — у новага пакаленьня. Закаханы вырваў сваё сэрца з грудзей для каханай, а яна падумала, што гэта — усяго толькі кавалачак кардону. Гэта — Горкі, прачытаны тымі, чые бацькі стаміліся сьпяваць Акуджаву («…Ведь был солдат бумажный» — памятаеце?).

І гэтае пакаленьне — пакаленьне людзей, якія мысьляць і шмат чыталі. І ня толькі Горкага, але і Дастаеўскага.

У двары на вуліцы Каліноўскага
Для дзяцей паставілі шыбеніцу,
Якую сьпісалі з турмы,
Бо яна састарэла маральна.
І адразу прыбеглі дзеці,
Каб гайдацца на ёй і падцягвацца,
Каб поўзаць па ёй і караскацца
І займацца карыснай гімнастыкай.

Людзі, што чыталі «Братоў Карамазавых», памятаюць пра сонца, замест якога на арбіту вывелі сякеру, і сякера пачала круціцца вакол зямнога шара, і людзі прывыклі да сякеры настолькі, што нават занесьлі час узыходу ды час заходу сякеры ў каляндар.

Трохі жудасная карціна. Накшталт дзяцей, якія гойсаюць па «маральна састарэлай» шыбеніцы. І бацькі пераажываюць,

І крычаць ім: «Хутчэй дахаты!»,
І хвалююцца: што зь іх вырасьце? —
Баючыся вымавіць «шыбенікі».
Ды, здаецца мне, лепей шыбенікі,
Так, я думаю — лепей шыбенікі,
Лепей, лепей дакладна шыбенікі,
Лепей шыбенікі,
Чым каты.

Націск, зразумела, на першым складзе — не пра кошак гаворка, а пра карнікаў.

Фантасмагорыя абсалютна жыцьцёвая. Дзеці, што вырастаюць побач з шыбеніцай, ператвараюцца ў Мураўёвых — ці ў тых, хто вешае, ці ў тых, каго вешаюць. А мяркуючы па падручніках пана Трашчанка, рэкамэндаваных да друку яшчэ ў тыя часы, калі міністар Радзькоў быў рэктарам Радзьковым, беларуская дзяржава аддае перавагу «таленавітым адміністратарам», якія ўмеюць добра намыльваць вяроўку.

Але вернемся да Джэці. Дзяўчынка апалітычная і самадастатковая.

Вы чулі, як сьпяваюць коцікі,
І асабліва — удваіх?
Ім непатрэбныя наркотыкі,
Ім дастаткова іх саміх.
І сэрца поўніцца пяшчотаю
Й красою навакольных зьяў,
І мкнецца за кацінай нотаю,
І разам зь імі кажа:
МЯЎ!

Гэта маніфэст новага паэтычнага пакаленьня, маніфэст, які для Скоблаў наступнага стагодзьдзя будзе мець значэньне куды большае, чым Багдановічаў «Вянок». Гэтае самае «Мяў!» Джэці — маніфэст паэтаў, якія выступаюць за здаровы лад жыцьця — без наркотыкаў і БРСМ. Яе зборнік — як пояс шагідкі, зь якім паэт (паэтка?!) падкраўся (-лася?!) да поўнага збору твораў Ніла Гілевіча, каб узарваць яго разам з сабой.

Дай божа, выйдзе!

**Джэці. За здаровы лад жыцьця.** — Менск: Логвінаў, 2003.

## ЛІСТЫ ЗЬ ЛЕСУ



# Роберт Багарад

**ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ**

У Малым Сітне кепская сувязь. Сотавыя тэлефоны маўчаць, як камсамолец на допыце. Для «хімікаў», які працуе на лесапункце, магчымасьці зьвязацца зь «вялікай зямлёй» дзьве: або тэлефанаваць ад знаёмых, ставячы іх на праслухоўваньне, або ісьці на пошту. Пошта працуе з 9.00 да 14.00 ва ўсе дні, апроч нядзелі, «хімікі» — з 8.00 да 16.00, маючы толькі адну выходную суботу на месяц. У адзіную «сувязную» суботу, быццам на сьвята, іду на пошту са сьпісам на тузін тэлефонаў.

У рамачцы пад шклом — рэклямка: галоўная вартасьць дзяржаўнай сувязі — ейная якасьць. Віцебск ці Менск тут трэба замаўляць адмыслова праз полацкі кампутар і чакаць ад пяці хвілін да адной гадзіны. Але «можаце не хваляваца — вас усё роўна наўрад ці пачуюць».

Замаўляю. Чакаю. Чую з Полацку: «Гаварыце!» Далей — як у фільмах пра рэвалюцыю: «Дзевушка, мне Смольны!.. Кажу, Смольны мне!!! Алё, Смольны!..» Безнадзейна. «Гучней!» — крычыць маладафронтавец зь Менску. Здаецца, мы перакрываем усю адлегласьць голасам. На трэцім званку лінія абрываецца. Паштаркі з палёгкай уздыхаюць: «На сёньня сувязі больш ня будзе».

Выходжу з пошты, цьвёрда перакананы: у такім гушчары апазыцыянэры павывеліся. Аж вось — на ганку стаіць невялічкі дзядок, гадоў сямідзесяці, у шэрым касьцюмчыку, якія ў вёсцы на сьвяты апранаюць, кепачка…

— Колькі гадоў жыву ў вёсцы, а такой чыстай беларускай мовы ня чуў, — кажа дзядок, пачуўшы, як я крычаў. Мая вера ў народ умомант ажывае. — Вы, пэўна, Павал Севярынец? Я пра вас са «Свабоды» даведаўся.

Дзядка завуць Роберт Багарад. З каталікоў. Карані на Магілёўшчыне, ля Дрыбіна. Жыве на хутары Мураўішча, што за колькісот крокаў ад Малога Сітна. «Свабоду» слухае з пачатку яе вяшчаньня — з 5 сакавіка 1953 г.

— У дзень, калі памёр Сталін, — расказвае ён, — настаўнікі неяк даведаліся, што арганізоўваецца радыё з-за мяжы. У бацькі моцны прымач быў — дык сабраліся ў яго, а мяне, яшчэ малады быў, на варце пакінулі. Але ж як хвалю злавілі, паклікалі мяне ў хату ды выпусьцілі сабаку. Вялікі, белы ў нас такі быў, дык той ужо брахаў, як хто набліжаўся. Глушылі магутна, але словы можна было разабраць. Ціхенька настроім — і слухаем. І так увесь час. Ніхто ня здаў.

Дзед Роберт перасоўваецца па лясных сьцежках са спрытам і хуткасьцю Талаша.

— Пяць кілямэтраў — і ўжо імпэрская Расея, — Роберт Багарад махае рукой на ўсход, — а людзі тут… Несьвядомыя. П'юць. Ні да чога добрага не імкнуцца — і каму яны тут патрэбныя?

Цікава, колькі такіх вось партызанскіх слухачоў «Свабоды» ў Беларусі? Напэўна, ёсьць у кожнай вёсачцы. А вёсак у нас больш за 23 тысячы.

І чаму мы адразу запісваем самую беларускамоўную, самую блізкую да зямлі й самую бедную трацыну беларускага народу ў актыў рэжыму? Дзіўна, але апроч Лукашэнкі ды Пазьняка пра гэта ніхто й не гаворыць.

Багарадаў хутар — некалькі абкружаных лесам хатаў. Гародзік, палісаднік, сад. Дзед Роберт разводзіць на палянцы між хвоямі й елкамі яблыні, грушы, сьлівы, парэчкі. Прышчэпвае, абкопвае, чысьціць ад садовых хвароб. Каму дастанецца? А вось, будзе сабе сад сярод лесу.

— Тут, — паказвае Роберт Багарад, — падгнілы плот. І дужа плодзяцца зьмеі. Выпаўзаюць на сьцежку, як ісьці да вёскі, дык я бяру палку і, калі пацэлю, забіваю ды на плот вешаю.

Хата ў дзеда Роберта чыстая, дагледжаная. На галоўным месцы, дзе ў звычайнай сям'і абавязкова стаіць тэлевізар, — вялізны, яшчэ савецкі радыёпрымач (а я спрабаваў знайсьці «Свабоду» аж на трох найноўшых). Вось ён, сапраўдны вузел сувязі на ўсю ваколіцу! Побач — колькі вёдраў брусьніц, на якія тутэйшы лес вельмі багаты. Стол. Зэдлік. Ложак.

— Давайце прынясу вам сьвежых газэт ці кніжак якіх, — аглядаю я пазбаўленае іншых прымет цывілізацыі жытло.

— А, ня трэба, — адмахваецца дзед Робэрт, — вочы ўжо ледзь бачаць, не прачытаю. Я пра ўсё са «Свабоды» даведаюся.

Падумаць толькі: чалавек ужо больш як паўстагодзьдзя сядзіць ля прымача ў глухой беларускай вёсцы і слухае пра пахаваньне Сталіна, Карыбскі крызіс, палёт на Месяц, задушэньне Праскае вясны й перамогі «Салідарнасьці», перабудову, Адраджэньне, здабыцьцё незалежнасьці й яе здачу, рэфэрэндумы ды акцыі апазыцыі… Чалавек прыслухоўваецца да імклівага руху плянэты і бачыць перад сабой адну й тую ж карціну… Асацыятыўны шэраг надзвычай біблейскі: прозьвішча «Багарад», людзі, што не імкнуцца да дабра, сад, зьмеі — і Свабода. Чалавеку вельмі хочацца нарэшце ўбачыць, а ня толькі пачуць вольную, незалежную, адроджаную краіну.

Колькі яшчэ здолее чакаць Роберт Багарад? Дзеля аднаго гэтага ў 2006-м трэба перамагаць.

*Малое Сітна*



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Андрэй Клімаў пакідае сваё жытло на год і тры месяцы. 22 верасьня палітык, асуджаны за арганізацыю акцыі пратэсту на Дзень Волі, выправіўся ў Крупкі на «хімію».**

## СЬЦІСЛА

**Галадоўкі**

Ад 20 верасьня ў Берасьці галадаюць **уладальнікі маршрутных таксовак**: ад іх патрабуюць плаціць у бюджэт ад 20 да 50 млн руб. з кожнай машыны за выкарыстаньне ў камэрцыйных мэтах. Збор усталяваны прэзыдэнцкім указам №140, выдадзеным у красавіку, але падатковая спаганяе і з тых, хто ўвёз аўтамабілі раней. Акцыю распачалі **Любоў Разановіч** і **Любоў Лаўрукові ч**. Радыё «Свабода» паведамляе, што галадаюць шэсьць чалавек. 23 верасьня Вышэйшы гаспадарчы суд прыпыніў санкцыі ў дачыненьні да берасьцейскіх прадпрымальнікаў.

У Ваўкавыску 23 верасьня пачала галадоўку **Натальля Няборская**: ад яе патрабуюць заплаціць 6,5 млн руб. за набыцьцё кватэры, бо ня здолела прад'явіць дэклярацыю пра падаткі за некалькі гадоў. Жанчына працавала ў Запаляр'і, адкуль прыйшоў адказ: дакумэнты, што датычаць працоўнай дзейнасьці, згарэлі. Суд над Няборскай адбыўся ў Ваўкавыску безь яе прысутнасьці.

**Марыніча не выпускаюць**

Камісія менскай калёніі №1 па пытаньнях умоўна-датэрміновага вызваленьня 22 верасьня зноў адмовіла **Міхаілу Марынічу** ў датэрміновым вызваленьні.

**Затрымалі Жаляпава**

Аўтамабіль актывіста ПБНФ **Хрыстафора Жаляпава** затрымалі 20 верасьня на дарозе Віцебск—Наваполацак праз незарэгістраваны бюлетэнь «Навіны БНФ», а таксама ўлёткі апазыцыі. У пратаколе міліцыянты пазначылі, што выданьні ня мелі выходных зьвестак.

**Быкаў скардзіцца ў пракуратуру**

Старшыня Свабоднага прафсаюзу Беларускага **Генадзь Быкаў** 22 верасьня зьвярнуўся да пракурора Партызанскага раёну Менску Ўладзімера Рамаsuccessноўскага. Ён патрабуе распачаць крымінальную справу ў дачыненьні да кіраўніцтва Менскага заводу аўтаматычных ліній, якое незаконна не пускае Быкава на прадпрыемства й перашкаджае дзейнасьці прафсаюзу.

**Позва Лябедзьку**

22 верасьня кіраўнік АГП **Анатоль Лябедзька** атрымаў позву ў баранавіцкі суд як «прыцягваны». Ён зьвязвае гэта з правядзеньнем у Баранавічах раённага сходу дэмакратычных сілаў.

**Штраф за набажэнства**

Адміністратара царквы «Новае жыцьцё» **Васіля Юрэвіча** 23 верасьня Маскоўскі суд Менску аштрафаваў на 160 базавых велічыняў (4 млн 80 тыс.) за парушэньне парадку набажэнства.

**Ператрусы ў Віцебску**

Міліцыя і КДБ 24 верасьня правялі ператрусы ў кватэрах віцебскіх апазыцыянэраў — «зуброўца» **Андрэя Вушэнкі**, «маладафронтаўцаў» **Віктара Шляхціна** і **Алены Стук**, актывіста АГП **Дзяніса Давыдава**, сябра моладзевай суполкі «Сёмая грань» **Сьцяпана Цішуціна**. Хаця нагодай былі вышуковыя дзеяньні пасьля выбуху, у маладых людзей канфіскавалі ўлёткі, газэты, нацыянальную сымболіку, інфармацыйныя носьбіты. Да А.Стук зь ператрусам прыйшлі а палове на другую ночы. У Дз.Давыдава канфіскавалі сярод іншага аркушы з подпісамі за наданьне імя Васіля Быкава адной з вуліц Віцебску.

**Халіп папярэдзілі**

Журналістка **Ірына Халіп** 26 верасьня атрымала афіцыйнае папярэджаньне ад намесьніка генпракурора Мікалая Купрыянава за артыкул «Час выкідаць граблі» ў «Новой газете», апублікаваны ў жніўні. Пракуратура ўбачыла ў артыкуле «прыметы заклікаў да дэстабілізацыі грамадзкага парадку і зьмены канстытуцыйнага ладу неправавымі сродкамі». За паўторнае парушэньне яе могуць пазбавіць волі на тэрмін да пяці гадоў.

**Яшчэ адна расейская школа**

З пачатку навучальнага году ў беларускамоўнай **Вуцеўскай сярэдняй школе** Добрускага раёну першаклясьнікаў пачалі навучаць па-расейску. Дагэтуль у раёне заставаліся толькі дзьве школы зь беларускай мовай навучэньня.

**АШ**

# Польшча збочыла направа

Беларуская палітыка Варшавы стане больш жорсткай. Піша **Зьміцер Дрыгайла.**




AP

На парлямэнцкіх выбарах у Польшчы перамаглі правыя партыі — кансэрватыўная «Права й справядлівасьць» і лібэральная «Грамадзянская плятформа». Яны й сфармуюць парлямэнцкую большасьць. З агульнай колькасьці месцаў у сойме (460+100) «Права й справядлівасьць» узяла 155 мандатаў, лібэралы з «Грамадзянскай плятформы» — 133, партыя «Самаабарона» папуліста Анджэя Лепэра — 56, «Дэмакратычны саюз левых» — 55 левая «Сялянская партыя» — 25, Партыя нямецкай меншасьці — 2.

### Ліга польскіх сем’яў — ў сойме адзіны беларус

Урад мае ўзначаліць экспэрт па эканамічных пытаньнях «ПіС», колішні настаўнік фізыкі, Казімеж Марцінкевіч. Яму 46 гадоў, і ён мае чатырох дзяцей. Лідэр партыі Яраслаў Качынскі адмовіўся ад вакансіі прэм’ера, каб не замінаць свайму брату Леху ў прэзыдэнцкай гонцы. Прайшоў у парлямэнт і адзіны беларус — Яўген Чыквін, кандыдат ад польскай «лявіцы».

Сёлета ў Польшчы ўпершыню склалася так, калі ў адзін год выбіраюць і прэзыдэнта, і абедзьве палаты парлямэнту. Паўнамоцтвы прэзыдэнта доўжацца 5 гадоў, парлямэнту — 4. Пяць год таму ў першым туры перамогу атрымаў кандыдат ад аб’яднаных левых Аляксандар Квасьнеўскі. Цяпер аб’яднаных левых няма. А прэзыдэнта зноў жа, магчыма, выберуць у першым туры. Пасьля выбыцьця з гонкі Уладзімежа Цімашэвіча і перамогі «ПіС» на выбарах мэр Варшавы Лех Качынскі скараціў адрыў ад Дональда Туска, лідэра лібэралаў.

### Пераменлівыя палякі

Палітыкі ў Польшчы, як і ўсюды, любяць сварыцца. Таму ад першых свабодных выбараў 1989 году на палітычнай сцэне за Бугам адбылося шмат падзелаў і перадзелаў. Ні разу не было такога, каб палякі прагаласавалі двойчы запар за адну партыю. Усе яны дыскрэдытуюць сябе пры ўладзе.

Першы парлямэнт пратрываў да 1991 году. У 1990-м на прэзыдэнцкіх выбарах перамог зь вялікай перавагай Лех Валэнса. У 1991-м на парлямэнцкіх выбарах перамаглі партыі пост-«Салідарнасьці». Тагачаснае заканадаўства спрыяла існаваньню дробных партый, таму іх было некалькі дзясяткаў. Гэты парлямэнт пратрываў да 1993 году, калі на датэрміновых выбарах перамагла посткамуністычная левая партыя. У 1995-м Л.Валэнсу на пасадзе прэзыдэнта зьмяніў лідэр посткамуністаў Аляксандар Квасьнеўскі.

Трэба адзначыць, што посткамуністы ў Польшчы перажылі неймаверныя сьветапоглядныя мэтамарфозы, і сёньня яны сталі сацыял-дэмакратамі, якія прызнаюць дэмакратычныя ўстановы, вяршэнства закону, інстытуты вольнага рынку.

У 1997-м на парлямэнцкіх выбарах людзі зноў выбралі правых. Гэта была кааліцыя партый «Выбарчая акцыя «Салідарнасьць» і лібэральная «Унія свабоды». Правыя былі замяшаныя ў стольких скандалах, што на выбарах 2001 году іх папулярнасьць зьменшылася да 5%, і ўжо ў 2000-м Квасьнеўскі зноў трыюмфальна перамог на прэзыдэнцкіх выбарах, а ў 2001-м зноў сфармавалі парлямэнцкую большасьць. Вось тады на руінах перасваранай правіцы паўстала сёньняшняя партыйная канфігурацыя ў выглядзе «Грамадзянскай плятформы» і партыі «Права й справядлівасьць» братоў Качыньскіх.

Качыньскія на пачатку 1990-х былі паплечнікамі Валэнсы, а потым зь ім разышліся. Шмат хто з знаўцаў польскага «палітычнага рынку» параўноўвае Качыньскага з нашым Зянонам Пазьняком за ягоную рэзкасьць меркаваньняў і кансэрватызм. Нарэшце ў 2001 годзе ў Польшчы зьявілася яшчэ больш радыкальная каталіцкая ультранацыяналістычная партыя «Ліга польскіх сем’яў».

### Лешак і Ярак

Кіраўнікі «ПіС» у размове з карэспандэнтам «НН» падкрэсьлівалі, што эканамічная праграма ў іх «цэнтралісцкая», бо яны не прымаюць сыстэмы лінейнага падаходнага падатку. Яны лічаць, што «багатыя павінны плаціць у бюджэт болей», выступаюць за падатковыя льготы й дзяржаўную дапамогу бедным. «Грамадзянская плятформа», наадварот, агітуе за памяншэньне ролі дзяржавы, увядзеньне эўра й адзінай стаўкі падатку 15% для ўсіх.

Падтрымка левых за апошнюю пяцігодку зьнізілася з 40% да 11% па стане на мінулую нядзелю. Што паказальна, столькі ж узяла «Самаабарона», ці «Партыя аматараў Лукашэнкі», як называюць яе польскія палітолягі.

Хто б мог сказаць некалькі дзясяткаў гадоў таму, калі два прывабныя сьветлавалосыя хлапчука Лешак і Ярак ігралі ў дзіцячым кіно накшталт савецкіх «Прыгод Электроніка», што яны будуць кіраваць усёй Польшчай? А між іншым, магчымасьць гэтага ня выключана. Да выбараў яшчэ тыдзень. Дарэчы, публікацыя вынікаў сацыялягічных апытаньняў у Польшчы ўжо забаронена.

Паводле дамоўленасьці між партыямі, калі на прэзыдэнцкіх выбарах пераможа Лех Качыньскі, дык кандыдатура прэм’ера павінна будзе перайсьці да прадстаўніка «Плятформы». Так што Ян Ракіта яшчэ можа патэнцыйна сесьці ў прэм’ерскае крэсла.

### Качыньскі цырымоніцца ня будзе

Як бы ні склалася канфігурацыя ў польскай уладзе, для Беларусі вынік выбараў ужо азначае пахаладаньне адносін з заходнім суседам. Бо і Качыньскія, і Туск займаюць у дачыненьні да Беларусі больш жорсткія пазыцыі, чым Квасьнеўскі. І пазыцыя «крытычнага дыялёгу» ў дачыненьні да нашай краіны, якую праводзіў папярэдні ўрад, калі пры пазьбяганьні кантактаў з вышэйшым кіраўніцтвам Беларусі польскія ўлады падтрымлівалі стасункі з прадстаўнікамі нізавых структураў, можа саступіць месца больш актыўнай падтрымцы палітычнай і культурнай альтэрнатывы.

Польшча імкнецца адыгрываць важную ролю ў эўрапейскай усходняй палітыцы, таму ўвага да Беларусі павялічваецца і тэма Беларусі апошнім часам канчаткова аддзялілася ад расейскай праблематыкі. І лідэры «ПіС», і кіраўнікі «Плятформы» заяўляюць, што цікавасьць да Беларусі знойдзе сваё ўвасабленьне ў адпаведных заходах. Гэта й адкрыцьцё беларускамоўнай радыёстанцыі, і падтрымка Саюзу палякаў на чале з Анжалікай Борыс. Так што на працягу найбліжэйшых месяцаў мы, магчыма, убачым працяг займальнага сэрыялу «Пілаваньне бервяна беларуска-польскага сяброўства», дзе галоўныя ролі выканаюць статысты з БРСМ.

## Агульнапольскі літаратурны квартальнік «Zeszyty Poetyckie» ў Гнезьне

## Беларускі культурна-асьветніцкі цэнтар у Познані

**аб’яўляюць конкурс**

**для беларускіх паэтаў і перакладчыкаў сучаснай беларускай паэзіі**

Конкурс мае на мэце прэзэнтацыю выдатных паэтаў і выяўленьне самых цікавых зьяў, якія адбываюцца цяпер у Беларусі. Створаны арганізатарамі Капітул з прысланага матэрыялу плянуе стварыць дзьвюхмоўную анталёгію. У анталёгію вырашана ўключыць творчасьць такіх паэтаў, як Барадулін, Бураўкін, Караткевіч, Стральцоў, Купрэеў, Разанаў, Мінкін, Галубовіч, Хадановіч, Аркуш, Сыс, Дранько-Майсюк, Адамовіч, Някляеў, Гумянюк, Скобла, Жыбуль, Пацюпа, Акулін, Морт, Юхнавец, Артымовіч, Гапеева. Рашэньнем Капітулу сьпіс можа яшчэ папаўняцца. Усіх зацікаўленых просім даслаць нізку ад дзесяці да пятнаццаці выбраных перакладчыкам або самім аўтарам вершаў у тэрмін да канца лістапада на адрас рэдакцыі:

**«Zeszyty Poetyckie»,**
**ul. 22 Lipca 77,**
**62-200 Gniezno**

Падрабязнасьці па электроннай пошце: **vital.voranau@gmail.com**
альбо па тэлефоне: **+48-600-460-130 (Віталь Воранаў)**

## СЬЦІСЛА

### Першая чарнаскурая губэрнатарка ў гісторыі

27-м генэрал-губэрнатарам Канады стала чарнаскурая ўраджэнка Гаіці, экс-журналістка Мішэль Жан. Інаўгурацыя прайшла ў прысутнасьці ейнага мужа і шасьцігадовай прыёмнай дачкі. 48-гадовая М.Жан стала адной з самых маладых генэрал-губэрнатараў у гісторыі краіны й трэцяй жанчынай на гэтай пасадзе. Генэрал-губэрнатар — пасада збольшага намінальная — ёсьць прадстаўніком у Атаве брытанскай каралевы і прызначаецца ёй з рэкамэндацыі прэм’ер-міністра Канады.

### Бясконцы сьпіс Караджыча

У Босьніі праведзена эксгумацыя целаў яшчэ ста ахвяраў масавай расправы над мусульманамі ў Срэбраніцы ў 1995 г. Усяго былі знойдзены целы васьмі тысячаў ахвяраў сэрбскага генацыду. Галоўныя вінаватыя ў гэтай трагедыі Радаван Караджыч і генэрал Радка Младзіч расшукваюцца Гаагскім трыбуналам.

### Нурсултан верны традыцыям

Кіраўнік Казахстану Нурсултан Назарбаеў, што балятуецца на чарговы прэзыдэнцкі тэрмін, адмовіўся ад удзелу ў тэледэбатах. Прэс-сакратар ягонага выбарчага штабу Арман Шураеў мяркуе, што тэледэбаты паспрыяюць рэкляме канкурэнтаў Назарбаева. Лідэры СНД любяць даказваць сваю перавагу над апанэнтамі завочна.

### Вайны ня будзе

Якая-кольвечы вайсковая акцыя супраць Ірану не абмяркоўваецца, — заявіў у інтэрвію ВВС кіраўнік брытанскага МЗС Джэк Стро. Гэтак ён пракамэнтаваў словы Джорджа Буша, які некалькі дзён таму заявіў пра магчымасьць ваеннага ціску на Іран. Стро спадзяецца, што крызіс, зьвязаны з іранскай ядзернай праграмай, удасца вырашыць дыпламатычным чынам.

### Эўрапейскі дзень Волі

З наступнага году на кантынэнце будзе сьвяткавацца Дзень волі і салідарнасьці. Адначасова ён будзе 31 жніўня, ва ўгодкі польскай «Салідарнасьці». Адпаведнае рашэньне прыняў у сераду, 28 верасьня, Эўрапарлямэнт.

**АГ; echo.msk.ru**

# «Будзе барацьба не на жыцьцё,

Анатоль Лябедзька, Алесь Мілінкевіч, якія маюць найбольшыя шанцы ўзначаліць апазыцыю на прэзыдэнцкіх выбарах, адказалі на пытаньні «НН». Гутаркі адбываліся паасобку.

**«НН»: Якія ў Вас ураженьні ад падрыхтоўкі да Кангрэсу?**

**Анатоль Лябедзька:** Кангрэс — такая падзея, што безумоўна цягнецца шлейф розных эмоцыяў, і пазытыўных і нэгатыўных. Пры ўсіх хібах і крытыцы ёсьць тое станоўчае, што пераважвае: да гэтага працэсу кожная асоба, структура маглі гаварыць, што яны самыя моцныя, самыя лепшыя, але падрыхтоўка да Кангрэсу паставіла нас па ранжыры. Сёньня мы больш рэалістычна ўяўляем сабе патэнцыял розных структур, людзей і ідэй. Ідзе рэальны працэс, хоць і не зусім такі, як нам бачылася на пачатку. Мы выступалі за тое, каб уцягнуць у працэс як мага большае кола зацікаўленых. Як сьведчыць статыстыка, 17% людзей сказалі, што яны гатовыя былі б прыняць удзел у сходах, якія мы праводзілі. Гэта велізарны патэнцыял, які мы, на жаль, ня выкарысталі.

**Алесь Мілінкевіч:** Напружаньне расьце. Гэта нармальная палітычная барацьба — галоўнае, каб усё было чэсна і празрыста. Думаю, Кангрэс пройдзе выдатна.

**«НН»: Калі Вас абяруць адзіным кандыдатам, якая будзе агульная стратэгія Вашай кампаніі?**

**АЛ:** Мне лягчэй, чым іншым, бо я ня буду весьці кампанію з нуля. Ёсьць інтэлектуальны прадукт, і яго можна, як кажуць, патрымаць у руках — гэта ня лёзунгі, а тое, што прайшло міжнародную экспэртызу — пакет законапраектаў, у якім распавядаецца, што трэба рабіць для Беларусі. Гэта пазытыўны мэсыдж. Але, улічваючы, што наша праца кааліцыйная, праграму трэба ўзгадняць зь іншымі суб'ектамі, у чымсьці ісьці на кампраміс. Ёсьць і каманда людзей, якія засьведчылі сваю прафэсійнасьць. Я думаю, гэта трывалы падмурак, каб праводзіць моцную кампанію, якая можа прыйсьці ў кожны дом, у кожную сям'ю.

**АМ:** Я за тое, каб выбарчы штаб адзінага кандыдата меў абсалютна дыктатарскія паўнамоцтвы. Дэмакратычў штабах нават у дэмакратычных краінах няма. Павінна быць вэртыкальная структура з выканаўчай дысцыплінай. Я б хацеў, каб у штабе працавалі ўсе кіраўнікі партыяў, прэтэндэнты, каб мы ўсе разам узялі на сябе поўную адказнасьць за кампанію. Я супраць таго, каб паўстала некалькі камандных пастоў. Такая магчымасьць разглядаецца, але я супраць такога.

**«НН»: Што зьяўляецца Вашым фірмовым адрозьненьнем ад іншых кандыдатаў, ад Лукашэнкі?**

**АЛ:** Мяне, Мілінкевіча, Шушкевіча, Калякіна многае аб'ядноўвае. Мы ставім задачу ня столькі зьмяніць Лукашэнку, колькі тую паразытычную сыстэму, якую ён стварыў. У нас з Лукашэнкам абсалютна рознае ўяўленьне пра тое, якой павінна быць Беларусь. У будучай кампаніі трэба будзе ствараць у галовах людзей канфлікт двух вобразаў Беларусі.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Размова цяпер не пра тое, хто будзе рулiць, а пра тое, каб вярнуць краіну ў нармальнае маральнае становішча.

**АМ:** Ад Лукашэнкі ў лепшы бок адрозьніваецца велізарная колькасьць людзей, якія могуць паруліць лепш, чым ён. Але размова цяпер не пра тое, хто будзе рулiць, а пра тое, каб вярнуць краіну ў нармальнае маральнае становішча, пазбавіцца хлусьні і надаць ёй пэрспэктывы.

**«НН»: Які найбольш моцны крок зрабіла кампанія і якую галоўную памылку?**

**АЛ:** Самы моцны крок — гэта стратэгія аб'яднаньня. У нас ёсьць некалькі сотняў маленькіх крынічак. Самі па сабе яны нічога не ўяўляюць, але калі мы аб'ядваем іх у адно рэчышча, тады гэта будзе сіла. А не падабаецца мне тое, што ў вачах значнай часткі актывістаў няма агеньчыку перамогі. Праблема апазыцыі палягае ў сфэры псыхалёгіі. Калі ўсе будуць верыць у перамогу, тады яна і прыйдзе.

**АМ:** Самы моцны крок — гэта тое, што апазыцыя ўсё-такі аб'ядналася. Амаль усе палітычныя сілы, якія ў нас ёсьць, ідуць у адзіным блёку. Дрэнна тое, што апазыцыя не стварыла каманды ўжо на этапе парлямэнцкіх выбараў. Тады змагаліся партыі з партыямі, на адной вуліцы за адну ідэалёгію агітавалі, на іншай — за іншую. Трэба было тады ствараць адзіную каманду.

**«НН»: Ці Вы ўжо ведаеце людзей, якія маглі б сфармаваць новы ўрад?**

**АЛ:** Безумоўна, ёсьць каманда. Ёсьць нават некалькі складаў, як у «Лівэрпулю» ці «Манчэстэр Юнайтэд». Лукашэнкаў падыход такі: у Беларусі няма нікога, акрамя яго. Насамрэч у краіне велізарная колькасьць людзей, якія здольныя працаваць на самых розных пасадах.

**АМ:** Цяпер не пасады трэба дзяліць, трэба думаць, як перамагчы. Цяпер самае галоўнае не стратэгія рэформаў пасьля прыходу да ўлады, а стратэгія барацьбы зараз. Бо гэта будзе барацьба не на жыцьцё, а на сьмерць.

**«НН»: Ці будзеце Вы выступаць за канстытуцыйную рэформу? Ці захаваецца інстытут прэзыдэнцтва і ў якім выглядзе?**

**АЛ:** Вядома, я буду выступаць за рэформу. Дэкрэт нумар адзін: стварэньне ўмоваў, якія не дадуць магчымасьці прыйсьці да ўлады людзям, хворым на ўладу. Гэта азначае канстытуцыйныя рэформы. Адзінае, што новы варыянт канстытуцыі не павінен быць напісаны ў канцыляры прэзыдэнта. Перад гэтым павінна быць рэальная сапраўдная дыскусія.

**АМ:** Калі б я вырашаў адзін, то я спачатку за прэзыдэнцка-парлямэнцкую рэспубліку, а потым за пераход да парлямэнцка-прэзыдэнцкай. Пакуль у нас няма грамадзянскай супольнасьці, ліквідаваць прэзыдэнцкую пасаду ня варта — гэта замарудзіць рэформы.

**«НН»: Ці будзеце Вы змагацца за адмену пакараньня сьмерцю?**

**АЛ:** Гэта адна з задач, якія трэба закладаць у парадак дыскусіі, да гэтага трэба ісьці, калі мы лічым сябе часткай эўрапейскай цывілізацыі.

**АМ:** Так.

**«НН»:** Ці зробіце Вы нацыянальную сымболіку дзяржаўнай, і які статус пасьля гэтага будзе мець цяперашняя сымболіка?

**АЛ:** Што да сёньняшняй сым-

**Алесь Мілінкевіч** нар. 25 ліпеня 1947 у Горадні. Кандыдат фізыка-матэматычных навук. Стажаваўся ва ўнівэрсытэтах Францыі і ЗША. У 1980—1984 г. загадваў катэдрай Сэтыфскага ўнівэрсытэту (Альжыр), быў дацэнтам ГарДзУ (1978—1980, 1984—1990). У 1990—1994 — намесьнік старшыні Гарадзенскага гарвыканкаму. Кіраваў Беларускай асацыяцыяй рэсурсавых цэнтраў. Краязнаўца. Вёў гістарычную праграму на гарадзенскай тэлевізіі. Знайшоў пахаваньне апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага, рэстаўраваў самы старажытны ў Эўропе гарадзенскі вежавы гадзіньнік. Мае двух сыноў.

# Шапка жонкі Манамаха

Жонкі кандыдатаў на ролю «адзінага» Сьвятлана Лябедзька і Іна Кулей пра сябе і мужоў.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Сьвятлана Лябедзька з сынам Арцёмам.**

**«НН»: Калі Вы пачалі цікавіцца палітычнымі поглядамі мужа?**

**Сьвятлана Лябедзька:** Цікаўлюся з таго моманту, калі ён у пачатку 1990-х пачаў парлямэнцкую кампанію. Але нельга казаць, што палітыка ўвайшла ў яго жыцьцё. Яна ўвайшла ў наша жыцьцё.

**Іна Кулей:** Зь 1997-га. Тады ўжо адчувалася, што яго цікавасьць да палітыкі перавышае ягоны статус грамадзкага дзеяча, але ён цалкам знаходзіцца ў рэчышчы той пасады, якую ён займаў да таго — намесьніка старшыні гарадзенскага гарвыканкаму.

## «Мы ў сям'і нічога не забараняем»

**«НН»: Калі б гэта залежала толькі ад Вас, дык ці забаранілі б Вы мужу займацца палітыкай?**

**СЛ:** Нават калі б залежала толькі ад мяне, дык не забараняла б. У нашай сям'і мы адно аднаму нічога не забараняем. Але я б хацела, каб Анатоль гэтым не займаўся.

**ІК:** Ніколі. Каб быць грамадзкай асобай, якая адчувае сваю каштоўнасьць, ён павінен займацца тым, чаго прагне сэрца. Калі ў Алеся баліць душа за лёс краіны — яму трэба спрыяць, а не забараняць.

**«НН»: Ці падзяляеце Вы палітычныя погляды свайго мужа?**

**СЛ:** Гавораць жа: «Мужык і жонка — найлепшая суполка». Таму падзяляю. Калі б гэтага не было, мы б у некаторых момантах напросту не сышліся б. Вядома, часам мы спрачаемся на палітычныя тэмы нават дома. Таму мяркую, што некаторыя яго пазыцыі можна было б зьмякчыць.

**ІК:** Асабістая ўпэўненасьць майго мужа, яго грунтоўнасьць і спакой пераконваюць усіх вакол яго. Алесь шмат што зьмяніў у маім уласным сьветапоглядзе.

## «Прачынаецца ён даволі хутка»

**«НН»: Ці пасьпявае муж дапамагаць Вам у хатняй працы? Ці ёсьць у яго сталыя абавязкі дома?**

**СЛ:** Калі ў яго бывае вольны час, ён забясьпечвае закупкі прадуктаў на рынку. Бывае, выканае й якую іншую хатнюю працу. Мы маем дарослага сына, дык большасьць хатняй працы я стараюся «сьпіхнуць» на яго *(усьміхаецца)*.

**ІК:** Алесь штораніцы гатуе сьняданак. Прачынаецца ён даволі рана й хутка, а я ў дзень уваходжу вельмі павольна. Зробіць каву, згатуе ежу, памые посуд. А астатняе я з падзякаю цэлы дзень раблю сама. Ён таксама ходзіць і па прадукты, бо, па-першае, забараняе мне насіць цяжкія торбы, а па-другое, лічыць, што ў доме заўжды павінен быць нейкі запас ежы.

**«НН»: Чым Вы гатовы ахвяраваць дзеля перамогі Вашага мужа на прэзыдэнцкіх выбарах?**

**СЛ:** Хіба што ўсім, чым можна ахвяраваць. Не жыцьцём. Упэўнена, што самае галоўнае ў жыцьці — наяўнасьць здароўя, а ўсё астатняе ў нашых руках. Так што не гатова ахвяраваць здароўем. Нічым здароўем. А так, напэўна, няма нічога, што я

# а на сьмерць»

болікі, то ў мяне яна акрамя ўсьмешкі нічога не выклікае. Гэтая сымболіка ня мае нічога да Беларусі, яна мае адносіны толькі да Аляксандра Лукашэнкі. Што датычыць нацыянальнай сымболікі, то я прыхільнік гэтых сымбаляў. Яны былі прынятыя ў Вярхоўным савеце, які на 3/4 складалі прадстаўнікі намэнклятуры, — і яны галасавалі сьвядома, бо ім проста расказалі гісторыю сымболікі. Нам трэба адкрыць дзьверы ў гісторыю, і ўсё стане на свае месцы — ня трэба будзе нікога прымушаць.

**АМ:** Цяперашняя сымболіка будзе мець статус часовай сымболікі. Безумоўна, старажытная павінна быць вернутая. Мы так распрапагандуем гэтую гістарычную сымболіку, што народ сам папросіць аб гэтым.

**«НН»: Які статус будзе мець беларуская мова, які — расейская?**

**АЛ:** Нам трэба вярнуцца на пяць стагодзьдзяў назад, калі маладыя людзі, якія заканчвалі манастырскую школу, ведалі пяць моваў. Хай выпускнікі беларускіх ВУЗаў ведаюць хаця б ня пяць моваў, а тры на добрым узроўні — беларускую, расейскую ды ангельскую. Разам з тым, я супраць таго, каб людзей, якім пяцьдзясят гадоў, ламаць праз калена і прымушаць іх размаўляць па-беларуску. Але што датычыць тых дзетак, якія ідуць у садкі, то безумоўна, там ня будзе ніякага гвалту і прымусу — яны будуць з задавальненьнем вучыцца беларускай мове, так і было на пачатку 1990-х. Безумоўна, для беларускай мовы мы павінны будзем рабіць пэўныя прэфэрэнцыі. Адразу разуменьня, што «так трэба», ня прыйдзе. Трэба выкарыстоўваць іншыя, эканамічныя рычагі стымуляваньня, тым жа настаўнікам дапамагаць.

**АМ:** Адзінай дзяржаўнай мовай павінна быць беларуская. Але чалавек з расейскай мовай не павінен адчуваць сябе горш, чым чалавек, які валодае беларускай.

**«НН»: У якую краіну Вы зробіце першы візыт у якасьці прэзыдэнта?**

**АЛ:** Свой першы візыт я зраблю ў Гародню, Берасьце, Віцебск і іншыя рэгіёны Беларусі. Што датычыць замежных візытаў — усё будзе залежаць ад сытуацыі. Мы будзем ведаць, хто нашыя сябры, хто нам працягнуў руку ў складаны час.

**АМ:** Гэта вырашым бліжэй да выбараў. А пра блізкую будучыню скажу. Калі мяне абяруць на Кангрэсе, то першы візыт як кандыдата будзе ў Прагу на запрашэньне Вацлава Гаўла. Што да Масквы й Вашынгтона, дык надзвычай важна будзе захаваць адносіны з Расеяй і Штатамі аднолькава добрымі.

**«НН»: Якую ролю будзе адыгрываць першая лэдзі?**

**АЛ:** Адна з найвялікшых памылак Лукашэнкі, што ён саромеецца сваёй жонкі. Першая лэдзі — гэта кавалачак традыцыяў Беларусі. Сям'я — гэта вялікая каштоўнасьць. Ня думаю, што першая лэдзі павінна выбіваць для кагосьці квоты, але яна павінна прысутнічаць. Яна павінна быць, такая, якая яна ёсьць, з сваім патэнцыялам.

**АМ:** Яна будзе выдатнай хатняй гаспадыняй, будзе прымаць сяброў. Але паступова трэба прывучаць грамадзтва да таго, што жонка лідэра — гэта таксама грамадзкі дзеяч.

**«НН»: Калі Вас абяруць адзіным кандыдатам, Вы пераможаце?**

**АЛ:** Я магу абяцаць тым людзям, якія падтрымаюць мяне, толькі адно: я зраблю, каб яны ўсе былі наперадзе, а я буду на крок перад імі. Гэта азначае, што я зрабіў свой выбар, і я пайду — не да канца, як кажуць, — я пайду да перамогі. Я думаю, шанец ёсьць. Лёгка было б пайсьці ў такую кампанію, відаць, у 2011 годзе, калі гэта будзе ўжо іншая краіна. Будзе велізарнейшая канкурэнцыя, але трэба будзе ісьці ўжо не па ўхабах, гэта будзе бэтонная дарога. Мне многія людзі, якім я давяраю, кажуць: а навошта табе гэта трэба? Мо трэба было б паназіраць за ўсім, што адбываецца, збоку? Калі частка людзей ня верыць у перамогу, разглядае гэта як звычайны эканамічны праект, навошта табе ісьці гарэць у гэтым пекле? І яны маюць рацыю. Але разам з тым ёсьць людзі, якія мне кажуць: ёсьць мяжа, рэшткі веры ў тое, што нешта зьменіцца. Ня зьменіцца — мы адсюль зьедзем. Зьедуць прыстойныя людзі, якія маглі б рабіць гэтую краіну сапраўднай Беларусьсю. Мне ня хочацца гэтага. Таму я сьвядома іду і настроены на перамогу. Я не разьлічваю на нейкую трэцюю сілу, я разьлічваю на першых. А першыя — тыя людзі, якія гэтыя дзесяць-пятнаццаць гадоў цягнуць на сябе ношу барацьбы за Беларусь.

**АМ:** Так.

**Гутарыў**
**Алесь Кудрыцкі**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Мы ставім задачу ня столькі зьмяніць Лукашэнку, колькі тую паразытычную сыстэму, якую ён стварыў.

**Анатоль Лябедзька.**
**Нарадзіўся 27 ліпеня 1961 у в. Трылес (Стаўпеччына). Скончыў Менскі пэдынстытут (1985), спэцыяльнасьць «гісторыя і француская мова», юрфак БДУ (1993). Рабіў мэханізатарам на Стаўпеччыне (1979—1980), намесьнікам дырэктара Ашмянскай школы-інтэрнату (1987—1990). Дэпутат Вярхоўнага савету 12-га і 13-га скліканьняў. Прадстаўнік прэзыдэнта ў парлямэнце (1994). З 2000 — старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі, адзін з ініцыятараў імпічмэнту Лукашэнкі (1996). Журналісцкая прэмія імя А.Майсені (1997), дыплём БАЖ «За ўсталяваньне свабоды прэсы ў Беларусі» (1999).**
**Мае сына.**


СЯРГЕЙ ГРЫЦ

**На Кангрэс як на вайну. На фота: Алесь Мілінкевіч з жонкаю.**

не магла б аддаць.

**ІК:** Ведаеце… Нават і жыцьцём, як гэта ні патасна прагучыць. Мы добра ўсьведамляем, які шлях прыняў Алесь, якія абавязкі на сябе ўсклаў. Так што мяжы тут няма… Я разумею, што ў любы момант з намі можа здарыцца ўсё, што хочаш.

**«НН»: Што для Вас статус першай лэдзі краіны? Ці гатовыя Вы сёньня да гэтага?**

**СЛ:** Для Беларусі так званы «пратакол» — гэта наагул цьмяная рэч. Я з «пратаколам» незнаёмая і знаёміцца не зьбіраюся. Бо гэта пакуль з вобласьці далёкай пэрспэктывы. Хоць жонка ёсьць адлюстраваньнем мужа. Першая лэдзі, вядома, у пэўнай ступені таксама афіцыйная асоба, бо пра прэзыдэнта робяць высновы ў тым ліку й па тым, кім зьяўляецца яго жонка. Першая лэдзі не павінна ўмешвацца ў дзяржаўныя справы, а быць крыху ў цені, але дапамагаць мужу мусіць.

**ІК:** Лэдзі — першая ці якая іншая — павінна мець пяшчоту, дабрыню, шчырасьць і павагу да людзей. А іншы статус ня мае значэньня. Кожны з нас чытаў, як трэба класьці відэлец, шанаваць і вітаць гасьцей. Кожная жанчына — гэта гаспадыня свайго дому, і яна ведае, як трэба прымаць людзей, каб ніхто не адчуў зьнявагі. Нават калі гэты дом — цэлая краіна.

**Гутарыў Зьміцер Дрыгайла**


СЯРГЕЙ ГРЫЦ

**Іна Кулей**

## Нестандартнае рашэньне




**Дастойную зьмену кіраўнічых кадраў рыхтуе Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі. Сучасных рэспамольцаў адрозьнівае самастойнасьць мысьленьня і нестандартнасьць падыходаў. Кіраўніком арганізацыі на XXXIX зьезьдзе арганізацыі быў пераабраны малады інтэлектуал М.Орда (фота).**

# ТБМ пра эўрарадыё: не навязвайце

**Пашырэньне беларускай мовы ў міжнародным этэры спрыяе дэмакратызацыі Беларусі**

**Заява Сакратарыяту ТБМ**

Сёлета Эўразьвяз урэшце зьвярнуў увагу на праблему ўціску недзяржаўных СМІ ў Беларусі й абвясьціў шэраг тэндэраў па арганізацыі дадатковага вяшчаньня на Беларусь. У ліпені было паведамлена аб намерах Эўракамісіі падтрымаць вяшчаньне на Беларусь радыёстанцыі «Нямецкая хваля», але толькі на расейскай мове. Беспрэцэдэнтнае рашэньне аб вяшчаньні на мове суседняй дзяржавы выклікала абурэньне тысяч грамадзян Беларусі, дзясяткаў недзяржаўных арганізацый, беларускай дыяспары.

Грамадзкае аб’яднаньне «Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны» выказвае рашучую нязгоду з намерамі весьці вяшчаньне на беларускую аўдыторыю па-расейску. Пачынаючы з XIX ст., палітыку русіфікацыі на тэрыторыі нашай краіны пасьлядоўна праводзілі ўлады Расейскай імпэрыі і камуністычныя ўлады СССР. Цяпер эстафэту па русіфікацыі беларусаў прымае на сябе дэмакратычная Эўропа...

ТБМ адзначае, што **беларуская мова**, на якой быў напісаны (...) Статут ВКЛ, доўгі час была мовай міжнародных зносін. Згодна з Канстытуцыяй 1994 г., менавіта беларуская мова была прызнана адзінай дзяржаўнай у нашай краіне. (...) Таму беларуская мова **была і ёсьць мовай дэмакратыі ў нашай краіне**. Жаданьне Эўракамісіі аддаць перавагу расейскай мове будзе ўспрымацца беларускім народам як адступленьне ад дэмакратычных нормаў, гульню па чужых правілах і сапраўднай дэмакратыі ў Беларусь не прынясе.

(Скарочана.)

**Прынята на пасяджэньні Сакратарыяту ГА «ТБМ імя Ф.Скарыны»
21 верасьня 2005 г.**

## Шляхі рэфармаваньня ААН

**Кожны народ мае права на самавызначэньне. Ці думае гэтак А.Лукашэнка? Пачуўшы ягоную прамову ў ААН («Мая краіна — СССР»), я сумняваюся.**

Няўжо нацыянальная сьвядомасьць — гэта кепска?

Не існуе і палярнасьці ў сьвеце, як заяўляе прэзыдэнт. Заўжды было і будзе лідэрства. Толькі калі раней усе пытаньні вырашаліся двума лідэрамі, цяпер — адным. Так, лідэры не пазбаўлены памылак і канечнасьці свайго статусу. Тэзіс пра тое, што статус ААН неабходна зьмяніць у адпаведнасьці з «новым» сьветаўяўленьнем, слушны. Бо «новае» сьветаўяўленьне грунтуецца на тым, што праўда не на баку мацнейшага, а ў аб’ектыўным бачаньні прагрэсу, і ААН як найлепей дзеля гэтага пасуе. Рэформа непазьбежна прывядзе да пачатку новай эпохі ў разьвіцьці чалавецтва, вынікамі чаго будуць натуральная рэструктурызацыя сьвету і якасныя зьмены ва ўсіх краінах.

Калі ж сьвет прагне рэфармаваньня ААН, то яна мусіць стаць наднацыянальным судзьдзём у спрэчках паміж краінамі і паміж супольнасьцямі ў краінах.

**Ігар Хаменка, Менск**

## Na vybary — kamandaj

Haloŭnaje — nie adziny kandydat, a adzinaja kamanda.

Kali ŭvieś praces abrańnia «adzinaha» kandydata ad demakratyčnych sił skončycca, usie inšyja kandydaty prajhrajuć. Bo niahledziačy na zaklik ab padtrymcy ŭsimi taho adzinaha abranaha, kamandy inšych nia buduć hetak ža zmahacca za inšych, jak by jany zmahalisia za svajho lidera.

Tamu ja pierakanany, što treba vybirać nie adzinaha kandydata, a adzinuju kamandu — ludziej, hatovych supracoŭničać, kab źmianić kiraŭnictva krainy i dabicca źmien da lepšaha. U takoj kamandzie budzie i kandydat u prezydenty, i ŭsie inšyja buduć mieć nia mienš adkaznyja pasady, pačynajučy ad premjera, najvažniejšych ministraŭ, kiraŭnika parlamentu. Takim čynam, elektarat budzie znajomicca z celaj kamandaj, i asobnyja štaby buduć pracavać na celuju kamandu, i ŭ vypadku, kali kandydat u prezydenty budzie źniaty, inšaja znajomaja asoba zojmie jaho miesca.

**Viačasłaŭ Ždan, Nju-Jork, ZŠA**

* * *

**Што здарылася з Баранавіцкім катэхетычным каледжам? Яго зачынілі? І чаму?**

**Антон Францішак Брыль**

Фармальна каледж зачыніўся, бо ня меў дазволу ад уладаў. Фактычна закрыцьцё каледжу супала з пачаткам кампаніі супраць Саюзу палякаў. Паводле словаў аднаго з ксяндзоў, пытаньне каледжу можна вырашыць толькі пасьля ўмяшаньня кардынала Сьвёнтка. Ксяндзы маюць надзею, што ўрэшце дазвол усё ж атрымаюць, бо Баранавіцкі каледж — адзіная ўстанова ў Беларусі, што рыхтавала выкладчыкаў рэлігіі.

## Беларусы ў Camp Rising Sun

**Упершыню за 75 год існаваньня міжнароднага летніку «Camp Rising Sun», заснаванага ў ЗША, на зьезьдзе былых удзельнікаў прысутнічала дэлегацыя Беларусі.**

У аснове «летніку ўзыходзячага сонца» ляжаць ідэі роўнасьці ды братэрства. Лягер узьнік дзякуючы намаганьням аднаго эксцэнтрычнага бізнэсмэна. Ягоная мэта — выхаваньне маладых лідэраў, здольных успрымаць новыя ідэі і ў будучыні актыўна дзейнічаць на карысьць чалавецтва. Апошнім часам адбор кандыдатаў адбываецца дзякуючы Інтэрнэту, на сайт якога прэтэндэнты дасылаюць заявы. Таму партрэт клясычнага летнікаўца намаляваць цяжка. Гэта можа быць вірлавокая спэцыялістка па ядзернай энэргетыцы зь берагоў Нілу, панк-рок-музыкант і абаронца людзей зь нестандартнай сэксуальнай арыентацыяй зь Фінляндыі або аматар бэйсболу ды опэрных сьпеваў з Бронксу. «Усе тут крыху вар’яты, нармалёвых людзей у летнік не выбіраюць», — адзначыла праціўніца аэробікі ды прыхільніца піўнога нацыяналізму з польскага Жыўца.

Удзельнікі летніку бавяць два месяцы ў намётах у лесе пад Нью-Ёркам ці ў дамках у Даніі ды практычна спасьцігаюць ідэі дэмакратыі і роўнасьці. Частка летнікаўцаў цалкам аплачвае незвычайныя вакацыі, большасьць марнуе грошы спонсараў. Забаронена выкарыстаньне рэчаў, што дэманструюць сацыяльную няроўнасьць (прайгравальнікаў кампакт-дыскаў, мабільных тэлефонаў).

Важатыя і дзеці клічуць адзін аднаго па імені ды разам працуюць на карысьць супольнасьці: сякуць дровы ды выкідаюць брудную паперу з прыбіральняў. Паралельна абмяркоўваюцца праблемы экалёгіі ды парушэньні правоў чалавека. Не абыходзіцца бязь песень ля вогнішча, танцаў, пэрформансаў, жартаў ды гульняў.

Зьезд удзельнікаў летніку праходзіў гэтым разам на турыстычнай базе Яхранка пад Варшавай. Наймаладзейшай удзельніцы было год шэсьць, найстарэйшаму ўдзельніку — шэсьцьдзесят. Цешыла тое, што дэлегацыя зь Беларусі ў складзе пяці чалавек была ў пяць разоў большай, чымсьці з Ісьляндыі. Упершыню ў гісторыі летніку пераважылі ўдзельніцы жаночага полу.

Тры дні прадстаўнікі розных народаў ставілі базу на вушы. Беларуская дэлегацыя бліснула сьпевам «Купалінкі» ля вогнішча. Большасьць славянскіх народаў успрыняла 75 адсоткаў інфармацыі, астатніх заваражыў матыў ды выкананьне на некалькі галасоў.

Апрача шуканьня спонсараў, абмяркоўваўся новы праект стварэньня летніку ў Кітаі, які з прычыны нелюбові кітайцаў да салярнае сымболікі ня будзе насіць назову «летніку ўзыходзячага сонца». Магчыма, наступныя беларускія летнікаўцы будуць вяртацца дамоў не зь яблыкамі зь Нью-Ёрку, а з рысам з Пэкіну.

**Болачка, Менск**

# Ня ўсё ў жыцьці апошні раз

Найтаньнейшая падпіска: сьпіс шапікаў

Найтаньнейшая падпіска на «НН» — на шапікі «Менгарсаюздруку». Каштуе такая падпіска на месяц усяго 3440 рублёў. Забіраць сваю газэту можна ў любой зручнай для вас гандлёвай кропцы «Белсаюздруку» ўжо ў чацьвер па абедзе. Друкуем адрасы пунктаў, дзе можна аформіць падпіску «Да запатрабаваньня».

**Участак падпіскі «Белсаюздруку»:**

| | |
|---|---|
| вул.Валадарскага, 16, пак.200 | 227–88–41 |

**Пункты прыёму падпіскі:**

| | |
|---|---|
| вул.Жукоўскага, 5, корп.1 | 224–32–03 |
| вул.Раманаўская Слабада, 9 | 200–83–04 |
| вул.Кашавога, 8 | 230–29–20 |

**Крамы:**

| | | |
|---|---|---|
| №1 | вул.Жукоўскага, 5 | 224–03–76 |
| №2 | пр.Скарыны, 44 | 284–83–59 |
| №3 | пр.Скарыны, 76 | 232–46–23 |
| №4 | вул.Леніна, 15 | 227–11–92 |
| №5 | вул.Енісейская, 6 | 243–16–30 |
| №6 | вул.Філімонава, 1 | 235–63–11 |
| №7 | вул.Коласа, 69 | 288–30–20 |
| №8 | вул.Сурганава, 40 | 232–45–10 |
| №9 | пр.Ракасоўскага, 140 | 247–30–15 |
| №10 | бульвар Шаўчэнкі, 7 | 233–74–88 |
| №11 | пр.Пушкіна, 77 | 255–80–71 |
| №12 | вул.Кіжаватава, 80 | 278–77–61 |
| №13 | вул.Каліноўскага, 82/2 | 264–06–42 |
| №14 | вул.Валадарскага, 22 | 227–75–55 |
| №15 | вул.Танка, 16 | 203–82–39 |
| №16 | вул.Харужай, 24 | 234–27–25 |
| №17 | вул.Някрасава, 35 | 231–03–28 |
| №18 | ст.м. «Плошча Перамогі» | 284–31–06 |
| №19 | пр.Машэрава, 5/1 | 223–81–66 |
| №20 | вул.Ясеніна, 16 | 271–87–21 |
| №21 | ст.м. «Пушкінская» | 255–57–20 |
| №22 | вул.Ілімская, 10, корп.2 | 243–16–83 |
| №23 | вул.Славінскага, 39 | 264–36–33 |
| №24 | вул.Жылуновіча, 31 | 295–05–74 |
| №25 | вул.Маркса, 21 | 227–08–52 |
| №26 | пр.Скарыны, 113 | 264–22–91 |

**Шапікі:**

- №18 БДТУ, вул.Сьвярдлова, 13/4
- №18 Пэдунівэрсытэт, вул.Савецкая, 18
- №78 Гатэль «Юбілейны», пр.Машэрава, 19
- №95 Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, вул. Мясьнікова, 39
- №136 ст.м. «Плошча Якуба Коласа», выхад да Акадэміі фізвыхаваньня
- №187 Гатэль «Беларусь», вул.Старажоўская, 15
- №189 Аўтавакзал «Маскоўскі»
- №198 БДЭУ, пр.Партызанскі, 26
- №209 Прахадная МАЗу, вул.Сацыялістычная, 2
- №228 Унівэрсытэт культуры, вул.Рабкораўская, 17
- №232 Менскі з-д халадзільнікаў, пр.Машэрава, 61
- №245 Больніца хуткай дапамогі, вул.Кіжаватава, 56
- №259 Менскі гандлёвы каледж, вул.Усходняя, 183
- №260 пр.Скарыны, 169
- №262 Гатэль «Плянэта», пр.Машэрава, 31
- №298 пр.Машэрава, 75/1
- №302 9-я больніца, вул.Сямашкі, 8
- №313 Слабадзкі праезд, 24

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні.
З прычыны вялікага аб’ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск.
E-mail: nn@promedia.by.
Факс: (017) 284-73-29.

# Ціха!

## Ідзе інфармацыйная вайна!

Беларускія ўлады ў сваёй інфармацыйнай палітыцы ставяцца да замежнікаў, як і да беларусаў. Эўрапейцы ж да беларусаў ніяк ня ставяцца — яны іх не заўважаюць. Піша **Віталь Тарас**.

Выбух у Віцебску, у выніку якога пацярпелі некалькі дзясяткаў чалавек, выклікаў на дзіва млявую рэакцыю ўладаў. Рада бясьпекі краіны пасьпяшалася заявіць, што інцыдэнт ні ў якім выпадку не тэракт. МУС і КДБ абмежаваліся няўцямнымі тлумачэньнямі. Краўнік дзяржавы ў самым агульным пляне выказаў думку, што міжнародны тэрарызм, усё-ткі, ня можа не закрануць і спакойную сінявокую Беларусь. Праўда, нічога канкрэтнага пра віцебскія выбухі не сказаў.

Прапагандысцкая машына ня здольная працаваць з фактамі — яна можа толькі выдаваць за факты ўласныя інсынуацыі ды прапагандысцкія штампы... Калі факты ня ўкладваюцца ў афіцыйна зацьверджаную схему — тым горш для фактаў!

### Генэралы мінулай вайны

Кажуць, што генэралы заўсёды рыхтуюцца да мінулай вайны. Гэта слушна і ў адносінах да войнаў інфармацыйных. У сёньняшняй Беларусі штатныя ды пазаштатныя прапагандысты ўсіх чыноў і званьняў займаюцца тым, што даюць адпор ідэалягічным прошукам Захаду, паколькі гэтым займаліся некалі ідэалягічныя органы ў Савецкім Саюзе. СССР прынята лічыць за ўзор дзяржавы, а яго распад — галоўнай трагедыяй мінулага стагодзьдзя. Пры гэтым чамусьці ніхто не задаецца пытаньнем, чаму ён разваліўся, калі быў такі добры. Зрэшты, сыстэма была пабудаваная акурат на тым, каб ніхто ніякіх пытаньняў не задаваў. На гэтым базуецца й цяперашняя сыстэма ў Беларусі.

Міністэрства замежных справаў, Міністэрства інфармацыі і шэраг іншых, так бы мовіць, зацікаўленых ведамстваў — кожнае паасобку і ўсе разам — устурбаваныя вяшчаньнем на Беларусь з-за яе межаў. МЗС, напрыклад, пашкадавала, што дзяржаўнае радыё не запрасілі паўдзельнічаць у тэндэры на арганізацыю такога вяшчаньня, які быў абвешчаны нядаўна Эўразьвязам. Дарэчы, чаму б і не паўдзельнічаць?

Па-першае, конкурс фармальна ні для кога не зачынены. Па-другое, радыёстанцыя «Нямецкая хваля», напрыклад, якая ўжо выйграла перад тым тэндэр на вытворчасьць паўгадзіннай перадачы для Беларусі, ёсьць, па сутнасьці, дзяржаўнай установай, якая існуе на грошы падаткаплатнікаў. Чаму б беларускай дзяржаўнай ідэалёгіі праз дзяржаўнае радыё наўпрост не памерацца сіламі ў этэры з палітычнымі прынцыпамі нямецкай дзяржавы? Праўда, у сьвятле апошніх выбараў у Нямеччыне некаторыя прынцыпы яе дзяржаўнай палітыкі, у прыватнасьці, замежнай, застаюцца пакуль не зусім ясныя. У Беларусі ж палітыка ў апошнія дзесяць гадоў застаецца стабільнай і прадказальнай, што несумненна павінны былі б улічыць арганізатары конкурсу ў Брусэлі. Таксама Эўразьвязу трэба было б станоўча ацніць і той факт, што ўсе выдаткі на вяшчаньне пакрываліся б зь беларускага прэзыдэнцкага фонду.

### У чаканьні кіно

Калі верыць сумежнаму з МЗС ведамству — Міністэрству інфармацыі Беларусі, у кожным выпадку глушыць замежныя радыёстанцыі ўздоўж беларускіх межаў беларускія ўлады намеру ня маюць. Бо гэта пярэчыла б духу добрасуседзтва, узаемакарыснага супрацоўніцтва і ўвогуле джэнтльмэнства, якім, маўляў, заўсёды вызначаліся беларускія ўлады ў дачыненьнях з суседнімі краінамі. Замест гэтага прапануецца ўзмацніць вяшчаньне на чужую тэрыторыю — у прыватнасьці, выпускаць больш радыёчасопісаў, у якіх будзе праўдзіва асьвятляцца шчасьлівае жыцьцё ў Беларусі. Так і хочацца дадаць — Савецкай Беларусі. У памяці міжволі ўсплываюць кіначасопісы з аднайменнай назвай, якімі за савецкім часам распачыналіся сэансы ў кінатэатрах. Большасьць гледачоў, праўда, старалася падчас паказу тых часопісаў бавіць час у буфэце.

З пазьнейшых часоў успамінаюцца фільмы «Дзеці хлусьні» ды



«Найноўшая гісторыя». Гэтыя творы ў адукаванага гледача (скажам, у братняй Польшчы) выклікаюць гамэрычны рогат. У менш адукаванага — пазяханьне. Праблема ў тым, што беларускія ўлады, у прыватнасьці ідэалягічныя работнікі, ставяцца да грамадзянаў замежных краінаў як да грамадзянаў краіны ўласнай. Іншымі словамі, трымаюць іх за дурняў. Такая звычка, выпрацаваная дзесяцігодзьдзямі савецкай




АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

улады, у Беларусі ўспрымаецца як цалкам натуральная. Бо цягам дзесяцігодзьдзяў тэлевізійнае, радыйнае, газэтнае ды іншае начальства ніякім чынам не адказвала за прадукт, які зьяўляўся ў этэры або ў друку. Бо кіраўнікі СМІ ўсіх узроўняў падпарадкоўваліся ня рынку, не жаданьням чытача, але адзінаму Богу — начальству. У канчатковым выніку ня проста начальству, а пэрсанальна галоўнаму слухачу (чытачу, гледачу) прызначаліся ўсе творы, сюжэты й сюжэцікі. Усе астатнія начальнікі, кожны на сваім узроўні, намагаліся даведацца або адгадаць, якім чынам можна патрафіць вышэйшай асобе.

Нельга забываць, што журналісцкі корпус недзяржаўных СМІ сфармаваўся, у асноўным, у тых самых умовах, што і дзяржаўнай. І таму ня проста самацэнзура, але звычка пісаць не для чытача, а для рэдактара або заснавальніка ці спонсара (альбо для таго, хто на думку журналіста зьяўляецца мусіць зьяўляцца спонсарам) застаецца невыкараняльная. Калі чытаеш тэксты нават у найбольш прафэсійных, сучасных, інфармацыйна насычаных беларускіх выданьнях, цяжка пазбавіцца ўражаньня, што многія зь іх напісаныя на заказ. Ня ў тым сэнсе, што напісаныя за грошы — хто ж адмовіцца ад ганарару! Але ў тым сэнсе, што матэрыялы, здаецца, не цікавяць ні

> Беларусь ад эўразьвязаўскага тэндэру на радыё папросту адсякаецца, разам зь беларускай мовай.

аўтара, ні тым больш чытача, але ж яны патрэбныя з гледзішча так званай палітычнай каньюнктуры. Зьяўленьне партыйнай прэсы ці хаця б адной партыйнай газэты было б, насамрэч, рэальным крокам да свабоды слова ў параўнаньні зь беспартыйнымі выданьнямі, палітычныя прыхільнасьці якіх залежаць ад асабістых упадабаньняў рэдактара. Але напачатку, праўда, трэба было б мець рэальныя партыі...

### Свабода ўнутранага карыстаньня

Дзесяцігодзьдзе Беларускай асацыяцыі журналістаў, сьціпла адзначанае вузкай грамадзкасьцю, засьведчыла, сярод іншага, што журналісцкая салідарнасьць калі яшчэ і засталася, дык толькі не ў асяродку выдаўцоў і галоўных рэдактароў незалежных мэдыяў. Бо аб якой салідарнасьці можа ісьці размова, калі розныя выданьні маюць часам адны і тыя ж крыніцы фінансаваньня? У такой сытуацыі, нават застаючыся фармальна на агульных дэмакратычных пазыцыях, тыя выданьні будуць непазьбежна канкураваць паміж сабой. І хай бы толькі паміж сабой! Пачынаюцца канкурэнтныя войны за цэлыя галіны СМІ. Так, адны даводзяць, што сёньня нельга стварыць незалежныя беларускае радыё, бо, бачыце, у Беларусі не засталося здольных радыёжурналістаў! Другія пярэчаць, што непатрэбныя, акурат, друкаваныя выданьні, паколькі наклады ў іх маленькія. Трэція даводзяць, што радыё і друк нішто ў параўнаньні з мажлівым уплывам тэлебачаньня.

Узьнікае пытаньне: якога ўплыву, уплыву зь якой мэтай? Кіраўнікі мэдыяў спрабуюць гуляць у вядомую гульню: «так» і «не» не гаварыць, чорнага й белага не апранаць. Але ўлады ім усё адно ня вераць ды падазраюць, што мэтай СМІ, якія фінансуюцца з-за мяжы, ёсьць дэстабілізацыя грамадзтва і адхіленьне ад улады існага рэжыму. Але ж нідзе, ні ў адной краіне сьвету дыктатура яшчэ ня рынула, дзякуючы выключна прэсе. Даводзіцца нагадваць усім вядомы прыклад. У Савецкім Саюзе замежныя радыёгаласы слухалі нават у самыя лепшыя для гэтых станцыяў часы некалькі адсоткаў слухачоў. Аўдыторыя іх была непараўнальна меншая за аўдыторыю, напрыклад, Цэнтральнага тэлебачаньня і дзяржаўнага радыё. І што, гэта ім дапамагло? А ці дапамаглі ў пазьнейшыя часы Беларускаму тэлебачаньню рэпартажы, у якіх выкрываўся нейкі апазыцыйны кандыдат у прэзыдэнты?

Іншая справа, што на пераломе, у самы момант змаганьня, калі яшчэ не вядома, хто каго — СМІ могуць адыгрываць вельмі важную ролю. Так гэта было ў Баўгарыі ў 1997-м, у Югаславіі ў 1999-м, ва Ўкраіне ў 2004-м. У Беларусі падобнага змаганьня, відавочна, няма і ў бліжэйшай пэрспэктыве не прадбачыцца. Ці азначае гэта, што Беларусі непатрэбная вольная прэса? Вольная прэса таму й завецца вольнай, што ні ў кога не пытаецца дазволу на сваё існаваньне. І на гэтым можна было б паставіць кропку — маўляў, каму патрэбная свабода слова, няхай той за яе і змагаецца. Можна было б, калі б гэта тычылася толькі Беларусі.

Калі свабода слова патрэбная толькі краінам Эўрапейскага Зьвязу, так бы мовіць, для ўнутранага карыстаньня — дзеля таго, каб прыносіць даход уладальнікам прэсы, рэклямадаўцам й задавальняць амбіцыі кіраўнікоў буйных карпарацыяў ды палітыкаў, тады сапраўды няма праблемы. Тады тэндэр на радыё для Беларусі, абвешчаны ЭЗ, ёсьць вяршыняй палітычнай і юрыдычнай думкі. Беларусь поводле гэтага тэндэру папросту ад праекту адсякаецца, разам зь беларускай мовай. Умовы сфармуляваныя так, быццам у Беларусі даўно пануюць дэмакратыя й рынкавыя адносіны. А новая радыёстанцыя павінна ўсяго толькі ўпісацца ў гэты рынак, заняць на ім сваю нішу і прыносіць дывідэнды — прынамсі, палітычныя. Такое ўражаньне, што кіраўніцтва ЭЗ, гэтаксама, як і беларускае кіраўніцтва, жыве верай у сьветлую будучыню, якая абавязкова наступіць ці тое ў 2007-м ці ў 2010-м годзе. Наступіць само сабой, бязь лішніх намаганьняў...

### Хто там, пад бел-чырвона-белым сьцягам?

Няма чаго крыўдаваць на тое, чаго няма. Не змагла беларуская апазыцыя дагэтуль ясна сфармуляваць, чаго яна хоча ад аб’яднанай Эўропы і ад ЗША — простага спачуваньня ці чагосьці большага. Нават у адносінах да Саюзу палякаў Беларусі не была выпрацаваная агульная стратэгія. Калі не лічыць стратэгіяй пазыцыю неўмяшаньня. Як можна разьлічваць на сапраўдную салідарнасьць і падтрымку Польшчы, калі асобныя беларускія апазыцыйныя палітыкі раздумвалі — а ці варта ўвогуле падтрымліваць палякаў? Сваіх праблем у беларусаў хіба не хапае?

Многія, напэўна, памятаюць яскравы эпізод, пра які пры канцы жніўня пісалі нават замежныя газэты. На сьвяточным канцэрце ў Варшаве, прысьвечаным юбілею польскай «Салідарнасьці», на сцэне зьявіўся бел-чырвона-белы сьцяг — сьцяг «вольнай Беларусі». Гэтыя словы вядучага пайшлі ў жывы этэр на шматмільённую аўдыторыю.

Парадаксальным чынам для таго, каб у Беларусь прыйшло вольнае слова, трэба, каб беларусаў спачатку пачулі ў Эўропе, каб яны гаварылі ва ўвесь голас, гаварылі на сваёй роднай мове, у абарону сваіх правоў і правоў нацыянальных меншыняў. Гаварылі ня толькі аб Беларусі, але і аб Эўропе ў цэлым. Так, сёньня яны адно аднаму неабходныя. Толькі ані ў Беларусі, ані ў Эўропе многія гэтага пакуль так і не ўсьвядомілі.

# Падзеньне Кейт Мос



WWW.LENINIPORTS.COM

Брытанскі штодзёньнік «Daily Mirror» апублікаваў здымак, на якім папулярная мадэлька Кейт Мос ужывае наркотыкі. Гэта стала канцом яе прафэсійнае кар'еры.

Фатаздымкі выклікалі такую навальніцу, што 31-гадовай Кейт Мос пагражае ня толькі разьвітаньне з працай, але і судовая справа. Брытанская паліцыя закідае Мос ужываньне какаіну падчас канцэрту яе каханка-сьпевака Пэтэра Догерці. Гэты факт тым больш праўдападобны, што самога Догерці ўжо лавілі на ўжываньні наркотыкаў.

Мос да нядаўна лічылася ідэальнай мадэлькай для рэклямных фірмаў і агенцый, скіраваных на маладую аўдыторыю. Яе аблічча зьяўлялася ў рэклямах «Шанэль», «Коці», «H&M» і г.д. А цяпер? Пасьля скандалу «H&M» ужо разарвала кантракт з Мос. Ідэалёгія гэтага швэдзкага вытворцы вопраткі — непрыманьне наркотыкаў. Клятвы Мос надалей весьці здаровы лад жыцьця не дапамаглі.

Потым яе напаткала чарговая прыкрасьць. Іншы вытворца вопраткі — «Бурбэры» — абвесьціў, што адмаўляецца выкарыстоўваць аблічча Кейт як свой фірмовы твар. Але да сапраўднай роспачы давёў Кейт Мос францускі дом моды Шанэль.

— Мы не працягнем з мадам Мос кантракт, які скончыцца ў наступным месяцы, — сказаў прадстаўнік фірмы.

Цяпер Кейт мусіць жыць на ашчаджэньні.

**«Gazeta Wyborcza»**

# Беларус — геній іншаформы



Філёзаф Алесь Анціпенка **(на фота)** зьмясьціў на сайце «Наша думка» «Зацемкі на палях беларускай мэнтальнасьці». Вось некаторыя зназіраньняў.

«Беларус баіцца думаць не таму, што ня ўмее, а таму, што асьцерагаецца выкрыць самога сябе.

Беларус — геній іншаформы. Перакінуцца ў ваўкалака яму як абаранак зьесьці.

Беларус, аднак, рэдка любіць казаць праўду, бо зазвычай пра яе пытаюцца ў яго розныя прыхадні.

Лес для беларуса — родны бацька.

Хата для яго — часовае жытло.

Стандартнага, ці каляніяльнага, беларуса лёгка пазнаць па тым, што на «Опэль» ці «Пэжо» ён кажа «іншамарка», а на «Масквіч» — «автомобиль отечественного производства».

Увогуле ж, стандартнага беларуса цяжка пакрыўдзіць. Крыўдлівыя сярод іх — толькі мянты».

Заканчваецца ж усё аптымістычным выказваньнем: «Покуль жа — пра беларуса што ні скажы, усё будзе няпраўдай».

**АВ**

# Мовы Эўразьвязу

Палова ўсіх эўрапейцаў гавораць, прынамсі, на адной замежнай мове, кажуць сацыёлягі. Больш за ўсё жыхароў, што гавораць на якой-небудзь замежнай мове, у Люксэмбурзе (99%). Менш за ўсё замежныя мовы ведаюць у Вугоршчыне — 29%. Перадапошняе месца ў сьпісе займаюць брытанцы — 30%.

Найбольш здольнымі да замежных моваў, паводле зьвестак экспэртаў, аказваюцца навучэнцы — сярод эўрапейскіх студэнтаў векам 15—24 гадоў 80% гавораць на іншых мовах.

Найпапулярнейшай замежнай мовай у Эўропе лічыцца ангельская — другая мова для 34% апытаных. Наступныя месцы займаюць нямецкая (12%), француская (11%), гішпанская (5%) і расейская (5%).

Расейская мова лічыцца асноўнай замежнай мовай у насельніцтва дзесяці краін — членаў ЭЗ. Між тым яна не зьяўляецца адной з афіцыйных моваў Эўразьвязу, праз што адукацыйныя праграмы на расейскай мове не фінансуюцца дзяржавай. Заўважым, што кожны год Эўракамісія выдзяляе пад 30 млн эўра на разьвіцьцё разнастайных адукацыйных праграм па вывучэньні замежных моваў.

Сацыялягічнае апытаньне было праведзена сярод 29,3 тыс. жыхароў 25 краін ЭЗ, а таксама ў Харватыі, Баўгарыі, Румыніі і Турцыі.

**СП**

## Напішы пісьмо Севярынцу

Павал Севярынец адбывае свой тэрмін высылкі на крайняй Поўначы Беларусі. Каб вырваць з грамадзкага жыцьця, яго закінулі ў глухі край. Там у радыюсе 30 км няма газэтнага шапіка й царквы, ня кажучы пра Інтэрнэт і мабільную сувязь. Але Паўлу можна напісаць на адрас:

**Да запатрабаваньня**
**Паўлу Севярынцу**
**П.а. Малое Сітна**
**211652**
**Полацкі раён**



# Сэксаголік цвыркун

**Альпійскі цвыркун — Anonconotus alpinus — сапраўдны сэксаголік, даводзяць навукоўцы з ангельскага Ўнівэрсытэту Дэрбі. Як толькі ў полі яго зроку зьяўляецца самка, ён кідаецца на яе і асядлоўвае на дзясятак зь лішкам сэкундаў, пакуль доўжыцца палавы акт. З падлікаў дасьледнікаў вынікае, што самец мяняе партнэрак у сярэднім кожныя 18 сэкундаў, што зьяўляецца рэкордам у сьвеце жывёл. Яго не турбуе нават, ці належыць самка да таго самага віду.**



НАД ШУМАМ ДЗЁН

# Чырвоныя макі на трыбуне ААН

Паўвеку таму нейкія мае далёкія родзічы зьехалі ў Амэрыку. Бо грошы. Сьлед прастыў. Яшчэ паўстагодзьдзя назад хтось ад'ехаў да Польшчы. Бо палякі. Бо каталікі. Сьлед згубіўся. Дзесьці ў шуфлядзе бабчынай мо і дагэтуль ляжыць паперка зь іх адрасам, ды калі мне да тае Зялёнае Гуры ехаць? І каму я там трэба? Уся гэтая мэтафізычная повязь – чаго яна вартая праз пяцьдзясят гадоў?

Дый мы — якія мы палякі? Зрэшты, як і яны. Мы ж і не з-над Нёмну. А звычайныя тутэйшыя, з-над Случы, хай сабе і шляхта. Дый якая шляхта! Толькі мянушка: «О, шляхта пайшла». Хіба што мы сякалі — то прыкмета праўдзівай крывічэсьлівасьці, а «мужыкі» сакалі — гэныя беларусы-сакуны. А з крыві ж — аднае, таго ж колеру.

Ну, прабабка мадлілася па нейкай кніжачцы з эль крэскаванымі. Ды па-руску не магла напісаць літар — як курыца лапай чыркала, дасюль на палях прадзедавых пісьмаў засталіся яе «сьляды». А так звычайныя мы людзі. А хто залучыць у палякі — то тэж не пакрыўдзімся. Як той казаў, палякі-то палякі, але «нашы».

Не такія мы, як за Бугам. Мо нашы сукрэвічы зеленагурскія і сталіся «як усе», а мы там — «яны», а тут — «нашы».

Помню, як павезьлі мяне да «мэтраполіі» ў канцы 1980-х, малога. Ё такое места, а мо і мястэчка, Плоцк. Ня той, дзе «Сафія нібы карабель», а дзе за ракой макавае поле пачынаецца. Вось яно мяне і ўразіла: у нас от такога не было, каб цэлае чырвонае мора макаў! І агулам мак — гэта наркотык, вучылі нас у школе. А яшчэ ў іх двары не такія, як у нас. Тыя ж пяціпавярховікі (гэта пасьля мне адкрылі сакрэт, што правільна іх зваць «хрушчоўкамі»), але двары *не такія*. У нас барабан быў заржавелы яшчэ з часу «Песьні-85», а ў іх і карусэлі, і арэлі. А пясочніца! Але не далі мне збудаваць свой замак зь пяску — дасюль шкадую, пацягнулі бацькі ў хрушчоўку.

І такія бальконы ў іх! *Не такія*, як у нас — акуратненькія, з дыванкамі; а ў нас — слоікі, «закаткі» зімовыя, не праступіцца. Выйшлі зь дзяўчынкай (не магу прыпомніць, як мы зь ёй разумеліся, я ж па-польску тады ня ўмеўшы) на лёджыю, а яна кліча з другой кватэры: «Цёця, цёця, патш, да нас прыехаў хлопчык з Рос'і!» «З Рос'і», — от гэта я зразумеў. «Ня з Рос'і, а з Савецкага Саюзу», — зьбянтэжыў я цёцю. Яна ўсьміхнулася, а дзяўчынка пацягнула мяне на кухню, есьці памідаровую зупу.

Вось гэты гаўбец, дзяўчынку і зупу ўспомніў я, чытаючы ў прамове нашага прэзыдэнта перад ААН: «Прайшло 15 год ад часу распаду мае краіны — СССР». Усе мы родам зь дзяцінства. А дзяцінства наша прайшло ў СССР. Ну хто гэтаму запярэчыць? Было такое. І сапраўды, ня ўсё там было дрэнна. Але ў Польшчы, хоць яна і курыца, — усё адно *лепш*.

Ну хаця б дзеля макавага поля. Там яно было, а ў нас — не. Або яго ад мяне хавалі. А я не люблю, калі ад мяне штосьці хаваюць. Дужа, аж занадта, я цікаўны.

…Я родам з СССР. У гэтым я з прэзыдэнтам салідарны: гэта была і мая краіна. А пасьля мая краіна стала называцца іначай, і агулам аказалася, што ёсьць вялікая розьніца між такімі паняцьцямі, як *краіна, дзяржава, нацыя, народ, люд*. Але гэта прыйшло пасьля — пасьля СССР. І вось цяпер я думаю: Беларусь — мая краіна, а дзяржава Беларусь — ці мая?

Краіна Польшча мне падабалася, але заставаўся патрыётам свае… дзяржавы. Маляваў на асфальце Крэмль і пісаў заклікі за мір ува ўсім сьвеце. Так мяне выхоўвалі. Маім героем быў Ленін, а ня гобліны ўсякія. Мая любімая кніжка «Дзяніскавы расказы», а ня «Гары Потэр». Я і сёньня ўпэўнены: гэта было добра.

А сёньня мая любімая кніжка «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі». Ужо паўтара месяца дзеля рознага кшталту жыцьцёвых пэртурбацыяў мне не да сур'ёзных тоўстых «клясыкаў», а каб галава «варыла», а не пакрывалася цьвільлю, як незацукраванае варэньне, я ўзяў пачытаць Васючэнкавы забаўныя гісторыі. Навярстаць упушчанае, хаванае ад мяне тады, пятнаццаць гадоў таму.

Бяз гэтага, хаванага тады, цяпер мне было б цяжка. Яны — частка Мае Краіны. Мае Рэчы Паспалітае. Многа год таму яе ня стала. Цікава, што сказалі б людзі, каб я ўспомніў пра яе, як пра маю настальгію, з трыбуны ААН?

**Тадэвуш Новак**

**P.S.** Макавага поля ў Беларусі не спатыкаў дагэтуль. Мо хто падкажа: дзе яно ёсьць?..

# Дубравенкі крывавыя берагі

На ціхай рачулцы ў Магілёве ў 1942 годзе адбылася найбуйнейшая прыродна-тэхнагенная катастрофа ў гісторыі Беларусі. Піша **Аляксей Бацюкоў.**

Пра магілёўскую трагедыю 1942 году гісторыкі паведамляюць мала. Афіцыйныя тры тысячы чалавек — кропля ў моры ахвяр той вайны. Між тым рэальнай колькасьці ахвяр найбуйнейшай прыродна-тэхнагеннай катастрофы ў гісторыі Беларусі ніхто не лічыў.

Дубравенка цяпер — рака невялікая. Упадаючы ў Дняпро, мае мэтраў дзесяць шырыні, і тое за кошт вады зь іншай ручаіны, Струшні. Стагодзьдзі таму была судаходная. У перадваенныя часы яе ўжо можна было перайсьці, закасаўшы штаны. Для Магілёва Дубравенка — сымбалічная рака, рака-калыска, на яе крутым левым беразе ўзьнік горад. Але аднойчы яна прынесла сьмерць тысячам чалавек. Пра трагедыю сорак другога году гісторыкі паведамляюць мала, як бы мімаволі. І зразумела: пачалося ўсё з падрыву чыгункі Саветамі. Дый тры тысячы — гэта хіба кропля ў моры ахвяр той вайны.

Зьбіраючы матэрыял пра патоп, хаджу па дамах на ўзвышшы па правым беразе рачулкі. Са старых, адказваюць мне ў першым доме, жывуць толькі двое. Бабулька з дому насупраць прыехала пасьля вайны, і дзед зь мясцовых жыве на гары. Прабачце, калі ласка, сунуся за кардонныя дзьверы ў дзедаў закутак. Стары не такі ўжо стары: маладжавы твар, бадзёрыя рухі, памяць сьветлая. Толькі-толькі пачуўшы маю тэму, ківае — так, вядома, я ўсё памятаю.

Яўгену Калачову было тады трынаццаць. Як і цяпер, іх дом узвышаўся над Задубровенскім перадмесьцем, аднак у сорак другім яны з маці і старэйшым братам тут амаль не жылі, бо пастаянна хаваліся ад паліцыі. Маці была сувязной у партызан, бацька — афіцэрам Чырвонага войска. Уся трагедыя адбылася літаральна на вачах у спадара Яўгена. Ён бачыў месца, адкуль усё пачалося, ён стаяў на беразе ракі, калі пайшла вада. Распавядае спакойна, але, ўзгадваючы пра калясачку зь немаўлём на хвалях, пра крык дзіцяці, калі яго ўцягвала ў вір, па-свойму, па-старэчы плача, не адчуваючы сьлёз на вачах. Голас амаль не зьмяняецца, аднак ва ўсім твары зьяўляецца бездапаможнасьць, і гэта выдае боль за ўсё сваё пакаленьне ваенных дзяцей.

У ліпені 1941-га Саветы пакідалі Магілёў арганізавана. Тут па Дняпры ствараўся першы сур'ёзны эшалён абароны, сюды пасьпелі перавесьці дзьве дывізіі з рэзэрву, пасьпелі эвакуяваць прадпрыемствы, нават вывезьлі заапарк. Каб нішто не даставалася ворагу, на тым месцы, дзе чыгунка перасякае Дубравенку, падарвалі насып. Гэта павінна было спыніць рух на лініі Магілёў—Менск, але не спыніла — насып прасеў, а палатно не папсавалася. Затое, прасеўшы, насып перакрыў русла Дубравенкі. На гэтую акалічнасьць зьвярнулі ўвагу ўжо акупацыйныя ўлады, бо да наступнай зімы за насыпам разьлілося возера на некалькі кілямэтраў. Вады паднялася да самых рэек, і цяпер ужо прарыў неспадзяванай дамбы мог разарваць чыгуначную лінію.

Возера было аграмаднае, тоны вады — узгадвае Яўген Калачоў — па яго лёдзе ён зь сябрамі пракрадаўся да нямецкіх складаў у Пячэрскім лесе, красьці тое-сёе на продаж. За кошт гэтага сям'я і выжывала. У пачатку красавіка лёд яшчэ стаяў. Немцы, прадчуваючы аварыю, вырашылі прабіць насып трубамі, каб спусьціць ваду. Апатэозам інжынэрнай думкі гэта назваць цяжка. Прабівалі некалькі дзён. 10 красавіка адна з трубаў дайшла да вады. Насып прарвала. У адно імгненьне зьнесла ўсіх рамонтнікаў, хваля пайшла па берагох. Грукат быў, нібыта кананада, згадвае спадар Яўген. Раўло і набліжалася. Тады ён і выскачыў на вуліцу. Па рацэ несла дамы, лазьню. З вокан выскоквалі і адразу танулі людзі. Каляска. Нейкі мужчына ўцякаў ад Дубравенкі на супрацьлеглы, таксама круты, бераг, аднак некалькі імгненьняў, і над яго галавой ужо сыш-ліся воды. Некаторыя загінулі ад Струшні — хвалі з Дубравенкі зайшлі й сюды. Плыні не было, але людзі ў дамах апыналіся ў пастцы, бо вада падымалася да столі.

Для многіх паратунак яшчэ быў магчымы, каб ня лёд. Ён ішоў другой хваляй, ламаючы паднятыя дамы.

Больш за ўсё ахвяр было на Быхаўскім рынку, ён разьмешчаны на самым беразе Дубравенкі. Увесну 1942-га гэта было адзінае месца, дзе можна было набыць нешта зь ежы. Штораніцу сюды зьяжджаліся вяскоўцы з наваколья, мяняць харч на старыя рэчы гараджан. Рынак увесь зьнесла ў Дняпро. Пазьней яшчэ некалькі гадоў запар увесну магілёўскія махляры карысталіся страхам месьцічаў перад Дубравенкай. Яны прыбягалі на рынак з крыкамі «Патоп! Патоп!» і чакалі, покуль спалоханы люд уцячэ на бліжэйшыя горы, кінуўшы скарб.

Целамі былі ўсланыя ўсе берагі — узгадвае Яўген Калачоў. Большасьць людзей і дамоў зьнесла ў Дняпро. Падлічыць усе ахвяры было немагчыма, дый немцы гэтым не займаліся. У адну агульную яміну складалі ўсе непрытомныя целы, так што брацкая магіла потым яшчэ суткі хадзіла ходырам.

Дамоў на месцы трагедыі стаяла шмат, у тым ліку адна з самых старых магілёўскіх сінагог. Недалёка ад яе, на беразе Дубравенкі ўжо ў пачатку вайны нацысты зрабілі гета. Гэта не павялічыла, аднак, колькасьці ахвяраў трагедыі — да вясны сорак другога гета было ўжо пустым.



**Так сёньня выглядае месца, дзе ў 1942 г. загінулі тысячы людзей.**



**Апошні сьведка трагедыі Яўген Калачоў.**




**— раёны Магілёва, якія былі затопленыя.**

Целамі былі ўсланыя ўсе берагі. Большасьць людзей і дамоў зьнесла ў Дняпро.

---

Зварот да надзвычайнага і паўнамоцнага пасла ФРГ у Беларусі сп. Марціна Хэкера з прапановай, каб беларуская праграма «Нямецкай хвалі» выходзіла па-беларуску, а не па-расейску, падпісалі:

Зьміцер Бартосік, бард, Эдвард Зайкоўскі, археоляг, Леанід Акаловіч, сьвятар, Ада Райчонак, грамадзкая дзяячка, Віктар Маркавец, мастак, Аляксей Крукоўскі, філёзаф, Аляксей Марачкін, мастак, Уладзімер Крукоўскі, мастак, Мікола Купава, мастак, Яўген Шатохін, мастак, Эдуард Акулін, паэт, Ілона Шчукіна, Мікіта Філімонаў, Ільля Петравец, Марыя Жабінская, Э.Саўчанка, К.Шык, Павал Біч, Ігар Матавілаў, Павал Шыбека, Лілія Брызінская, Вольга Срыбная, Тацяна Голуб, Валянціна Даражок, Людміла Жураўлевіч, Сьвятлана Тарасевіч, Яўген Хлус, Лілія Гайкова, Зоя Ляховіч, Алена Жукоўская, У.Казак, Е.Вяргейчык, Іван Фясенка, Пятро Явідовіч, Алесь Дзергачоў, Аляксандра Міхайлава, Юлія Ляскоўская, Аляксей Тарасаў, Ганна Салагуб, Сьвятлана Мельнік, Вера Чабатар, Алена Бурбліс, Вольга Печарыцына, Вольга Шунько, Надзея Паўлык, Надзея Сьцефановіч, Тацяна Іванчык, Юлія Субаткевіч, Марыя Мяшчэрская, Натальля Шчасная, Вольга Новік, Тацяна Вярцінская, Ганна Жукоўская, Сьвятлана Амброжыс, Андрэй Іваноў, Ігар Кудла, Вольга Кісель, Вольга Грыка, Ганна Васільева, Іна Шубіч, Наташа Сьцісьлевіч, Вольга Мядзьведзева, Кацярына Ляшчэўская, Юлія Баглай, Тацяна Беразоўская, Кацярына Бутурля, Сьвятлана Кот, Ірына Янушэўская, Алеся Сінкевіч, Анастасія Яновіч, Дыяна Лобан, Канстанцін Літвінскі, Алена Аўсяйчук, Ірына Сонгіна, Тацяна Ждан, Марыя Аўсейка, Вольга Кротава, Яўгенія Шлапека, Вольга Амельчанка, Марыя Ісенава, Кацярына Бабрыцкая, Ганна Бязусава, Надзея Бялова, Кацярына Бокша, Іна Аўдзевіч, Сьвятлана Несьцер, Анастасія Матылевіч, Тацяна Кузьма, Натальля Каначэль, Кацярына Асадчая, Надзея Атрошчанка, Вольга Сяўрук, Іна Бабко, Вольга Трапіла, Маргарыта Кармаза, Ульляна Страшкевіч, Вольга Царык, Іна Равякіна, Алёна Шульган, Марыя Шмыга, Тацяна Грыб, Кацярына Кулікова, Міхась Мельнік, Анастасія Грос, Алёна Бародзіна, Аліна Занеўская, Вольга Роўбуць, Вольга Мынко, Алена Расенік, Алеся Пасепа, Вераніка Паўлюковіч, Кацярына Альговіч, В.Мацюшына, В.Рудак, Т.Труханава, М.Радзько, А.Казачок, В.Новікава, В.Буронь, Д.Курылёнак, А.Баран, С.Новікаў, У.Хрышчановіч, М.Сьцепасюк, І.Васілеўскі, М.Бурачэўскі, Г.Зьмітровіч, Тацяна Гагалушка, Вольга Ланго, Вераніка Юхнік, Іна Міхалюк, Яніна Лашакевіч, Анастасія Шчамялёва, Тацяна Коктыш, Вольга Гайдуль, Марта Бузарына, Галіна Ілбуць, Алена Дудко, Юля Ўсюкевіч, Вольга Калачык, Тацяна Коршун, Вольга Канюк, Кацярына Карней, Валянціна Дзерачэнік, Сьвятлана Звонік, Анастасія Залеская, Іна Жыдзель, Ірына Дубкова, Алена Неновіч, Анастасія Герасім, Іна Красьнік, Сьвятлана Кубіцкая, Тацяна Надліская, Натальля Ляўчук, Натальля Галавач, Зьміцер Нодзь, Юлія Літвін, Юлія Цьвяткова, Каця Трафімчык, Ксенія Мігаль, Крысьціна Стужынская, Насьця Покуць, Юлія Мястоўская, Юлія Талочка, Сьняжана Русалевіч, Ірына Пякша, Кацярына Малашчук, Тацяна Мацюк, Вольга Руткоўская, Тацяна Кастусевіч, Ірына Манькоўская, Натальля Прытука, Алена Гайдукевіч, Вікторыя Жых, Юлія Сабалеўская, Ганна Кебліс, Кацярына Пішчык, Ганна Мярляк, Вольга Сямашка, Настасься Завельская, Таня Ўтаўка, Настасься Саковіч, Тамара Ганусевіч, Тацяна Чарняўская, Алена Масык, Натальля Мартынкевіч, Марына Трунц, Аксана Талачова, Вольга Лысеня, Віталь Драгун, Аляксей Янкоўскі, Ганна Захарэвіч, Тацяна Філіповіч, Надзея Савоська, Ганна Енка, Алена Малышка, Алена Гіль, Юлія Шымуль, Ілона Казлоўская, Аксана Гаўрыленка, Марына Каханоўская, Людміла Казлоўская, Рэгіна Кодзь, Яўгенія Шкірміна, Людміла Шаршнёва, Уладзіслаў Буракоўскі, Рэната Лайбіс, Кацярына Жэбрык, Вераніка Ярашэвіч, Аксана Кісялевіч, Настасься Квяткоўская, Тацяна Кунгурцава, Натальля Варабей, Іна Пірог, Сьвятлана Сайкоўская, Марына Калесьнік, Алена Петраш, Марына Бельская, Тацяна Паплёўка, Марыя Мароз, Ганна Байко, Ганна Гардзевіч, Вольга Крукоўская, Настасься Даніловіч, Алеся Матусевіч, Галіна Анохіна, Вікторыя Клавец, Вольга Копан, А.Дораш, Барыс Муха, Ігар Крукоўскі, Аляксандар Сарокін, Сяргей Пазьняк, Сяргей Качура, Зоя Сьвірыд, Уладзімер Гамарнікаў, Віктар Сьвірыд, Валер Нікіцін, Валер Сянько, Аляксандар Лапшын, Аляўціна Вячорка, Марына Жаўрыд, Аляксандар Харланчук, Сьвятлана Працко, Яўген Дзьвізаў, Н.Жучкова, Ф.Федасееў, С.Кавалёў, Алесь Чэчан, Валянціна Раманцэвіч, Юры Пачопка, Ганна Сакалоўская, Андрэй Курылёнак, Алена Цітавец, Зьміцер Дзяжурка, Юры Гідлеўскі, Валерыя Папова, Натальля Буева, Кацярына Грэк, Яўгенія Мустэйкіс, Юры Сурко, Алеся Гінтаўт, Алена Буялава, Ігар Пракапчук, Сяргей Пякарскі, Андрэй Сак, Алёна Сьцёпіна, Каця Нікіфарава, Дзіма Анафрыюк, Сяргей Мацкевіч, Васіль Грыбоўскі, Сямён Каралёнак, Іван Кайко, Сяргей Берняковіч, Томаш Попель, Леанід Гузаў, Тацяна Скармаховіч, Уладзімер Яцына, Канстанцін Купрэвіч, Алег Зарэцкі, Марыя Несьцяровіч, Ніна Аўдыцкая, Галіна Боўфал, Любоў Мехавіч, Натальля Клунік, Надзея Башлова, Вольга Каралёнак, Мікалай Лашук, Сьвятлана Гераськіна, Міхаіл Сьвірскі, Антон Самко, Людміла Мамчыц, Ганна Каваленка, Яўген Мамчыц, Зьміцер Мамчыц, Леанід Загрэшчанка, Марыя Загрэшчанка, Вадзім Багарэвіч, Людміла Багарэвіч, Аляксандар Саломенка, Раіса Саломенка, Мікола Курукін, Леанід Іваніцкі, Іван Маўрыкін, Раіса Асташэвіч, Ніна Барысенка, Міхаіл Колбун, Міхаіл Місуна, Глафіра Мялешка, Віктар Гусак, Міхаіл Будзіч, Пётар Аніська, Уладзімер Кавальскі, Ала Талайка, Міхаіл Варабей, Сьвятаслаў Валюк, Т.Юрпалава, М.Буката, Л.Коўзан, М.Лапцева, М.Муравей, Р.Пашковіч, Т.Карашкова, Э.Пашута, Н.Краўчанка, В.Садоха, Мікола Грышан, Ігар Маркушэўскі, Аляксандар Болгак, Віктар Трайпель, Алесь Панкевіч, Мікола Чыбісаў, Фёдар Красюк, Л.Жэгалік, Рыгор Шундрык, Данута Бельская, Дзяніс Кобрусеў, Вольга Кліменка, Зьміцер Касьпяровіч, Ксеня Дэц, Алесь Мазанік, Андрусь Аляхновіч, Сяржук Лацінскі, Уладзімер Радзюк, Пётра Караткевіч, Павал Пшыгоцкі, Алег Рудэнка, Вячаслаў Дзямянчык, Мікалай Маркоўка, Алена Маркоўка, Сьвятлана Шэвякова, Вольга Радзько, Алег Шагулін, Валянціна Сучак, Андрэй Рулін, Сяргей Левурдо, Іван Антанюк, Міхаіл Шкраба.

*(Пачатак сьпісу гл. у папярэдніх нумарах газэты. Працяг будзе.)*

АЛЯКСЕЙ БАЦЮКОЎ



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

апавяданьне

# А я думаў, у нас сын

**Аляксей Бацюкоў** — пісьменьнік. Жыве ў Магілёве.

У пярэднім пакоі нас ужо чакала тая самая пара. Аж да белі сівы дзядок у касьцюметройцы і бабуля ў пярэстай хустачцы, зь ярка-чырвонымі вуснамі і тлуста падкрэсьленымі алоўкам вачамі. Чорна-сінія палосы ішлі наўскос і паверх сівых брывоў, але на экране мусілі глядзецца добра.

Мы ўчацьвярох прыселі ў студыі. Вераніка агрэсіўна пачала.

— Так. Мікалай Фёдаравіч, — дзед важна кіўнуў, — і Вольга Рычартаўна, — бабуля элегантна павяла брывом. — Вы сёлета адзначаеце залатое вясельле. Так? — Мікалай Фёдаравіч і Вольга Рычартаўна ўсьміхнуліся адно аднаму і нам. — Цудоўна. Мы вельмі вас віншуем.

— Дзякуй.

— Вы не хвалюйцеся, у нас будзе з вамі самая звычайная размова, так бы мовіць, пасямейнаму. Раскажаце нам, як вы пазнаёміліся, што болей за ўсё запомнілася з вашага сямейнага жыцьця. Ну і, вядома, у чым рэцэпт такога доўгага саюзу! — Вераніка ярка засьмяялася. Мікалай Фёдаравіч сарамліва паціснуў плячамі: «Ну-у, што мы тут скажам асаблівае…»

— А нам асаблівае ня трэба, расказвайце нам усё як ёсьць. Давайце парады маладым са свайго, так бы мовіць, узросту, і абавязкова раскажыце нам пра ўсе свае самыя значныя падзеі ў жыцьці.

— А што мы раскажам, у нас нічога асаблівага не было — засьмяялася Вольга Рычартаўна.

— Ну ня трэба, ня трэба вам так ужо хаваць і ўтойваць. Ва ўсіх нас ёсьць і шкілет у шафе, і нешта запамінальнае.

Я ўступіў у размову:

— Раскажыце нам пра сваіх дзяцей.

— А, гэта добра, — супакоілася Вольга Рычартаўна.

А Мікалай Фёдаравіч спытаў:

— Ну, спачатку, канечне, трэба будзе сказаць некалькі словаў пра сябе?

— Пра вас, — паправіла Вераніка.

— Добра. Гэта добра.

— Ну што ж, хадземце на наша, так бы мовіць, месца.

Пудра, удзяваньне пяцелькі, халадок, пачатковая застаўка.

— Добры дзень, добры дзень усім нашым тэлегледачам, сёньня панядзелак, гэта праграма «Справы сямейныя», і ў студыі Алесь Коцюбаў…

— …і Вераніка Дрын, — падхапіў я і падумаў, што з такім прозьвішчам Вераніка лепш бы вяла аналітычныя праграмы на БТ.

— А размова наша сёньня пойдзе пра шлюб. І ня просты шлюб, а з залатой пробай, так сказаць. У нас у гасьцях — Мікалай Фёдаравіч…

— …і Вольга Рычартаўна Чаркасавы адпаведна, — падхапіў я.

— Добры дзень, Мікалай Фёдаравіч і Вольга Рычартаўна.

— Добры дзень. — гледзячы ў камэру, павітаўся Мікалай Фёдаравіч. Я прыгадаў, што мы забылі іх папрасіць не глядзець у камэру.

— Мікалай Фёдаравіч і Вольга Рычартаўна — незвычайная пара, — працягвала Вераніка. — Ім удалося тое, што так рэдка сустракаецца ў сучасных сем'ях. Ім удалося захаваць каханьне, адданасьць і вернасьць адно аднаму на доўгія гады.

— А дакладней, роўна на пяцьдзясят, — падхапіў я. — І сёлета, літаральна днямі, яны будуць адзначаць залатое вясельле.

— Віншуем вас, Вольга Рычартаўна і Мікалай Фёдаравіч! — засьмяялася Вераніка.

— Дзякуй, — уступіў у гутарку Мікалай Фёдаравіч і крыху падаўся наперад. — Толькі я павінен вас паправіць. У нас залатое вясельле будзе ня днямі, як вы сказалі, а праз два тыдні, бо ажаніліся мы роўна пятнаццатага чысла. Гэта мы спачатку хацелі ажаніцца трыццаць першага, а потым перанесьлі вясельле на два тыдні, бо захварэла Любоў Еўдакімаўна Скварцова, дырэктар нашага ЗАГСу: у яе быў грып, пакольki яна праскразілася. І такое бывала. А шлюбы рэгістравала толькі яна ў нашым горадку.

— Так. А пачнём давайце нашу размову…

Вераніку перапыніла Вольга Рычартаўна.

— Ты памыляесься нешта, Коля, — Вераніка з гатоўнасьцю спынілася і шчасьліва заківала галавой: «Так, так, Вольга Рычартаўна?» — Мы ажаніліся дванаццатага, бо чакалі, пакуль з Порт-Артуру прыедзе мой бацька. Ён быў ваенны, і яго, адпусьцілі на два тыдні ў Беларусь на маё вясельле. Адзін тыдзень ён ехаў сюды, павіншаваў мяне, і потым адзін тыдзень ехаў назад. Яго потым у Віетнаме ракетай зьбілі амэрыканцы. У тым жа годзе.

Мікалай Фёдаравіч заклапочана зажаваў губамі.

— Я памятаю. Што твой бацька быў адвакат.

Пакуль Вольга Рычартаўна паварочвала да Мікалая Фёдаравіча свой зьдзіўлены твар, у размову ўварвалася Вераніка.

— Так, Мікалай Фёдаравіч і Вольга Рычартаўна, у любым выпадку, я думаю, што самыя сьветлыя вашы ўспаміны — гэта ўспаміны пра тое, як вы пазнаёміліся. А потым прыгадаем і само вясельле.

Мікалай Фёдаравіч асьцярожна паглядзеў на Вольгу Рычартаўну і стаў адказваць першым.

— Ну я ж і кажу. Яе бацька быў адвакат.

— Што я, ня ведаю, кім быў мой бацька? — Вольга Рычартаўна адвярнулася ад Мікалая Фёдаравіча. У голасе яшчэ адчувалася пяшчота, але ўжо з гнільцой.

— Ён быў адвакат і абараняў мяне ў судзе. Мяне хацелі пасадзіць за хуліганства, таму што я разьбіў бутэлькай віна галаву аднаму прайдзісьвету, які расказваў мне ўсякую лухту, што Дастаеўскі пісаў «Ідыёта» зь сябе. Ён толькі страсеньне атрымаў, а яе бацька быў маім адвакатам. Потым, калі выйшаў, я наведаўся да яго ў госьці і там сустрэў Вольгу. Яго звалі Рычарт Адамавіч. Паляк.

— Літовец, — паправіла Вольга Рычартаўна. — Рычарт Адонісавіч правільна.

— Так, ну вы сустрэліся ў доме Вольгі Рычартаўны, і што было далей? — Вераніка разьвярнула ўсьмешку ад Вольгі Рычартаўны да Мікалая Фёдаравіча.

— Я ня ведала, што ты сядзеў, — прамармытала Вольга Рычартаўна. — І доўга?

— А потым, — Мікалай Фёдаравіч зноўку асьцярожна паглядзеў на Вольгу Рычартаўну, — мне ўдалося запрасіць яе ў бібліятэку пачытаць Герцэна разам.

Я ўставіў:

— Я думаю, што гэта вельмі рамантычна — прызначаць першае спатканьне ў бібліятэцы. Гэта вельмі правільна нават.

— Мы, хлопцы і дзяўчаты, зусім іначай тады ставіліся адно да аднаго, чым цяпер, — заківаў Мікалай Фёдаравіч.

На гэта Вольга Рычартаўна грэбліва павяла рукой:

— Пасьля першага спатканьня мы ўжо і павінны былі ажаніцца, бо я засталася начаваць у Колі. А вярталіся мы з кіно, а не зь бібліятэкі.

— У кіно ты хадзіла з Васькам са свайго пад'езду. Я цябе ў яго адбіў пасьля таго, як ён уцёк на Урал.

— Не было ў мяне ніколі Ваські-суседа. У Крыме я толькі з адным Васем была знаёмая, у санаторыі, але гэта ўжо калі мы былі дваццаць гадоў як жанатыя.

— Дык хіба ты ў Крым калі езьдзіла? Мы ж толькі ў Сочы бывалі, і заўсёды разам, усёй сям'ёй.

Вераніка, ярка-пунсовая пад пудрай, зь ціхай трывогай і нават тугой у голасе спытала:

— Як вы лічыце, Мікалай Фёдаравіч, езьдзіць заўсёды на летні адпачынак разам з усёй сям'ёй, зь дзецьмі — гэта можна назваць адной са складовых доўгага і шчасьлівага шлюбу?

Вольга Рычартаўна зноўку адвярнулася:

— Заўсёды разам? А як ты з масквічкай той загуляў, калі ў Абхазіі адпачываў, — забыў ужо? Потым два гады ёй начамі званіў.

Мікалай Фёдаравіч упіўся позіркам у самае вуха Вольгі Рычартаўны і затрос вуснамі. Потым справіўся з хваляваньнем і ўскрыкнуў:

— Я ніколі! Ня здраджваў табе.

— Ага, і на старане ў цябе няма дачкі, якая ў Ізраіль потым зьехала з мужам? Ты сам расказваў майму брату.

Я нарэшце пераадолеў агульную слабасьць і выдушыў:

— Так, канечне, жыцьцё — складаная штука.

Мікалай Фёдаравіч апусьціў галаву, потым падняў яе, паглядзеў на нашага апэратара ў студыі, на акно, за якім віднеліся рэжысэр і гукарэжысэр. На самога сябе на маніторы. Павярнуўся да Вольгі Рычартаўны:

— У цябе ёсьць брат? Як яго завуць?

Вераніка нейкім жывёльным намаганьнем волі падняла свой голас на танальнасьць вышэй і завішчала:

— Вольга Рычартаўна, скажыце, калі ласка, а вы зможаце падзяліцца з намі малеенечкай таямніцай? Вы ўжо вырашылі, што вы падорыце на ваша залатое вясельле вашаму мужу? — і выразна дадала: — МІКАЛАЮ ФЁДАРАВІЧУ!

Ані Вольга Рычартаўна, ані Мікалай Фёдаравіч не адазваліся на Веранічын віскат, таму падхопліваць прыйшлося мне. Сярод сваіх папер у папцы я не адразу знайшоў неабходны лісток. На адно імгненьне прасьвідраваў яго позіркам, каб не патрапіць на які-небудзь новы падман, і нахіліўся да Вольгі Рычартаўны:

— У размове з нашымі рэдактарамі вы, Вольга Рычартаўна, у прыватнасьці, зазначылі, што апошнія некалькі гадоў пішаце песьні і адну зь іх прысьвяцілі спэцыяльна свайму мужу, Мікалаю Фёдаравічу.

Пэўны час Вольга Рычартаўна глядзела ў адну кропку, аднак на мае апошнія словы павярнулася і паглядзела на мяне. Доўга, нерухома, моўчкі.

— Гэта так, Вольга Рычартаўна? — дадаў я нарэшце і ўсьміхнуўся, пераводзячы вочы ўніз на папку, бо пад гэтым позіркам хацелася круціцца на месцы і зарывацца з галавой у пясок.

Стала чуваць, як ціўкае стрэлка гадзіньніка на сьцяне. Вольга Рычартаўна маўчала, але ці працягвае яна глядзець на мяне, я ўжо баяўся правяраць.

Мікалай Фёдаравіч ня вытрымаў першы.

— Я нарадзіўся ў 1940-м годзе ў сям'і простага рабочага чалавека, працаўніка Мсьціслаўскага мэталюргічнага заводу, і настаўніцы школы нумар адзін. Гэта былі шчырыя і добрыя людзі, якія навучылі мяне шмат чаму добраму, чаму і я заўсёды вучыў свайго сына і буду вучыць сваіх унукаў. Я з самага дзяцінства любіў прыроду сваёй роднай зямлі і вельмі паважаў клясыкаў нашай беларускай літаратуры. Якуб Колас і Янка Купала заўсёды мной высока цаніліся, хоць расейскіх аўтараў я таксама вельмі люблю. Асабліва мне падабаецца Леў Талстой. Яго раман «Вайна і мір» я перачытваў некалькі разоў, і з кожным разам адкрываў для сябе нешта новае і новае.

Я нарэшце вынырнуў са сваёй папкі:

— Мікалай Фёдаравіч, вы ж хутка сьвяткуеце залатое вясельле з Вольгай Рычартаўнай? Так?

— Так, малады чалавек, — ён глядзеў некуды ўбок ці міма мяне. — Гэта адпавядае рэчаіснасьці.

— Тады растлумачце мне, калі ласка, чаму вы нарадзіліся ў 1940-м годзе?

— А чаму я не павінен быў нараджацца ў 1940-м годзе?

— Выходзіць, што калі цяпер 2005 год і вы сьвяткуеце залатое вясельле, то вы ажаніліся ў пятнаццаць год?

Вольга Рычартаўна нарэшце закруціла галавой, і цяпер ужо яна ўтаропілася ў Мікалая Фёдаравіча.

Мікалай Фёдаравіч зноўку зажаваў губамі. Ён паглядзеў глыбока ўніз, і складкі ахапілі ўсю ніжнюю частку яго твару. Нарэшце ён праскрыгатаў з гэтых складак:

— Выходзіць, што так.

— Коля, — Вольга Рычартаўна плакала. Гэта была, аднак, халодная і адзінюткая сьляза на каменным твары, так што ні ў мяне, ні ў Веранікі ня ўзьнікла жаданьня ўскрыкнуць: «Ой, што вы, Вольга Рычартаўна, ня плачце!» — Коля, — яна паўтарыла гэта яшчэ двойчы, хоць Мікалай Фёдаравіч глядзеў прама на яе. — Коля, у нас з табою толькі адна дачка, Марыя. У яе двое дзяцей. Таксама дзьве дзяўчынкі, Сашанька і Хрысьціна. Хрысьціна ходзіць у школу.

Мікалай Фёдаравіч апусьціў галаву зноў і раўнамерна затрос усімі сваімі складкамі.

— А Саша?

— Саша? — цяпер задумалася Вольга Рычартаўна. — Саша? — гнятлівая і задушлівая паўза. Толькі цяпер я заўважыў, што ярка-бэзавая пасма выбілася ў яе з-пад хусьцінкі і закрыла палову твару. — Саша?

— Саша, Саша. — паўтарыў Мікалай Фёдаравіч.

Вольга Рычартаўна паглядзела ў пошуках падтрымкі на мяне, потым на Вераніку.

— Ня памятаю.

Мікалай Фёдаравіч уздыхнуў:

— А я думаў, у нас сын.




ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# НараДА! ДА! «ДАжынак»

## ВАДЗЯНІК НЯМІСКІ

Працяг са старонкі 2.

«Апошнія гады жылі мы млява.
Цяпер пра нас паўсюдна пойдзе слава!
Глядзіце, каб трымаліся!
Свайго мы дачакаліся —
Нарэшце і да нас дайшла халява!

Вядома, пойдуць грошы і направа.
Налева трэба больш? Якая ж справа!
Жывём ня толькі з жынкамі —
Пажнём сваё «Дажынкамі».
Не абяднее родная дзяржава.

Ня сьпіце ў шапку, загінайце пальцы:
Хоць трэсьніце, але зрабіце, мальцы!
Няўбраныя бульбоўнікі,
Спусьцелыя кароўнікі
Кроў з носу, быць павінныя ў асфальце!

І яблыкі разьвесіць трэба ў садзе:
Хай возіць аграном на ўласнай «Ладзе»,
Ды не свае зялёныя —
Чырвоныя! Куплёныя!
Ня зробіць — ён за сад надоўга сядзе!

Цяпер да старшыні «спажыўсаюзу:
Глядзі, наспажываў якое пуза!
А дзе ж у крамах пернікі
Ня горш, чым у «губэрніі»?
Табе пасада хлебная — абуза?!

Адна заўвага ёсьць да ваенкома.
Ня стаў свой «шасьцісоты» каля дому!
Якая там канвэрсія?!
Павінен быць пры «мэрсе» я!
Табе субардынацыя знаёма?!

Пра бізнэсоўцаў ледзьве не забыўся.
Дык вось, пакуль апошні не накрыўся,
Няхай нясуць па дзесяць «штук».
Амаль адбіліся ад рук —
Пра нейкі рынак люд разгаварыўся!

А ты калі прачнесься, ідэоляг?
Хоць шорах навядзі з папом у школах.
Што, на пустыя страўнікі
Заўпарцяцца настаўнікі?
Ня зробяць нам да сьвят дзяцей вясёлых?

А вы імпэт настаўніцкі ўздымайце —
Па пару мінімалак абяцайце.
Адразу не давай, начфін,
А то спусьцее магазын
І лясьне дабрабыт у нашай хаце.

Вось у сабесе слушна разважалі,
Калі хор вэтэранскі запрашалі:
«Як выплацім ім пэнсіі,
Век не пачуем песьні мы».
І пэнсіі на месяц затрымалі.

Што песьні — факс із вобласьці даслалі!
Ня факт, але празрыста намякалі
На голыя жывоцікі
І лыткі для эротыкі
Ды іншыя, як кажуць, тралі-валі...

Ня лыпайце нявіннымі вачыма
І не кажыце мне, што немагчыма!
Ня толькі на экватары
Ёсьць голых баб аматары!
Патрэбна ўважыць кожнага па чыне.

Даручым гэты фронт, напэўна, Ядзі.
Лепш сакратаркі хто распусту зладзіць?!
Пакліча дзевак з вопытам,
Каб заняліся — попы там
І сьцёгны паказалі на парадзе.

Але глядзіце мне, каб Ядзя здуру
Не агаліла ўсю сваю фігуру.
Калі яна ня спыніцца,
Усё начальства зьдзьвінецца
І забярэ яе ў намэнклятуру.

Цяпер пра навакольную прыроду —
Пра вашу маць, няўжо ня чулі зроду?
Мы сёньня — агітатары!
Мастацтва, трасца матары,
Павінна ў нас цяпер служыць народу!

Пуд фарбы жывапісцам выдаць з базы!
Няхай фарбуюць, бога-ў-душу-мазы,
Зялёным колерам траву,
Інакш галовы адарву!
Без фармалізму і другой заразы!

Начальству даспадобы на каменьні
Дзікі, зубры, вавёркі ды алені.
Прыпомні родны свой парткам,
Дай разнарадку мастакам:
Буслоў — ні-ні! Якія тут сумненьні:

Галоўны госьць становіцца шалёным,
Калі пабачыць белае з чырвоным.
Чуў у сталіцы чуткі я,
Што хутка нават «хуткія»
Перафарбуюць колерам зялёным.

Дарэчы, што там з больніцаю, фэльчар?
Я пакажу табе «яшчэ ня вечар»!
Ня цацкайся з калекамі!
Усіх дамоў — за лекамі!
І больш каб не зьбіраў з убогіх веча!..

Няма з мэханізатарамі зладу:
Адзін камбайн працуе на брыгаду!
Жывуць адзінай мараю —
Як гандляваць саляраю,
А потым жлукцяць «гару» аж да ўпаду.

Іх прадстаўнік раённага закону
Павінен паганяць, бо пры пагонах.
І службу знаць пара ня яць:
«Хапаць, цягнуць і не пушчаць»,
А чырванець — выключна з самагону.

Вядома, сьвята будзе ўсё па-руску,
Ды калярыту трэба на закуску.
У школе ёсьць адзін дзівак —
На мове чэша толькі так, —
Хай выступіць. А потым — у кутузку!

Загад нягласны ёсьць пра трэці сэктар.
Абрала тут дзяржава верны вэктар:
Нацдэмы з дэмакратамі
Павінны быць за кратамі!
Хапае ў КПЗ на іхні век нар.

І з той нагоды ўжо далі дабро нам
Пустыя Крынкі перакрыць кардонам.
Гасьцей калі на чай зьбяру,
На кожны слуп — па снайпэру!
І хай пільнуюць усю ноч Мірона!

І пры канцы — галоўны напамінак:
Кар’ерны рост — па выніках «Дажынак».
Лізьнеце ўсе напоўніцу,
А ўладзе кайф запомніцца —
Дазволю на Канарах адпачынак!!!»

За годам год праходзяць без замінкі
Прыўладныя халяўныя «Дажынкі».
А што народ? Народ — як крот,
Капае моўчкі свой гарод...
Так і жыве саўгас «Пустыя Крынкі»!

# сто пудоў адзіноты

**АНДРЭЙ ХАДАНОВІЧ**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

***
больш нічога не адбываецца
толькі неба ў вадзе адбіваецца

***
Дзьве лыжкі солі на шклянку цёплага мора,
якое цячэ з валасоў і на твары ня стыне.
Ляціш праз мяжу на сустрэчу са сьветлым
*tomorrow*
і ўпадаеш у мора ў раёне Гданьску і Гдыні.

Вільготны вецер зранку мазгі прамывае.
Зьвіліны вашых маршрутаў — на гданьскіх мапах.
Міма цябе пралятаюць аблокі, птушкі, трамваі,
караблі з Вэстэрплятэ і электрычкі на Мальбарк.

Вучыш замежныя мовы па караоке.
Джаз-фэстывалі чаек на молах і пірсах.
Кожная дзеўка — анёл, найчасьцей — каравокі.
На языках без касьцей сустракаецца пірсінг.

У плянэтарыі сьпіш пад коўдрай Вялікай
Мядзьведзіцы,
і загараеш пад хмарным небам на злосьць
прагнозам;
істота, якая здалёк чырвонаю скураю сьвеціцца,
выкладчык Ліцэю, паэт з абгарэлым носам.

А потым дашлеш па пошце альбо напішаш у
посьце
верш-апраўданьне, сам сабе абаронца,
што ты тут паводзіўся, як і належыць госьцю —
не згараў на буйках і не заплываў за сонца.

***
шчасьце й дажджы табе выпадаюць блёкамі
шэрыя й белыя плямы ў неба на твары
нібы калейдаскоп чаруе аблокамі
хмары аблокі хмары аблокі хмары

неба ў вадзе а вада ў суцэльным гудзеньні
хутка на кожным пальцы ног па маскіту
калейдаскоп прамок і мяняе адзеньне
шэры і белы і шэры колер блакіту

***
сонца схавала праменьне ў тваім настроі
ў небе цукровая вата і польскія лёды
ты ўмыкнула плэер цяпер нас трое
і я ня сплю пад дыктоўку тваёй мэлёдыі

і я трымаю ў вушах крыху тваёй музыкі
і я трымаю ў грудзях крыху тваёго паветра
але мае фантазіі зашпіленыя на ўсе гузікі
але тваё мроі й на пляжы ня ходзяць без швэдра

адлегласьць у сорак мэлёдыяў — не з малых
і мы да самай мяжы будзем мець занятак
каштуючы адно аднаго на слых
спалучаныя сасуды пад знакам сіямскіх блізьнятак

### сто пудоў адзіноты

*I just called to say «I love you».*
*Stevie Wonder*

сто пудоў адзіноты больш чым пацягне ліфт
за акном то зьліва то пролівень то залева
ходзяць думкі налева і ўлева схіляюць шрыфт
і пішу пачынаючы з рыфмаў справа налева
сёньня дзень і ноч пагадзіліся на нічыю
і ніякай нябеснай манны максімум манка
а назаўтра вечар з раніцы зуб даю
гэта восень будзе вільготнай як німфаманка

гэта восень будзе вільготнаю сто пудоў
нібы горла не прасыхацьме да небакраю
але будзь я нават нэграм пахілых гадоў
я вазьму тэлефон і скажу што цябе кахаю

***
ты ўмееш гадаць без кавы — досьць
цынамону й гвазьдзікі
арыентуесься ў музыцы і паралельных
сусьветах
юная нібы яшчэ не запалены маладзік і
старая як вечнасьць таму пагашаны ў небе ветах
заўсёдніца ў кожным касьцёле сынагозе і кірсе
гатовая ехаць стопам а потым вяртацца па шпалах
а потым выйсьці на подыюм хістаючыся як на пірсе
такая лёгкая што здаецца змые любы фатаспалах

покуль мэтро развозіць па навагоднім аргане
покуль мяне развозіць — праўду мяшаў з маною
ты засынаеш у недасяжнай дзявочай фата-маргане
і прачынаесься ў ложку побач са мною

### Разьвітаньне. Паэма

Выкінула ў акно ўсю яго паклажу:
«Не прыходзь сюды больш — загрыміш у турму!»
«Усе мы пад Богам ходзім», — хлопец ёй кажа.
«Усе вы пад бокам ходзіце», — кажа яна яму.

***
Прагартаўшы жыцьцё настолькі, што ўжо закладку
укладаеш ня між астатніх, а між прачытаных
старонак,
забываеш амаль пра ўсё, што было спачатку,
і гартаеш спачатку — і раптам бачыш: пячатку
на старонцы сямнаццаць пакінуў чыйсьці
пярсьцёнак.

І глядзяць чырвоныя вочы на паляроідзе:
пераходны ўзрост — на крызіс сярэдняга веку.
І гаворыш сабе, што ўрэшце і гэта пройдзе,
і вяртаеш кнігу ў школьную бібліятэку.

**АДАМ ГЛЁБУС**



## Сучасьнікі

### Сыс і сорам

У прысутнасьці Анатоля Сыса адчуваўся разьліты ў паветры сорам. Здавалася б, мусіў прысутнічаць гонар, такі крышку нахабны, зь лёгкім водарам гарэлкі, вайскова-мужчынскі гонар… Не! Саладкаваты, вінны, крыху клейкі дух сораму выпарваўся з Сыса. Сорам за яго, сорам за сябе, сорам за нашу беларушчыну… Каб пазбыцца гэтага свайго сораму, Сыс і кнігу сваю апошнюю называў «Ягамосьць», толькі выйшла тая кніга адно ў зборніку, а зборнік той Анатоль пасаромеўся назваць «Ягамосьць» і назваў «Сыс».

### Дубавец і Вострая брама

Калі Дубаўцу сказаць, што ягоная беларушчына не зусім беларушчына, ён не зразумее. Растлумачу… Беларушчына Дубаўца «благоприобретенная», а не «прирожденная». Абедзьве беларушчыны добра, а ня блага. Абедзьве маюць права на існаваньне. «Благоприобретенная» беларушчына ў наш час нават больш папулярная і запатрабаваная, бо яна больш амэрыканская, больш савецкая, больш дзяржавастваральная, больш прагматычная, больш канструктыўная… Толькі ў тым паэтычным нацыяналізьме, які часам ідэалізуе Дубавец, прыроджаная беларушчына першасная, а набытая — другасная. Праз гэтую супярэчнасьць Дубавец ня можа рухацца паступальна, а бяжыць па коле і выпадае з актуалій. Каб рухацца паступальна, Дубаўцу варта было адмовіцца ад рамантызацыі нацыяналістычных сьветапоглядаў, дзе антрапалёгія, зь яе голасам крыві, дамінуе. Трэба было паглядзець на сьвятую Вострую браму з боку Эўропы, з боку Вільні, а ня з боку Шумску ды Кемялішак. А кніга Сяргея Дубаўца «Вострая брама» — гэта погляд на сьвятыні з дупла сухадрэвіны.

### Дзятліковіч і рок-н-рол

Калі музычны журналіст піша пра гурт накшталт «N.R.M.», ён у падтэксьце пакідае сваю шчырую любоў да «REM». Такі і хваліць «N.R.M.», і аналізуе іх творчасьць, і падтрымку рэклямную арганізоўвае, але любві сапраўднай не схаваеш, любоў да «REM» тырчыць як цьвік у боце. У кнізе Дзятліковіча «Іх «Мроя». Іх «N.R.M.» любві да «REM» няма. Нават дзіўна робіцца. Ну хіба можна так любіць «Мрою»? Ну хіба можна так захапляцца «N.R.M»? Можна! Кніга — доказ гэтай любві.

# Знакі прыпынку



**УЛАДЗІМЕР НЯКЛЯЕЎ**

* * *

Паўліна Мядзёлка паказвае на допыце ў ГПУ (5.08.1930).

«Кола людзей, зь якім я сутыкалася ў пэрыяд 1925—1926 г., пад канец 1926 г. разьбівалася на дзьве групы (пазьней была і трэцяя група). Да першай групы, якую *жартам* называлі беларускай арыстакратыяй, адносіліся Доўнар-Запольскі, Краскоўскія, Ермаковічы, Цьвікевічы, Аляксандар і Іван Смолічы. Другая група, якая зь першай падтрымлівала толькі ветлівае знаёмства, — Некрашэвічы, Купала, Грамыкі, Жылуновічы, Коласы, пазьней Ластоўскія.

У Купалы бывалі пісьменьнікі-«полымеўцы». Заходзілі іншым разам (не асабліва часта) Прышчэпаў і Чарот, прыходзілі туды, галоўным чынам, піць. У пісьменьніцкім асяродзьдзі, асабліва моладзі, квітнела ў той час багемшчына. З Купалам і яго жонкай я сябравала з 1909 г. Нашы ўзаемаадносіны амаль сваяцкія. Ні ад Купалы, ні ад каго б там ні было я ня чула пра існаваньне якой-небудзь арганізацыі. Наадварот, часта чула размовы пра тое, што беларусы ня ўмеюць арганізавана выступаць у абарону сваіх нацыянальных інтарэсаў, што няма яднаньня, кожны дзейнічае па-свойму, а таму і б'юць іх па аднаму… Ставіліся ў прыклад украінцы, якія ўмеюць адстойваць свае нацыянальна-культурныя інтарэсы…»

Прамінула амаль стагодзьдзе — і што зьмянілася? Як ня ўмелі, так і ня ўмеюць беларусы арганізавацца ў абарону сваіх нацыянальных інтарэсаў, і б'юць іх па аднаму — і ставяцца ў прыклад украінцы.

* * *

Ён ненавідзеў усіх: найбольш гэтых, але ня менш і тых.

* * *

Інтэлектуал да маргінала адносіцца з пагардаю, з надуманым пачуцьцём, а маргінал да інтэлектуала — зь нянавісьцю. Маргінал натуральны — і пачуцьцё ў яго натуральнае.

* * *

Адна з самых небясьпечных хвароб — былая веліч.

# На вучобу ў Амэрыку

З 20 найлепшых ВНУ сьвету 17 — амэрыканскія. 70% усіх сучасных ляўрэатаў Нобэлеўскай прэміі працуюць у ВНУ ЗША. Як атрымаць амэрыканскую адукацыю? На ўласным досьведзе раіць **Андрусь Храпавіцкі**.




**Аўтар на фоне бібліятэкі Ўілсана ўнівэрсытэту Паўночнай Караліны. Тут, як і ўсюды ва ўнівэрсытэце, бясплатны бесправадны Інтэрнэт для студэнтаў. Шмат хто браўзіць сайты ці піша лісты, адпачываючы на лужку.**

### Справа ня танная

Са ста найлепшых унівэрсытэтаў сьвету большасьць — амэрыканскія. У сьвеце таксама асабліва каціруюцца амэрыканскія асьпіранцкія праграмы. Менавіта ў ЗША нарадзілася ступень МА (магістар гуманітарных навук).

Каб паступіць у амэрыканскі ўнівэрсытэт, трэба на добрым узроўні валодаць ангельскай мовай, якую вам давядзецца здаваць яшчэ ў Беларусі. Па-другое, адукацыя тут не бясплатная, а кошт яе можа складаць і 50 тыс. даляраў у год (у залежнасьці ад спэцыяльнасьці, унівэрсытэту і праграмы). Больш падрабязна пра цэны, праграмы і стыпэндыі можна дазнацца на сайце vco-edusa.net, які мае на мэце дапамаць жыхарам Беларусі ды суседніх краінаў, якія хочуць вучыцца ў ЗША.

Па-трэцяе, за кватэру давядзецца плаціць даляраў 300—500, але месца ў інтэрнаце ва ўнівэрсытэцкім гарадку будзе каштаваць яшчэ даражэй. І калі нехта зь Беларусі думае, што я шыкую, здымаючы на пару з хлопцам трохпакаёвую кватэру, ён памыляецца. Апроч эканоміі, жыцьцё на кватэры дае больш свабоды, больш рэальнай Амэрыкі, менш тлуму.

### Шукайце стыпэндыю

Зарабіць на навуку ў ЗША на радзіме цяжка, таму найбольш аптымальны варыянт — пошук стыпэндыі. На ступень бакаляўра яе атрымаць цяжэй, на навучаньне на вышэйшым узроўні (магістар, доктар) — прасьцей. Але ў гэтым выпадку трэба ўжо мець вышэйшую адукацыю й прадэманстраваць дастатковыя веды ў сваёй галіне.

Я выйграў амэрыканскую ўрадавую стыпэндыю імя сэнатара Маскі. Дзеля гэтага трэба было здаваць экзамэны TOEFL, GRE, праходзіць гутарку, пісаць некалькі эсэ. На першым этапе мне таксама давялося сабраць вялікую колькасьць дакумэнтаў і рэкамэндацый.

Я трапіў ва ўнівэрсытэт Паўночнай Караліны ў Чэпэл-Гіле. Школа журналістыкі тут лічыцца адной з найлепшых у краіне. Тут жа знаходзіцца і знакамітая бізнэс-школа, а таксама юрыдычная школа, дзе чытае лекцыі Джон Эдвардз, што балятаваўся ў віцэ-прэзыдэнты разам з Керы.

Стыпэндыя сэнатара Маскі — вядомая й прэстыжная праграма ў краінах былога Саюзу. Сярод яе знакамітых атрымальнікаў — прэзыдэнт Грузіі Міхаіл Саакашвілі. Праграма магістарскай адукацыі пакрывае ўсе асноўныя выдаткі, улучна з аплатай навучаньня і мэдстрахоўкай. Адмініструе яе IREX, некалькі год таму выкінуты зь Беларусі ўладамі. Тым ня менш, праграма працягвае існаваць, а новы конкурс традыцыйна абвесьцяць увосень. Умовы можна паглядзець на сайце амбасады ЗША ў Беларусі. Ёсьць і іншыя праграмы стыпэндый, але калі вас цікавіць нейкі канкрэтны ўнівэрсытэт, мае сэнс шукаць стыпэндыі на афіцыйным сайце навучальнай установы.

Ёсьць яшчэ адзін варыянт. Пасьля паступленьня ў асьпірантуру можна атрымаць працу памочніка выкладчыка ці памочніка ў дасьледаваньнях. Вам давядзецца правяраць тэсты, пісьмовыя заданьні студэнтаў, капіяваць літаратуру для прафэсара ці займацца дасьледчай дзейнасьцю ў лябараторыі. Такім чынам, працуючы на ўнівэрсытэт, у большасьці выпадкаў вы вызваляецеся ад платы за вучобу, а таксама маеце неблагую капейку на жыцьцё. Такі варыянт актуальны для тых, хто хоча атрымаць PhD — ступень доктара філязофіі.

### Валодаць мовай

Каб паступіць у амэрыканскі ўнівэрсытэт, вам найперш неабходна давесьці, што вы валодаеце ангельскай мовай. TOEFL — тэст, прыдуманы менавіта для таго.

Існуюць тры варыянты іспыту — пісьмовы, кампутаровы і анлайнавы. Зь нядаўняга часу можна здаваць іспыт у Інтэрнэце, але спрабаваць гэта варта, толькі калі маеце неблагую і стабільную хуткасьць злучэньня. І памятайце: тэст не бясплатны. Пазнаёміцца з патрабаваньнямі, а таксама папрактыкавацца можна на афіцыйным сайце — toefl.org. Кошт іспыту — 140 даляраў.

Для атрыманьня ступені бакаляўра ў Канадзе ці ЗША вам давядзецца таксама здаваць SAT — Scholastic Aptitude Test — тэст на здольнасьць да навучаньня, які ацэньвае агульныя веды па літаратуры, матэматыцы і гісторыі.

SAT бывае двух відаў — праверка агульных здольнасьцяў мысьленьня (SAT I, reasoning test) і праверка ведаў па канкрэтным прадмеце (SAT II, subject test). На тэст SAT I даецца тры гадзіны, на SAT II — адна.

Вынікі вам паведамяць недзе празь дзён дзесяць пасьля здачы. ETS, Служба адукацыйных тэстаў — няўрадавая арганізацыя, якая адмініструе ўсе тэсты, што апісваюцца ў гэтым артыкуле, — можа сама даслаць вашы вынікі ва ўнівэрсытэты, куды жадаеце паступіць. Праводзіцца тэст у траўні—чэрвені. Рэгістравацца трэба да сакавіка. Іспыт каштуе 38 даляраў.

### GRE і GMAT

Калі вы зьбіраецеся паступаць у асьпірантуру, замест SAT вам давядзецца здаваць асьпіранцкі іспыт GRE (для гуманітарыяў) ці GMAT (для МВА), дзе правяраецца лягічнае мысьленьне, разуменьне мовы, а таксама матэматычныя здольнасьці. Ня толькі беларусам, але і амэрыканцам цяжка даецца моўная частка тэсту, бо правярае яна разуменьне акадэмічнае лексыкі, якая ў гутарковым маўленьні сустракаецца вельмі рэдка.

Здаючы GRE, таксама давядзецца пісаць два эсэ. Раю — сачыце за структурай, хай ваш твор будзе ня надта доўгі, але каб усё было лягічна. Каштуе тэст 120 даляраў, GMAT — 195 даляраў.

Але не лічыце, што ўсё гэта немагчыма. Галоўнае — паставіць перад сабой мэту. Для пачатку раю падысьці ў «Амэрыканскі цэнтар», што знаходзіцца на сталічным праспэкце Скарыны (Незалежнасьці), 169 — «Бізнэс-цэнтар «XXI ст.» паўднёвае крыло, офіс 512. Там ёсьць неблагая бібліятэка на тэму адукацыі ў Амэрыцы, дзе ёсьць і дапаможная літаратура па здачы вышэйпералічаных іспытаў.

### Ці варта спрабаваць?

Калі вы жадаеце атрымаць незабыўны досьвед жыцьця за мяжой, павысіць веды, завесьці новых сяброў, а таксама акунуцца ў чароўны сьвет амэрыканскае ўнівэрсытэцкае адукацыі — адназначна трэба спрабаваць паступаць. Узважце ўсе плюсы і мінусы, ацаніце рэальна свае здольнасьці і, галоўнае, рыхтуйцеся. Паступленьне ў амэрыканскую ВНУ можа заняць год, два, нават тры. Але амэрыканскі дыплём дае выдатныя шанцы на працаўладкаваньне як у Беларусі, так і практычна ў любой краіне. Студэнтам быць цікава. Тым больш студэнтам у Амэрыцы.

## СПОРТ СЬЦІСЛА

### Заданьне на вясну

У панядзелак, 26 верасьня, прайшло лёсаваньне чвэрцьфіналаў Кубку Беларусі па футболе. Матчы 1/8 фіналу прайшлі 21 верасьня, у прыватнасьці, сёлетні ўладальнік Кубку, менскі МТЗ-РІПА, прайграў салігорскаму «Шахтару». Такім чынам, у наступным красавіку згуляюць: «Гомель» — «Хімік» (Сьветлагорск, першая ліга), «Дынама» (Менск) — «Шахтар» (Салігорск), «Дынама» (Берасьце) — БАТЭ (Барысаў), «Зорка-БДУ» — «Баранавічы» (першая ліга). Пераможцы вызначацца па выніках дзьвюх гульняў.

### Прабіліся са скрыпам

Мужчынская тэнісная зборная зь цяжкасьцю вярнулася ў асноўную групу Кубку Дэвіса. 23—25 верасьня ў Таронта (Канада) Максім Мірны і Ўладзімер Ваўчкоў выйгралі ў зборнай Канады зь лікам 3:2, саступаючы пасьля двух дзён — 1:2. Перамога дала магчымасьць падняцца на дзявятае месца ў агульным рэйтынгу. Супернік беларусаў па 1/8 фіналу, што пройдзе будучай зімой, вызначыцца ў найбліжэйшы час. А сёлета фінал Кубку Дэвіса будзе славянскім: за галоўны прыз пазмагаюцца зборныя Харватыі і Славаччыны.

### Разгром у Швэцыі

Жаночая зборная Беларусі па футболе прайграла ў сваім трэцім матчы адборачнага турніру чэмпіянату сьвету лідэрам сваёй групы зборнай Швэцыі зь лікам 0:6. Пасьля трох гульняў беларускі займаюць у сваёй кваліфікацыйнай групе перадапошняе пятае месца, маючы толькі адзін бал. Наступная гульня супраць ісьляндак 6 траўня ў Менску. Суайчыньніцы Б'ёрк пакуль займаюць у нашай групе другое месца.

**АР, «Football.by»**

ІНФАРМАТАР

# пральні


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Мэханічныя

**Бялізна**
Кнорына, 55
265–37–59, 283–04–39

**Дары**
Радыяльная, 42
245–14–24

**Лондрыс Лейт**
Кіжаватава, 58
212–96–21, 278–03–74

**Унівэст**
Прытыцкага, 56
253–62–19

**Фабэкс**
Радыяльная, 15
245–13–34

**Чайка**
Кнорына, 55
265–12–58

**№4**
Бельскага, 60
251–71–21

**№38**
Убарэвіча, 73
240–35 33

**№21**
Шышкіна, 24а
240–70–73

## Самаабслугоўваньня

**Беллоск**
В.Харужай, 33а
234–25–19

**Блакітная хваля**
Паўночны зав., 17
200–13–93

**Аладушка**
Дзяржынскага, 71
270–54–92

**№12**
Адаеўскага, 103а
251–73–00

**№13**
Кульман, 5
232–50–11

**№37**
Малініна, 28а
248–45–70

**№40**
Пажарскага, 27
242–04–22

**Чысьцюля**
— Якубоўскага, 70
258–19–17
— Авангардная, 61/1
235–20–11
— Берасьцянская, 1
236–70–42
— Кабушкіна, 64
240–80–12
— Карбышава, 48/1
263–30–42
— Маякоўскага, 1
226–18–98
— Маякоўскага, 115а
221–36–23
— Маскоўская, 20
222–20–71
— Смаленская, 25
236–73–53
— Сонечная, 31а
221–25–24
— Сухараўская, 26
215–77–25
— Ташкенцкая, 7
241–75–55
— Тухачэўскага, 9
245–04–59

КАІСА

# Лідзкія ўражаньні

Паўстагодзьдзя таму чэмпіянат Ліды па шахматах выйграў першакатэгорнік Вацлаў Гебельт (1913—1999). Пазьней ён зрабіўся славутым кампазытарам-праблемістам ды ачоліў гарадзкую шахматную фэдэрацыю.

Завітаўшы ў шахматна-шашачны клюб у Лідзе, што месьціцца ў пакойчыку пры ўпраўленьні спорту і турызму гарвыканкаму, я напаткаў тузін аматараў бліцу. Гуляюць яны на ўзроўні другога-першага разраду. Турніры ў Лідзе ладзяцца рэдка, апошняе першынство гораду прайшло два гады таму, хто перамог, ня памятаюць. Наведвальнікі клюбу куды больш ахвотна расказваюць пра ўраджэнца гораду Аляксея Чарнушэвіча. Заваяваўшы званьне міжнароднага майстра, ён зьехаў у Францыю навучаць шахматам францускіх дзяцей. Майстроў па вочнай гульні ў горадзе амаль не засталося.

У клюбе вісяць партрэты чэмпіёнаў сьвету, на століку — шахматныя часопісы эпохі Гебельта. Утульна, але сумнавата. Міхал, дзяжурны па шашках, даволі хутка выганяе нас вонкі — клюб адкрываецца а пятай вечара, а зачыняецца а восьмай. Трэнэр Уладзімер Левы, які вядзе групы ў дзіцяча-юнацкім клюбе, наракае на канкурэнтаў: «Як стварылі кампутарныя клюбы — пачаўся адсеў. Школьнікам больш цікавыя «стралялкі».

Веды пра шахматы пашыраюцца праз раённую газэту. Праўда, сёлета аддзел хацелі прыкрыць, але дапамог чытач-інвалід, патэлефанаваў старшыні райвыканкаму, што хоча надалей чытаць пра шахматы. Матэрыялы ў «Лідскай газеце» прысьвечаны найперш кампазыцыі: Алесь Сымановіч лічыць яе самастойнай галіной мастацтва. А вось для 39-гадовага бульбавода, былога дэсантніка Віктара Воўчака зь вёскі Касоўшчына — гэта хобі. Воўчак, шматразовы чэмпіён краіны ў складаньні задач, выпусьціў кнігу па кампазыцыі, цяпер рыхтуе другую.

У горадзе працуюць некалькі прафэсійных трэнэраў: Юры Дайлідка, кандыдат у майстры Сяргей Банцэвіч. Але мне здалося, што тутэйшыя аматары шахмат аддаюць перавагу шляху Гебельта—Сымановіча—Воўчака. Наўрад ці ў Лідзе разбудуецца ўласная школа, але кампазыцыя як сродак выхаваньня эстэтычных пачуцьцяў пераважыве любыя нягоды.

**Вольф Рубінчык**



### Рашыце задачу

А.Сымановіч. Мат за два хады. Публікуецца ўпершыню.

**Адказ:** 1. Тс5! «Добры першы ход, прысутнічаюць разнастайныя тактычныя элементы — блякаваньне поля, прыцягненьне, адцягненьне, перакрыцьцё» (В.Жылко).

НАШЫ ШАШКІ

# Дзікае паляваньне

Давыд Саргін (1859—1921) вядомы як гісторык шахмат і шашак. У кнізе пра старажытнасьць гульняў (1915 г.) ён вылучыў гіпотэзу аб тым, што шахматы былі завезены ва Ўсходнюю Эўропу з Ірану. Ён жа абгрунтаваў параўнаньне забавы рымскіх легіянэраў латрункулей, альбо латронаў, з расейскімі шашкамі. Датуль перакладчыкі Сэнэкі памылкова атаясамлівалі латроны з шахматамі.

Складаў Д.Саргін і файныя шашачныя кампазыцыі. У пададзеным ніжэй этюдзе ў белых пэўная перавага (дзьве дамкі), але дамка чорных займае галоўную дарогу. Нічыя? Аднак наяўнасьць дзьвюх шашак, асабліва той, што на h6, шкодзіць чорным: з такімі сябрамі і ворагаў ня трэба…

Упершыню этуд быў апублікаваны ў расейскім часопісе «Конская охота» ў 1896 годзе. Белыя пачынаюць і выйграюць.



**Адказ:** 1. h4-g5 a7-b6 (калі 1…a1-h8, то 2. f8-c5 h8-a1 3. c5-f2 a1-h8 4. f2-g1 h8-a1 5. g1-h2 a7-b6 6. h2-g1 b6-a5 7. g1-c5 a1-h8 8. c5-b4! a5:c3 9. f4-h2) 2. f8-b4 b6-a5 (на 2…a1-h8 было б 3. b4-c5 і 4. f4-h2) 3. b4-a3 a1-h8 4. a3-b4! з выйгрышам.

ВАРТА БАЧЫЦЬ

### Пятніца, 30 верасьня

**НТВ, 22.45**

«Ніколі не кажы «Ніколі».

ЗША, 1983, рэж. Ірвін Кіршнэр.

Баявік.

Злачынец (Клаўс Марыя Брандаўэр), які марыць пра сусьветнае панаваньне, крадзе з ваеннай базы ЗША ядзерныя ракеты й шантажуе людзтва. На шляху нягодніка становіцца непераможны агент 007 — Джэймз Бонд (Шон Конэры).

**СТВ, 23.25**

«Акторы».

Францыя, 2000, рэж.Бэртран Бліе.

Драма.

На здымках чарговага фільму, на якім акторы граюць саміх сябе, Мішэль Сэро зьбіраецца папярэдзіць пра змову, але яго ня слухаюць: Бэльмандо напіваецца, Дэпард'е ганяе на матацыкле, Дэлён у дэпрэсіі.

Што рэальнасьць, а што кіно? Б.Бліе, сатырычны бытаапісальнік буржуазнага грамадзтва, прапануе нечаканы ход.

Дэлён у ролі Алена Дэлёна, Дэпард'ё ў ролі Дэпард'ё.

### Субота, 1 кастрычніка

**СТВ, 23.15**

«Экспэрымэнт»

Нямеччына, 2001, рэж.Олівэр Гіршбігель.

Страшны й шокавы фільм О.Гіршбігеля («Бункер») пра бездані чалавечае псыхікі, пра ўладу й рабства. У навуковым экспэрымэнце дванаццаць звычайных людзей пагаджаюцца сыграць ролі зьняволеных, а восем чалавек — ролі нагляднікаў. Усе мусяць падпарадкоўвацца турэмным правілам. Але экспэрымэнт выходзіць з-пад кантролю: наглядчікі катуюць вязьняў, а ў турме распачынаецца бунт.

Морыц Бляйбтрой (іграў у карціне галоўнага героя) прызнаны найлепшым эўрапейскім акторам году паводле апытаньняў СМІ.

Экспэрымэнт, паказаны ў карціне, сапраўды меў месца.


WWW.MOVIEWEB.COM

### Нядзеля, 2 кастрычніка

**АНТ, 21.05**

«Авіятар».

ЗША—Японія—Нямеччына, 2004, рэж.Марцін Скарсэзэ.

Біяграфічная драма.

Міліярдэр Говард Г'юз здымаў неймавернае відовішчнае кіно, ствараў самалёты й быў авіятарам. Але ў яго былі свае пакуты й комплексы. Узорна-псыхааналітычны гімн амэрыканскаму прадпрымальніцтву, пастаўлены Марцінам Скарсэзэ й разыграны Леанарда ды Капрыё, Кейт Бланшэт, Кейт Бэкінсэйл.

**БТ, 22.30**

«Эфэкт матылька».

ЗША, 2004, рэж.Эрык Брэс, Дж.Мэкі Грубэр.

Фантастычны трылер, трызьненьнік.

Эван (Эштан Катчэр) атрымлівае магчымасьць вандраваць у мінулае з дапамогай свайго дзёньніка і ўспамінаў. Дарослы вяртаецца ў цела дзіцяці, але спробы зьмяніць мінулае небясьпечныя для чалавечага лёсу.

Прафэсійная рэжысура, ліхаманкава-трымценны сцэнар, неблагая акторская зладжанасьць. Адна з найлепшых роляў Эштана Катчэра і някепская ігра Эмі Смарт.

**«Лад», 22.30**

«Дванаццатая ноч, або Чаго пажадаеце»

Вялікабрытанія—Ірляндыя—ЗША, 1996, рэж.Трэвар Нан.

Камэдыя паводле п'есы У.Шэкспіра.

Слынная гісторыя пра разлучаных брата й сястру, з размахам пастаўленая рэжысэрам Трэварам Нанам і акторамі Нікаласам Фэрэлам, Бэнам Кінгсьлі, Гэленай Бонэм-Картэр.

**Андрэй Расінскі**

## ФЭСТЫВАЛЬ

**З 30 верасьня па 4 кастрычніка** ў Маладэчне ў памяшканьні Менскага абласнога драматычнага тэатру (вул.Чкалава, 7) пройдзе IV Міжнародны фэстываль монаспэктакляў.

**30** (пт), 16.00 — цырымонія адкрыцьця фэстывалю.

**30** (пт), 17.00 — «Сіні аўтамабіль» (**Менскі абласны драматычны тэатар**).

**30** (пт), 19.00 — «Сьцяна» (**«Актор»**, Кіеў).

**1** (сб) , 12.00 — «А сёмай раніцы — усё ў парадку» (**Латыскі нацыянальны драматычны тэатар**, Рыга).

**1** (сб), 19.00 — «Кантрабас» (**«Шаліях»,** Кішынёў).

**2** (ндз), 12.00 — «Віленскія мроі» (**Беларускі паэтычны тэатар «Зьніч»**).

**2** (ндз), 16.00 — «Млечны шлях» (**Мазырскі драматычны тэатар імя Мележа**).

**2** (ндз), 19.30 — «Калі ты чалавек» (**тэатар Ду Грутлі**, Жэнэва).

**3** (пн), 12.00 — «Мухі» (**Тэатар аднаго актора, Морж**).

**3** (пн), 16.00 — «Пугачоў» (**Нацыянальны акадэмічны тэатар імя М.Горкага**).

**3** (пн), 20.00 — «Каханак» (**Літоўскі нацыянальны драматычны тэатар**, Вільня).

**4** (аўт), 12.00 — «Запіскі вар'ята» (**сумесны праект Бэрлін—Менск**).

**4** (аўт), 16.00 — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях» (**Купалаўскі тэатар**, Менск).

**4** (аўт), 18.00 — цырымонія закрыцьця фэстывалю з праглядам «Камэдыі».

## СУСТРЭЧЫ

**6—7 кастрычніка** ў Музэі Багдановіча (Траецкае прадмесьце) у Менску адбудуцца «восеньскія сустрэчы».

**6 кастрычніка** — зь Людмілай Паўлікавай-Хейдаравай.



**7-га** — з Алесем Камоцкім.

Пачатак а 19-й. Уваход вольны.

**1 кастрычніка** а 14-й гадзіне адбудзецца імпрэза, прысьвечаная 400-годзьдзю бітвы пад Кірхгольмам. Выступоўцы: прафэсар Анатоль Грыцкевіч, гісторык Алесь Казакоў, бард Зьміцер Сідаровіч. Даведкі па тэл.: 755-03-70.

## ВЫСТАВЫ

**Часу наўздагон**

У Сэнатарскай залі каралеўскага Новага замку ў Горадні адкрылася выстава «Ілюзія часу» — супольны праект сучасных мастакоў Беларусі, Нямеччыны і Францыі.

Фатаграфіка нараджэнца Наваградку Багдана Канопкі, цяпер жыхара Францыі, заваражвае недасказанасьцю. Пазачасавыя, дынамічныя і стылёвыя вобразы Вольгі Сазыкінай жывуць уласным жыцьцём з вытанчанай ironіяй у дачыненьні да штодзённай рэчаіснасьці. Віртуозная, тонкая і хуткая лінія алоўка Юрыя Алісевіча — практычна без штрыхоўкі — стварае прастору, што існуе ў канкрэтных часавых каардынатах. Мастацтвазнавец Міхал Баразна выставіў фататворы «Ілюзіі Менскага мора» — лякалічныя формай і глыбінёй інтэлекту- альнага паглыбленьня ў тэму.

Час як містычная катэгорыя заўжды быў аб'ектам мастацкага асэнсаваньня, і чым далей ягоны гістарычны бег, тым больш рафінаваным, паглыбленым і зьменлівым становіцца яго адлюстраваньне ў мастацтве.

**Натальля Маліноўская, Горадня**

**Goethe-Institut Minsk**

**1 кастрычніка** ў Інстытуце імя Гётэ (вул.Фрунзэ, 5) — Дзень адчыненых дзьвярэй. У праграме — экскурсіі па бібліятэцы і інфармацыйным цэнтры, выстава кніг і аўдыёвідэаматэрыялаў «Шылер-2005», канцэрт джаз-гурту «Atava» (12.00—14.00), паказ фільму «Гуд бай, Ленін!» (пачатак а 14-й), прэзэнтацыя франка-нямецкага праекту «Мэдыя-аўтобус», фотавыстава «Сусьветная мова футболу». Уваход вольны.



**Чурлёніс у Ваньковічаў**

**30 верасьня а 16.00** ў доме Ваньковічаў (Інтэрнацыянальная, 33а) адбудзецца адкрыцьцё выставы М.Чурлёніса «Стварэньне сьвета сьвятла і гармоніі». Працуе да 1 лістапада.

**Беларускі плякат сёньня**

У аддзеле мастацтва Нацыянальнай бібліятэкі (вул.Чырвонаармейская, 9) **да 31 кастрычніка** працуе выстава «Беларускі плякат сёньня».

**Лялечнае каралеўства**

У Нацыянальным мастацкім музэі **да 17 кастрычніка** — выстава «Лялечнае каралеўства».

**Менск на аматарскіх фатаграфіях 1950—1960-х гадоў.**

**Да 9 кастрычніка** ў галерэі візуальных мастацтваў «Nova» (вул.Веры Харужай, 16) пройдзе выстава аматарскіх фатаздымкаў Уладзімера Валодынскага. Уваход вольны.

**Літоўская акварэль у Полацку**

У полацкай Мастацкай галерэі адкрылася выстава літоўскай акварэлі. У экспазыцыі працы 17 творцаў — сяброў каўнаскага аддзяленьня Саюзу мастакоў Літвы.

## ПТУШКІ



**1—2 кастрычніка** ва ўсім сьвеце пройдуць Міжнародныя дні назіраньня за птушкамі. У Менску паназіраць за птушкамі з дапамогай палявых бінокляў і моцных падзорных трубаў можна будзе ў Цэнтральным батанічным садзе з 11 да 17 гадзін 2 кастрычніка (нядзеля).

Даведацца пра тое, дзе будуць адбывацца арганізаваныя назіраньні за птушкамі ў вашым рэгіёне, можна, пазваніўшы ў офіс «Аховы птушак Беларусі» па тэлефоне 8-017-263-01-30.

## ТЭАТРЫ

**Балет**

**4** (аўт) — «Жызэль».

**8** (сб) — «Дон Кіхот».

**Купалаўскі тэатар**

**30** (пт) — «Таполевая завея».

**1** (сб) — «Ромул Вялікі».

**2** (ндз) — «Паўлінка».

**2** (ндз) — «Дзіўная місіс Сэвідж».

**Малая сцэна**

**30** (пт) — «Дзікае паляваньне караля Стаха».

**Музычны тэатар**

**29** (чц), **30** (пт) — «Баядэра».

**1** (сб) — «Вясёлая ўдава».

**2** (ндз) — «Ноч у Вэнэцыі».

**Тэатар Горкага**

**29** (чц) — «Ад'ютант-ша Яго Вялікасьці».

**30** (пт), **5** (ср) — «Суцяшальнік удоў».

**1** (сб) — «На Залатым возеры».

**2** (ндз) — «Адзіны спадчыньнік».

**4** (аўт) — «Дэтэктар хлусьні».

**8** (сб), **9** (ндз) — «Ніначка».

**Тэатар лялек**

**6** (чц) — «Чайка. Спроба прачытаньня».

## СПОРТ

**Футбол. Чэмпіянат Беларусі. 22 тур**

**30 верасьня (пятніца)**

МТЗ-РІПА (Менск) — «Дынама» (Берасьце).

**1 кастрычніка (субота)**

БАТЭ — «Лякаматыў» (Менск).

«Славія» (Мазыр) — «Нёман» (Горадня).

«Дняпро-Трансмаш» (Магілёў) — «Дарыда» (Ждановічы).

«Шахтар» (Салігорск) — «Нафтан» (Навапалацак)

«Гомель» — «Зорка-БДУ» (Менск).

«Дынама» (Менск) — «Тарпэда» (Жодзіна).

## КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**Графіці** (758-40-54)

**6** (чц), 20.00 — канцэрт Аляксандра Баля.

**Madison** (219-00-10)

**29** (чц), 22.00 — «Lady's Thursday».

**30** (пт), 23.00 — dj Nice.

**1** (сб), 22.00 — dj Nice.

**2** (ндз), 23.00 — «Staff party».

**Bronx** (288-10-61, GSM «Velcom»: 103 і 105)

**29** (чц), 23.00 — dj Kudesnikoff.

**30** (пт), 22.00 — жывая музыка: «Atava» / dj Mitya, dj Dust.

**1** (сб), 23.00 — «St. Petersburg Sessions #2»: dj Phunky D (Санкт-Пецярбург).

**2** (ндз), 17.00 — нядзельны кінасэанс.

**Белая вежа** (284-69-22, 239-16-00)

**29** (чц), 23.00 — «White Tower»: dj Top, dj Bergamo.

**30** (пт), 23.00 —«Штурмуючы нябёсы»: dj Конь,dj Юма, dj Юма Юніёр

**1** (сб), 1.00 — dj Alex.

**2** (ндз), 23.00 — жывая музыка: «Acoustic Band» / dj Alex, dj Archi.

## КІНО Ў МЕНСКУ

**«Аўрора»** (253-33-60)

«Браты Грым» (прэм'ера): **30** (пт) 16.00, 18.30, 21.00; **1, 2** (сб, ндз) 13.30 (іл), 16.00, 18.30, 21.00.

«Перакладчыца»: **30** (пт) 16.30 (іл); **1, 2** (сб, ндз) 14.30 (іл).

«Жах Амітывілю»***: **30** (пт) 19.00; **1, 2** (сб, ндз) 17.00, 19.00

«Мужчына па выкліку-2»***: **30—2** (пт—ндз) 21.10.

**«Берасьце»** (272-87-91)

«Калі сьвякроў — монстар» (прэм'ера): **30—2** (пт—ндз) 16.30, 21.00.

«Красуня»: **30, 1** (пт, сб) 18.30; **2** (ндз) 14.00, 18.30.

«Бабуся»: **1** (сб) 14.00 (іл).

«Прыгоды Шаркбоя і Лавы-3Dэ»: **30** (пт) 14.30; **1, 2** (сб, ндз) 12.00 (іл).

**«Дом кіно»** (266-35-26)

«Басаnож па маставой» (прэм'ера): **30—2** (пт—ндз) 16.45, 19.00, 21.15.

«Птушкі-2: падарожжа на край сьвету»: **30—2** (пт—ндз) 15.00.

**«Дружба»** (240-90-13)

«Ключ ад усіх дзьвярэй»***: **30—2** (пт—ндз) 16.30 (іл), 19.00, 21.00.

**«Кастрычнік»** (232-93-25)

«Браты Грым» (прэм'ера): **30** (пт) 14.20, 16.40, 19.00, 21.30; **1, 2** (сб, ндз) 14.20 (іл), 16.40, 19.00, 21.30.

**«Масква»** (203-14-48)

«Браты Грым» (прэм'ера): **30** (пт) 16.10, 18.40, 21.10; **1, 2** (сб, ндз) 13.40 (іл), 16.10, 18.40, 21.10.

**«Мір»** (288-22-33)

«Мужчына па выкліку-2»***: **30** (пт) 17.00, 19.00, 21.00; **1, 2** (сб, ндз) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00.

«Ключ ад усіх дзьвярэй»***: **30** (пт) 16.00, 18.00, 20.00; **1, 2** (сб, ндз) 16.00 (іл), 18.00, 20.00.

**«Перамога»** (203-77-66)

«Мужчына па выкліку-2»***: **30—2** (пт—ндз) 21.10.

«Вузел» (тыдзень гішпанскага кіно): **30** (пт) 15.00, 17.00; **2** (ндз) 14.50 (іл).

«Боскае сьвятло» (тыдзень гішпанскага кіно): **30** (пт) 19.00; **1** (сб) 15.00 (іл).

«Гала» (тыдзень гішпанскага кіно): **1** (сб) 13.00.

«Дзесяць дзён без каханьня» (тыдзень гішпанскага кіно): **1** (сб) 17.00 (іл); **2** (ндз) 19.00.

«Школа спакушэньня» (тыдзень гішпанскага кіно): **1** (сб) 19.00; **2** (ндз) 17.00 (іл).

«Пікасо. Восем гісторый пра каханьне» (тыдзень гішпанскага кіно): **2** (ндз) 12.50.

**«Піянэр»** (227-64-87)

«Мадагаскар»: **30—2** (пт—ндз) 11.00, 12.40, 17.40.

«Няўлоўны»: **30—2** (пт—ндз) 14.20, 19.10.

«Марыць ня шкодна»***: **30—2** (пт—ндз) 16.00, 21.00.

**«Цэнтральны»** (200-34-16)

«Ключ ад усіх дзьвярэй»***: **30** (пт) 12.30, 17.00, 19.10, 21.20; **1, 2** (сб, ндз) 12.30 (іл), 17.00, 19.10, 21.20.

«Містэр і місіс Сьміт»: **30, 2** (пт, ндз) 14.40.

«Рудзін» («Расейская клясыка на экране»): **1** (сб) 14.30.

(2с) — кінафільм падоўжанай працягласьці

(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)

Рэйтынгавыя абмежаваньні:

*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;

**** — дарослым з 18 год.

## ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**Тэатар**

**Тэатар юнага гледача**

**9** (ндз) — «Дзюймовачка».

**Тэатар лялек**

**1** (сб) — «Дзед і жораў».

**2** (ндз), **9** (ндз) — «Чырвоны каптурык».

**4** (аўт) — «Бязглуздая казка».

**8** (сб) — «Вясёлы цырк».

**Балет** *(на сцэне Палацу Рэспублікі)*

**30** (пт) — «Сьпячая прыгажуня».

**2** (ндз) — «Шчаўкунок».

**Музычны тэатр**

**1** (сб) — «Бураціна.by».

**2** (ндз) — «Айбаліт 2002».

**Іркуцкі абласны тэатар драмы імя А.Вампілава** *(на сцэне Тэатру юнага гледача)*

**29** (чц) — «Руслан і Людміла».

**1** (сб), **6** (чц) — «Прынцэса Кру».

**2** (ндз), **8** (сб) — «Канёк Гарбунок».

## КІНО

**«Аўрора»**

«Пра тое, як Колька і Пецька лcraталі ў Бразылію»: **1, 2** (сб, ндз) 12.00.

«Кацяня»: **1, 2** (сб, ндз) 12.30.

**«Дружба»**

«Гісторыя вечнага каханьня»: **30** (пт) 12.00; **2** (ндз) 13.00.

«Чалавек-павук-2»: **30** (пт) 14.30; **1** (сб) 13.00.

Мультзборнік №4: **1, 2** (сб, ндз) 11.00.

**«Масква»**

«Кніга джунгляў»: **2** (ндз) 12.00.

**«Мір»**

«Вэліянт: птушыны спэцназ»: **30** (пт) 14.00; **1, 2** (сб, ндз) 12.00, 14.00.

**«Цэнтральны»**

«Гарфілд»: **30—2** (пт—ндз) 11.00.

## КІНО НА DVD

**Master records**

**Мая маленькая нявеста**

Сямейная камэдыя, Карэя, 2004, рэж. **Хо-Ён Кім.**

У ролях: **Раэ-Ўон Кім, Геюн-Ён Мунг.**

Перад вайной два сябры дамовіліся, што іхнія нашчадкі пажэняцца. Нашчадкі ня ў курсе…

Менск, Кісялёва, 12, 643-21-08





## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Спакушэньне сьцерваў па-гішпанску

Прадавец касмэтыкі Оскар страціў працу. Сьцярвозная радыёвядоўца Сандра губляе рэйтынг. Але Оскар ня траціў у маркеце часу дарма і набыў некаторыя каштоўныя ўменьні й навыкі. Ён адкрывае Школу спакушэньня. Справай гонару для прафэсара мачысцкіх навук стае мужчынаненавісьніца Сандра. Герой тэлефануе сьцерве ў этэр — і прыкідваецца закаханым на мяжы нэрвовага зрыву. Распачынаецца…

Хаўер Балагер расквеціў звыклую рамантычную камэдыю пастмадэрнымі фарбамі. Маньякдантыст, хатняя гаспадыня-травэсты і рэкляма майткоў — усім



**«Школа спакушэньня»** («Escuela de seduccion»). Гішпанія, 2004, каляровы, 110 хв. **Жанр:** рамантычная камэдыя. **Адзнака:** 7,5 (з 10).

хапае месца ў гэтым карнавале.

Вікторыя Абрыль у ролі Сандры то разьвінчаная, як лялька на шарнірах, то насьцярожаная, як кобра перад камэрай. Герой Хаўера Вэйгі, наадварот, лагодны, як сьметанковы ёгурт. Які час, такія і тыпажы. Мужчынам — пачуцьці, слабому полу — кар'ера.

Хаця пры канцы фільму нас чакае прадказальны хэпі-энд — ня верце. За фасадам патрыярхальнай рамантыкі хаваецца радыкальная перастаноўка гендэрных роляў.

Усё неўпрыкмет зьмяняецца ў гэтым гішпанскім кіно!..

**Андрэй Расінскі**

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Адзіны назаўсёды



Беларусь — самая лібэральная краіна ў сьвеце. Толькі ў нас крымінальнікі і тэрарысты могуць вольна зьбірацца пад патранажам дзяржавы ў фармаце так званага Кангрэсу дэмакратычных сілаў. Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

Менавіта крымінальнікамі і тэрарыстамі падаюць апазыцыянэраў афіцыйныя СМІ. І тут на табе — праводзьце кангрэс на відным месцы.

Адваротным бокам такой бязьмежнай талерантнасьці зьяўляецца псыхалягічны шок звычайных ляяльных грамадзянаў. Пастаўце сябе на месца сіняка з Ангарскай (інфармацыя для правінцыялаў: МАЗ — адзін з самых укураных і абдзяўбаных раёнаў сталіцы). Зранку вы выпаўзаеце на «Аўтазаводзкую» па апахмел або шмаль і — оба-на: блакітныя, тарчкі і карафаны бэн Ладэна тусуюцца каля аўтазаводзкага ПК. Якая можа быць ваша рэакцыя?

1. «Блін, а я думаў, пяршак, якім я ўчора закінуўся, — галяк», — варочаеце вы мазгамі і бяжыце да знаёмага вінакура па дагаваняла. Вынік — зацяжны, як мінімум да лета-2006, алькагольна-травяны запой. І калі праз год білборд на праспэкце закліча галасаваць за квітнеючую Беларусь, вас у найлепшым выпадку праб'е на «хі-хі».

2. Пад уплывам апошняга прагону Яўгена Новікава па TV, вы імчыцеся чысьціць дэмакратычным радыскам партрэт. Як вынік, зарабляеце ад мянтоў, якія ахоўваюць апазыцыйнае мерапрыемства, дабротных кухталёў. Вынік — апатыя і недавер да ўлады.

Такім чынам, даўшы дазвол на правядзеньне кангрэсу, вэртыкаль фактычна легалізавала апазыцыю. Калі інакш нельга, трэба выдумляць арыгінальныя спосабы маргіналізацыі бацькавых апанэнтаў. Народная мудрасьць наконт гэтага сьцьвярджае: каб пахерыць працэс, трэба яго ўзначаліць.

Як толькі быў абвешчаны кастынг кандыдатаў на пасаду «адзінага». Яму трэба было адразу вылучаць сваю кандыдатуру ў якасьці прадстаўніка якой-небудзь НДА, напрыклад, ад групы «Жыхары пасёлку Дразды супраць павышэньня тарыфаў на камуналку».

Пасьля гэтага выбары «адзінага» пайшлі б як па масьле. Праймэрыз у Барысаве. Да месца галасаваньня зь Печаў маршыруе калёна салдат і галасуе самі ведаеце за каго. Не пасьпелі «адмарозкі» апрытомнець, як да іх офісу руліць хеўра студэнтаў, мабілізаваных словамі дырэктара тэхнікуму: «Чмо, якое ня возьме ўдзелу ў выбарах адзінага дэмакрата, разьмяркую ў Брагін».

Натуральна, у арганізатараў Кангрэсу не было б ніякага гемарою з памяшканьнем. Кангрэс дэмсіл адбываўся б не ў сталічным Гарлеме, а ў цэнтры, напрыклад, у Палацы Рэспублікі. Па выніках галасаваньня Ён лёгка стаў бы «адзіным» і адразу запатрабаваў бы ад Дзярждэпу ЗША сваёй законнай долі грантаў, якая належыць яму згодна з Актам аб дэмакратыі ў Беларусі.

Ну а 18 ліпеня, на наступны пасьля прэзыдэнцкіх выбараў аўторак, «Советская Белоруссия» выйшла б з загалоўкам, набраным самым буйным кеглем, — «На выбарах прэзыдэнта РБ перамог адзіны дэмакратычны кандыдат!». Пакуль Захад чухаўся б, сьвежавыбраны гарант хуценька падпісаў бы дэкрэт аб забароне ўжываньня ў назвах слова «Адзіны» без узгадненьня з адпаведнымі структурамі. Каб не паўтарыўся казус гэтага году.



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Сама даўжынёй 212 см і вагою 60 кг злавіў у Дняпры бліз Сьветлагорску менскі ўрач-стаматоляг Эдуард Жакоўскі (зьлева).**

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Івану І. з tut.by.** Вашы абсурдэлькі падаюцца перастворанымі з расейскіх арыгіналаў. З Вашым пачуцьцём гумару Вам варта пісаць творы большага памеру ў клясычных жанрах і, вядома, думаць па-беларуску.

**Аляксандру С. з tut.by.** За тапаграфічную мапу з цэнтрам Эўропы дзякуй. Цяпер будзем ведаць.

**Алесю К. з Уроцлава.** Замалёвак звычайна не друкуем. Пішэце нам у іншых жанрах.

**ЗАПРАШАЕМ У ПАДАРОЖЖА**

**2 кастрычніка** (нядзеля) па маршруце: Менск — Беніца — Крэва — Баруны — Гальшаны — Вішнева — Дзясятнікі — Валожын — Менск.

**9 кастрычніка:** Сынковічы — Зэльва — Крамяніца — Гнёзна — Мсьцібава — Ізабелін — Краскі — Шылавічы — Падароск.

**14 — 17 кастрычніка**: Кракаў — Вялічка.

т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер), 264-12-38, 776-24-35 (Павал)

Калегі, вучні і іх бацькі выказваюць спачуваньні **спадарыні Ірыне Сідарэнцы** з прычыны напаткаўшага яе гора — сьмерці бацькі

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### КАНТАКТЫ

**Рамантычны малады чалавек**, 29/170, в/а (доктар), гамяльчук, пазнаёміцца зь беларускамоўнай дзяўчынай. Магчыма стварэньне сям'і. Т.: 739-71-62

### СПАЧУВАНЬНЕ

**Сям'я Вітушкаў смуткуе** з прычыны сьмерці дзядулі Мікалая Астапавіча Сагановіча і выказвае спачуваньні Генадзю Сагановічу

### КНІГІ

**Кнігаабмен:** 753-91-96

**Новыя ды старыя** нумары «ARCHE», «Спадчыны», БГА, іншыя часопісы, кнігі, слоўнікі, календары, музыка і фільмы на CD («Акупацыя (містэрыі)», «Александрына Шклоўская», «Швадрон», «Дзікае паляваньне-2» ды іншае), майкі, сьцягі, значкі на Румянцава, 13 (ТБМ). Панядзелак—пятніца (15.00—19.00). Т.: 234-93-71, 707-40-01

**Прадам кнігі**: І.Насовіч «Слоўнік беларускай мовы» 1870 г. факсым. выд., «Статут ВКЛ 1588 г.» падарунк. выд. 1989 г., Байкоў, Некрашэвіч «Беларуска-расейскі слоўнік» факсым. 1926 г., М.Ткачоў «Абарончыя збудаваньні заходніх зямель Беларусі XIII—XVIII ст.» ды шмат іншага, багаты выбар кніг. Т.: 753-70-05

**Прадам кнігі**: «Тэўтонскі ордэн», «Беларускі кнігазбор»: Ян Баршчэўскі, «Летапісы і кронікі», К.Каліноўскі, «Філяматы і філярэты», «Армія Краёва на Беларусі», Л.Геніюш, С.Грахоўскі, Зянон «Сапраўднае аблічча», «Пан Тадэвуш», «Наша доля» 1906 г. факсыміле ды шмат іншага. Т.: 753-70-05

### ПРАЦА

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17-й. Т.: 235-18-72. Юры

**Беларускамоўная няня** шукае працу. Т.: 372 96 32

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

**Колькі выпілі гарэлкі ў Расеі за першыя паўгоду 1910 г.?** Усяго 41 мільён 192 тысячы вёдзер, процi леташняга году выпілі больш на тры мільёны 272 тысячы вёдзер. Стараюцца людзі!

Гарэлкі найбольш выпіваюць у Сібіры, сярэдніх і паўднёвых расейскіх губэрнях, найменш — у паўночных і заходніх губэрнях. Па гарадох выпіваюць у тры разы больш, чым сяляне, а найбольш выпіваюць па сібірскіх гарадох.

**У Менскай губ.** за апошні тыдзень памерла на халеру 27 чалавек, захварэла 87. Ад пачатку пошасьці захварэла 4 206, памерла 424.

**Смаленск.** На выбарах у гарадзкую думу прайшлі дэмакраты.

**1910, №36**

## РАСПРАДАЖ

Антон Адамовіч. Да гісторыі беларускае літаратуры. 1464 с., цьвёрдая вокладка. 30 т.

Найноўшая гісторыя беларускага парлямэнтарызму. 320 с. 4 т.

Ян Станкевіч. Збор твораў у двух тамох. Т. 1. 552 с. Т. 2. 588 с. Цана 10 т.

Ян Станкевіч. Гістарычныя творы. 776 с., цьвёрдая вокладка. 8 т.

Андрэй Катлярчук. Шведы ў гісторыі й культуры беларусаў. 274 с., цьвёрдая вокладка. 3 т.

Быць альбо ня быць сярэднеэўрапейцам. Сучаснае польскае мысьленьне. 472 с. 2 т.

Беларуска-расейская інтэграцыя. Аналітычныя артыкулы. 424 с. 3 т.

Паліталёгія. Асноўны курс. Пер. зь ням. 680 с. 5 т.

Мясцовыя выбары ў найноўшай палітычнай гісторыі Беларусі. 296 с. 3 т.

Увесь камплект – 50 т.

Тэлефон (029) **643-57-33**,

e-mail **exlibris@tut.by**,

паштовы адрас: **п/с 333, г.Менск, 220050**.

Наша Ніва

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
галоўны рэдактар — Андрэй Дынько
фотарэдактар — Арцём Лява
нам. галоўнага рэдактара — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
выдавец і заснавальнік — Фонд выданьня газэты «Наша Ніва»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

**Наклад 5398.** **Газэта выдаецца 48 разоў на год.**

Нумар падпісаны ў друк 20.00 28.09.2005.

Замова № 5582.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а